Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 ВЕРАСНЯ 2007 г.
СЕРАДА
№ 167 (26032)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

АДКБ у год старшынства Беларусі дабілася значных вынікаў

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў прыхільнасць Беларусі ўмацаванню сістэмы калектыўнай бяспекі ў зоне адказнасці АДКБ. Аб гэтым заявіў ён на сустрэчы з генеральным сакратаром Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Мікалаем Бардзюжам.

У сваю чаргу Мікалай Бардзюжа адзначыў, што год старшынства Беларусі ў АДКБ стаў выключна паспяховым і прарыўным. Паводле яго слоў, у гэты перыяд былі дапрацаваны і падпісаны важнейшыя нарматыўныя акты, узгадненне якіх да гэтага заняло некалькі гадоў. АДКБ дабілася істотных вынікаў і ў супрацоўніцтве на міжнароднай арэне. У прыватнасці, быў зроблены шэраг ключавых заяў у ААН, АБСЕ і іншых арганізацыях. Мікалай Бардзюжа падкрэсліў, што ў год старшынства Беларусі асаблівая ўвага была ўдзелена развіццю ваеннага складальніка арганізацыі.

Генеральны сакратар АДКБ паведаміў, што ўсе дзяржавы — удзельніцы арганізацыі аб'явілі аб гатоўнасці да падпісання пакета дакументаў аб міратворчым кантынгенце. Акрамя таго, цяпер у рамках АДКБ прапрацоўваецца комплекс пытанняў, звязаных з пастаўкамі спецтэхнікі, каардынацыяй знешнепалітычных ініцыятыў, а таксама намаганняў у барацьбе з тэрарызмам, нелегальнай міграцыяй, наркагандлем.

Мікалай Бардзюжа падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за ўручаны яму ордэн Дружбы народаў. «Я расцэньваю гэтую ўзнагароду як пацвярджэнне актыўнай пазіцыі Беларусі ў АДКБ, знак высокага даверу і буду рабіць усё, каб больш дынамічна развіваліся інтэграцыйныя працэсы, і мы выйшлі на сапраўды эфектыўную сістэму калектыўнай бяспекі», — сказаў генеральны сакратар АДКБ.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларусь упэўнена рухаецца наперад і стабільна выконвае задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця

Беларусь, нягледзячы на ўсе цяжкасці, упэўнена рухаецца наперад па намечанаму шляху, стабільна выконваючы прагнозы сацыяльна-эканамічнага развіцця. Аб гэтым заявіў 4 верасня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, уручаючы дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных рэгіёнаў краіны і сфер дзейнасці.

Сярод узнагароджаных найбольш шматлікую групу складаюць рабочыя, спецыялісты і кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў. Яны, паводле слоў Прэзідэнта, узводзяць самы трывалы фундамент беларускага грамадства — сучасную высокаразвітую эканоміку.

У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў ордэнам Пашаны начальніка ўпраўлення Кавальскага завода цяжкіх штампавак Івана Аўчыннікава, машыніста крана Мінскага завода «Другасчормет» Анатоля Ярковіча, работнікаў Мінскага электратэхнічнага завода імя В.І. Казлова Аляксея Маркава і Кацярыну Радчанка.

Другую па колькасці групу склалі работнікі друку, культуры, мастацтва, вышэйшай і сярэдняй школы.

Прэзідэнт уручыў ордэн Францыска Скарыны галоўнаму рэдактару рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» Паўлу Якубовічу. Розных узнагарод удастоены таксама іншыя прадстаўнікі творчага калектыву «СБ».

За высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у развіццё нацыянальнай культуры і мастацтва медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны артыст вышэйшай катэгорыі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Вячаслаў Паўлюць.

Ганаровае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» прысвоена выканальніцам Ірыне Афанасьевай і Ірыне Дарафеевай, вядучым майстрам сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета Вользе Гайко і Людміле Кудраўцавай, вядучаму майстру сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Вячаславу Грушову.

Сярод удастоеных узнагарод — таксама супрацоўнікі органаў дзяржаўнага кіравання розных узроўняў.

«Кожны ішоў да ўзнагароды сваім шляхам. Але ўсіх аб'ядноўвае тое, што сваю штодзённую плённую працу і энергію, талент і інтэлект вы аддаяце служэнню народу, накіроўваеце на карысць Беларусі, умацаванне яе эканамічнага, навуковага і духоўнага патэнцыялу», — падкрэсліў, звяртаючыся да ўзнагароджаных, Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў ордэн Дружбы народаў генеральнаму сакратару Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Мікалаю Бардзюжу і лётчыку-касманаўту, рэферэнту пасольства Беларусі ў Расіі Пятру Клімуку.

Паводле слоў Прэзідэнта, гэтай узнагароды яны ўдастоены за значны ўклад ва ўмацаванне дружалюбных адносінаў і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі — членамі АДКБ.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

НА ВЯРШЫНІ ГАРЫ

Мінскі будаўнік Аляксандр ЗАХАРЭЎСКІ з задавальненнем дапамагае на бацькоўскім падворку ў вёсцы Лысая гара Мінскага раёна.

Золатавалютныя рэзервы — 3066,1 млн долараў

На пачатак гэтага месяца золатавалютныя рэзервы Беларусі дасягнулі 3066,1 млн долараў ЗША ў нацыянальным вызначэнні, паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка краіны Міхаіл Журавовіч. Суразмоўца падкрэсліў, што праведзеная ў жніўні аплата расійскага газу, якая ажыццяўлялася за кошт рэзерваў, амаль поўнасцю кампенсавана за кошт куплі галоўным банкам валюты на валютным рынку, а таксама павелічэння сродкаў на дэпазітах урада ў Нацбанку.

Ігар ГРЫШЫН.

Беларусь выступае за прадаўжэнне дыялога з Еўрапейскім саюзам у сферы энергетыкі

Беларусь уносіць і гатова павышаць свой уклад у дыверсіфікацыю і забеспячэнне стабільнасці паставак энергарэсурсаў. Аб гэтым заявіў намеснік міністра замежных спраў Беларусі Валерый Варанецкі на канферэнцыі «Сумесныя дзеянні — умацаванне Еўрапейскай палітыкі суседства» ў Бруселі, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве замежных спраў.

«Еўропе неабходна знайсці ўзаемапрымальную форму і формулу аб'яднання інтарэсаў пастаўшчыкоў, транзіцёраў і спажыўцоў энергарэсурсаў і на гэтай аснове стварыць устойлівую сістэму забеспячэння энергетычных патрэб усяго кантынента. Беларусь, знаходзячыся на стратэгічным скрыжаванні энергетычнай і транспартнай інфраструктуры, гатова прапрацоўваць з усімі партнёрамі больш эфектыўныя шляхі паставак энергарэсурсаў з усіх напрамкаў», — падкрэсліў Валерый Варанецкі.

Беларусь і Еўрасаюз павінны пераходзіць ад простага гандлю да больш прагрэсіўных формаў эканамічнага ўзаемадзеяння. Беларускі бок запрашае еўрапейскіх інвестараў у стратэгічныя сферы эканомікі рэспублікі: энергетыку, машынабудаванне, хімічную і нафтаперапрацоўчую прамысловасць.

«Нашым краінам пара на справе пераходзіць да фарміравання агульнай канкурэнтнай эканамічнай прасторы на еўрапейскім кантыненце, да стварэння адзіных тэхналагічных ланцужкоў, адзіных лагістычных і транзітных схем. Без гэтага Еўропа будзе прайграваць у глабальным эканамічным спаборніцтве», — сказаў намеснік кіраўніка беларускага МЗС.

Ён таксама падкрэсліў, што ваенна-палітычныя бяспека і баланс зноў становяцца вострай і важнай стратэгічнай тэмай для ўсёй Еўропы. «Беларусь, знаходзячыся ў асабліва адчувальнай у гэтых адносінах зоне ў Еўропе, таксама зацікаўлена ва ўзаемадзеянні з усімі ключавымі партнёрамі ў інтарэсах агульнай стабільнасці», — дадаў намеснік міністра.

Беларусь выступае за адмену штучных тарыфных абмежаванняў і за спрашчэнне візавага рэжыму паміж Беларуссю і Еўрасаюзам.

«Сваю пазіцыю мы пацвярджаем справай: Беларуссю ў аднабаковым парадку прыняты ўжо шэраг крокаў па лібералізацыі візавага рэжыму для грамадзян ЕС», — сказаў Валерый Варанецкі.

Толькі супрацоўнічаючы, мы зможам стаць больш моцнымі, эфектыўнымі, канкурэнтаздольнымі, і ў выніку дасягнуць галоўнага — з годнасцю процістаяць складаным сучасным выклікам. У гэтым інтарэсы Еўрасаюза і яго краін-суседак супадаюць. Мы ў аднолькавай ступені важныя адзін для аднаго...

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЖАНЧЫНА СЕЛА ЗА РУЛЬ З 2,4 ПРАМІЛЕ АЛКАГОЛЮ Ў КРЫВІ

У Мінску жанчына, якая не мела пасведчання на кіраванне аўтамабілем, і да таго ж была п'янай, села за руль аўтамабіля «Таёта»: паездка мела лагічны ў згаданым выпадку фінал.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле прапаганды і агітацыі ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, на перакрыжаванні вуліц Ясеніна і Касманаўтаў «Таёта» трапіла ў ДТЗ: яна сутыкнулася з «Фольксвагенам». Адчайная «аўтамабілістка» кіравала аўтамабілем з 2,4 праміле алкаголю ў крыві (0,5 праміле ўжо лічыцца станам алкагольнага ап'янення і садзіцца за руль з такім паказчыкам катэгарычна забараняецца). Больш таго, побач з сабой, спераду, жанчына пасадзіла сваю чатырохгадовую дачку. У аварыі пацярпелі дзяўчынка нецвярозай кіроўцы, якая з чэрапна-мазгавой траўмай змешчана ў бальніцу, а таксама дзіця 2006 года нараджэння, якое знаходзілася ў салоне «Фольксвагена».

Ігар ГРЫШЫН.

«ЗАГРЫМЕЛІ» НА ВОСЕМ ГАДОЎ

Тром маладым хлопцам з Рэчыцы, двое з якіх туляліся па гораду без працы і адзін быў раней судзімы, захацелася пажыць, як кажуць, на шырокую нагу. З гэтай мэтай пасля прыняцця «на грудзі» яны адправіліся на мясцовы рынак і пачалі браць у абарот трох азербайджанцаў, якія гандлявалі там рознымі прадуктамі.

— Будзеце плаціць нам. Мы — ваш «дах».

— Ён нам не патрэбен, — запярэчылі каўказцы, пасля чаго на іх абрушыўся такі град аперкотаў ды розных хукаў, што яны былі збіты на горкі яблык.

Больш таго, нягоднікі паабяцалі азербайджанцам «урыць» іх у зямлю, калі тыя не адумаюцца. У выніку дэбашыры і вымагальнікі апынуліся ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. На восем гадоў кожны. З канфіскацыяй маёмасці.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

РЫБАК ЗАБЛЫТАЎСЯ Ў ВОДАРАСЦЯХ

З наступленнем восені кліентамі выратавальнікаў на вадзе ўсё часцей становяцца рыбакі: на жаль, апошнім не заўсёды шанцуе...

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» вядучы спецыяліст АСВОД Віктар Харошка, адно з трагічных здарэнняў мела месца на Дняпры ў Брагінскім раёне. Тут рыбак апынуўся ў вадзе пасля таго, як лодка перакулілася. Іншыя аматары рыбнай лоўлі дапамаглі чалавеку дабрацца да сушы. Аднак тое, што адбылося далей — «на сумленні» зялёнага змія. Чалавек, які страціў арыентацыю з-за алкаголю, зноў пайшоў у ваду і, заблытаўшыся ў водарасцях, патануў. Дарэчы, яшчэ адзін рыбак загінуў у возеры ў Слаўгарадскім раёне: ён патануў пры ўстаноўцы сетак.

Ігар ГРЫШЫН.

СВАРКА... З ГРАНАТАЙ

У Віцебску міліцыянеры выехалі па выкліку, каб не дапусціць цяжкіх наступстваў сямейнага скандалу. На месцы здарэння ў 29-гадовага мужчыны знайшлі гранату «Ф-1». Праводзіцца праверка гэтага факта.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ва ўрадзе

ІНАВАЦЫІ Ў АДУКАЦЫІ

Сёння, з улікам сучасных патрабаванняў да развіцця сістэмы адукацыі, задача педагогаў не павінна абмяжоўвацца звыклай падачай кніжнага альбо часам ужо састарэлага матэрыялу. І не важна, ідзе размова пра школьніка, студэнта альбо навучэнца вучылішча: на ўсіх этапах адукацыі спецыялістам неабходна імкнуцца даць моладзі як мага больш ведаў, навучыць яе ўспрымаць новае, ствараць новае на тым працоўным месцы, да якога яна рыхтуецца. Паводле слоў міністра адукацыі Аляксандра Радзькова, які прадстаўляў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў праект Кодэкса аб адукацыі, распрацоўшчыкам гэтага дакумента ўдалося закласці інавацыйныя прынцыпы развіцця адукацыі на ўсіх этапах — пачынаючы ад дашкольнага навучання і заканчваючы сістэмай павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі.

Як падкрэсліў падчас абмеркавання праекта віцэ-прэм'ер Аляксандр Косінец, мы сёння павінны бачыць не проста атрыманы выпускніком дыплом, а мець сапраўды дыпламаванага спецыяліста. Менавіта на гэта і накіравана ўся сістэма Кодэкса аб адукацыі. Разам з тым, нельга казаць пра тое, што сённяшняя сістэма адукацыі нашай рэспублікі ў нечым саступае аналагічным сістэмам іншых краін. Па эфектыўнасці адукацыйнага працэсу і яго выніках яна цалкам супастаўляльная з сістэмамі развітых дзяржаў. Дарэчы, зараз у рэспубліцы налічваецца звыш 8,6 тыс. устаноў адукацыі і каля 2,2 млн навучэнцаў. Навучанне і выхаванне дзяцей і моладзі забяспечвае больш за 400 тыс. работнікаў, у тым ліку каля 240 тыс. педагогаў.

Як зазначыў міністр адукацыі, распрацоўваўся Кодэкс спецыялістамі два гады, і рэспубліка ў гэтым пытанні з'яўляецца ў многім першапраходцам. Справа ў тым, што, напрыклад, у той жа Расіі падобны дакумент зараз ствараецца, а ў Францыі ёсць толькі агульная частка Кодэкса. Беларускі ж праект засноўваецца на прынятых законах у сферы адукацыі, ён не прадугледжвае канцэптуальнага змянення палажэнняў дзеючага заканадаўства. «Кодэкс забяспечвае нарматыўную базу для ўжо існуючых тэндэнцый развіцця адукацыі, для існуючай сістэмы і нацэльвае нас на рэалізацыю галоўных задач, вызначаных кіраўніком дзяржавы, — інавацыйны шлях развіцця краіны, забеспячэнне ўсіх галін эканомікі здольнымі кадрамі, вызначае перспектыву ў цэлым развіцця галіны як асноўнага рухавіка развіцця грамадства і дзяржавы», — сказаў Аляксандр Радзькоў. У сваю чаргу прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі падкрэсліў, што Кодэкс аб адукацыі павінен улічваць інавацыйнае развіццё гэтай сферы. «Кожны павінен атрымаць дастойную адукацыю, мець права выбару», — заявіў прэм'ер, калі гаворка зайшла пра гімназіі, ліцэі і класы з паглыбленым вывучэннем прадметаў. І патлумачыў, што вышэйзгаданыя ўстановы не павінны стаць прывілеяй толькі тых дзяцей, якія маюць заможных бацькоў.

Немалаважны момант, на якім спыніўся ў ходзе абмеркавання дакумента віцэ-прэм'ер Аляксандр Косінец, — павышэнне прафесіяналізму выкладчыкаў навучальных устаноў. У прыватнасці, віцэ-прэм'ер назваў некалькі ВНУ, якія рыхтуюць спецыялістаў для рэальнага сектара эканомікі, дзе толькі 7—20 працэнтаў выкладчыкаў маюць сапраўдны вопыт працы на вытворчасці. Астатнія, як высветлілася, прыйшлі на кафедры пасля студэнцкай лаўкі. А таму, заўважыў Аляксандр Косінец, ставіцца задача, каб апошнія павысілі кваліфікацыю, выйшлі ў рэальны сектар эканомікі і паглядзелі, што там робіцца. Як можна, здзіўляецца віцэ-прэм'ер, вучыць толькі па кнігах, не ведаючы, што робіцца на вытворчасці.

Падводзячы вынікі абмеркавання Кодэкса, Сяргей Сідорскі, у прыватнасці, зазначыў, што дэтальнай прапрацоўкі патрабуе пытанне, якое датычыць сацыяльных стыпендый, што выплачваюцца, да прыкладу, дзецям з няпоўных сем'яў. Наогул жа, прэм'ер выказаўся за падтрымку дакумента. Як пазней паведаміў журналістам Аляксандр Радзькоў, праект з улікам некаторых заўваг будзе дапрацаваны і потым накіраваны на разгляд у парламент.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Вызначаны лаўрэаты штогадовай прэміі ФПБ

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе ФПБ, урачыстае ўручэнне прэмій адбудзецца 10 верасня.

У гэтым годзе прафсаюзнай прэміі за творы прозы, паэзіі і драматургіі ўдастоена пісьменніца, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Раіса Баравікова (за кнігу «Казкі астранаўта: Касмічныя падарожжы беларусаў»). За значны ўклад у падрыхтоўку і выкананне праекта «Ноч оперы ў Мірскім замку» прэміяй адзначаны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы Вячаслаў Чарнуха.

У галіне журналістыкі ФПБ прысудзіла прэмію тэлежурналісту Алене Міхалоўскай (за цыкл тэлерэпартажаў аб дзейнасці Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і Мінскага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў па сацыяльна-эканамічнай, прававой абароне працоўных).

Што датычыцца прэмій у галіне працы, навукі і тэхнікі, то спіс лаўрэатаў у гэтым годзе папоўніўся 9 імёнамі. Сярод іх — Уладзімір Дворнік, дырэктар РУП «Саўгаскамбінат «Зара» Мазырскага раёна (прэмія ў аграпрамысловым комплексе); Валерый Кіркоўскі, загадчык лабараторыі гема- і лімфасорбцыі цэнтральнай навукова-даследчай лабараторыі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта (прэмія ў сацыяльнай сферы, за распрацоўку і прымяненне ў клінічнай практыцы новых апаратаў, расходных матэрыялаў і методык, якія выкарыстоўваюць прынцыпы эферэнтнай медыцыны) і іншыя.

Бяспека руху

«Бяспраўны» кіроўца — патэнцыйны забойца

Аўтамабіль, як вядома, не толькі сродак перамяшчэння, але і даволі небяспечная рэч. Асабліва ў руках няўмелага вадзіцеля...

Паводле звестак упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны, у вёсцы Салтанава Рэчыцкага раёна здарылася аварыя з удзелам менавіта «бяспраўнага» кіроўцы. 18-гадовы хлопец не меў вадзіцельскага пасведчання, аднак сеў за руль «Жыгулёў», ды яшчэ ўзяў дваіх пасажыраў. Паездка з ветрыкам завяршылася трагічна прама на вясковай вуліцы. Няўмелы вадзіцель не справіўся з кіраваннем транспартным сродкам, выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з грузавіком «МАЗ». У выніку ДТЗ пасажыры, якім было ўсяго 17 і 20 гадоў, загінулі на месцы здарэння. Сам няўдалы кіроўца атрымаў моцнае раненне і змешчаны ў шпіталь.

Між іншым, надвор'е, якое ўсталявалася апошнім часам у Беларусі, можа прыпаднесці шмат непрыемных сюрпрызаў і спрактыкаваным кіроўцам. Дажджы, туман, перапады атмасфернага ціску аказваюць свой негатыўны ўплыў на сітуацыю на дарогах. У сувязі з гэтым Дзяржаўтаінспекцыя звяртаецца да вадзіцеляў з просьбай быць пільнымі. Напрыклад, «даішнікі» раяць кіроўцам, якія трапілі ў паласу дажджу альбо туману, паступова зменшыць хуткасць, уключыць ближняе святло фар ці процітуманкі і ні ў якім разе не рабіць рызыкоўных манеўраў: абгонаў, апярэджванняў, рэзкіх тармажэнняў.

Пешаходам ДАІ рэкамендуе таксама быць уважлівымі і строга выконваць Правілы дарожнага руху. Прычым, зараз супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі не абмяжоўваюцца толькі прафілактычнымі размовамі з пешымі парушальнікамі ПДР. За адны суткі, напрыклад, былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці 417 пешаходаў, якія, ідучы па дарозе ў цёмны час, не абазначылі сябе флікерамі. Нагадаю, што штраф за такое парушэнне складае 15,5 тыс. рублёў. А п'яным пешаходам за аналагічнае ігнараванне ПДР, увогуле, давядзецца заплаціць ад 31 тыс. да 93 тыс. рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

З першых вуснаў

МОЛАДА — НЕ ЗЕЛЕНА

Юнакі і дзяўчаты прапануюць правесці ў Беларусі Сусветны фестываль моладзі

Фота Вольгі ЛАСКА.

Гэтымі днямі самая масавая маладзёжная арганізацыя Беларусі — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, — святкуе сваё пяцігоддзе. Юбілею прысвячаецца шэраг мерапрыемстваў. Сярод іх — міжнародны навукова-практычны дыялог «Інтэграцыя моладзі: крок у будучыню» (праходзіць сёння), маладзёжны марафон «5 гадоў разам», які праводзіцца ва ўсіх рэгіёнах краіны з 1 па 8 верасня. Актывісты БРСМ у гэтыя дні ствараюць ландшафтныя кампазіцыі, каб упрыгожыць вуліцы Беларусі. Напярэдадні свята ў Нацыянальным прэс-цэнтры была арганізавана прэс-канферэнцыя «БРСМ: учора, сёння, заўтра». На пытанні журналістаў адказаў першы сакратар ЦК грамадскага аб'яднання «БРСМ» Леанід КАВАЛЁЎ.

— Пяць гадоў — многа гэта ці мала? Калі казаць аб чалавечым узросце, гэта зусім нямнога — яшчэ дзіця, — правёў ён аналогію. — Калі ж узгадаць 430-тысячны калектыў нашай маладзёжнай арганізацыі, то 5 гадоў — ужо нямала.

Пачыналі мы з 30 тысяч маладых людзей. Прыемна, што нашай арганізацыі паверылі: раней у год да нас прыходзіла каля 20—35 тыс. маладых людзей, а за мінулы каляндарны год — ужо 75 тыс. Гэта 7—8 тыс. чалавек штомесяц. У БРСМ уваходзяць — 7 працэнтаў дэпутатаў. Ніякімі адміністрацыйнымі рэсурсамі нікога ўвайсці ў арганізацыю не прымусіш. Толькі даверам да яе. Аснову БРСМ складаюць 70 працэнтаў школьнікаў і студэнтаў (з іх 48 працэнтаў школьнікі).

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ОАО «Белагропромбанк»
совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ГАРАЖЕЙ, РАСПОЛОЖЕННЫХ ПО АДРЕСУ: Г. МИНСК, УЛ. ТИМИРЯЗЕВА, 91

Номер лота	Номер гаража	кв.м	Начальная цена с НДС
1	1 Б (с ямой)	28,3	18 400 000
2	2 Б (с ямой)	20,3	13 710 000
3	3 Б	16,5	11 510 000
4	4 Б (с ямой)	16,3	12 700 000
5	5 Б	16,7	11 550 000
6	6 Б	16,6	11 530 000
7	7 Б	16,4	11 410 000
8	8 Б	15,7	11 250 000
9	9 Б	16,6	11 610 000

Размер задатка 10% от начальной цены лота и перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 дней после проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

АУКЦИОН СОСТОИТСЯ:
19 сентября 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18 сентября 2007 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Телефон (8017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСПУШЧАНАЯ РАДА ПАЗБАВІЛА ЮШЧАНКУ НЕДАТЫКАЛЬНАСЦІ

Дэпутаты Вярхоўнай Рады V склікання, якія сабраліся ўчора на чарговую сесію, нягледзячы на тое, што парламент чатыры разы быў распушчаны прэзідэнтам, прынялі закон аб адмене гарантый недатыкальнасці для дэпутатаў, суддзяў і прэзідэнта.

Папраўкі ў Канстытуцыю павінны ўступіць у сілу 20 лютага 2008 года. Пакуль што закон, за які прагаласавалі 259 дэпутатаў, накіраваны на экспертызу ў Канстытуцыйны суд. Нагадаем, раней з прапановай адмяніць дэпутацкі імунітэт выступіла прэзідэнцкая «Наша Украіна». У адказ Партыя рэгіёнаў прапанавала пазбавіць недатыкальнасці прэзідэнта.

Між тым прэзідэнт Віктар Юшчанка, які распусціў Раду яшчэ 2 красавіка, а затым тройчы пацвердзіў сваё рашэнне, лічыць пасяджэнні парламента нелегітымнымі і адмаўляецца падпісваць прынятыя законапраекты.

МАЛДОВА СКАРАЧАЕ АРМІЮ

У Малдове пачаўся чарговы этап скарачэння ўзброеных сіл: колькасць ваенных у нацыянальнай арміі, паводле слоў міністра абароны рэспублікі Віталя Врабіе, будзе зменшана з 6,8 тыс. да 6,5 тыс. чалавек.

Зараз армія рэспублікі мае на ўзбраенні 6 знішчальнікаў МіГ-29, 209 бронетранспарцёраў, а таксама 150 гарматаў і мінамётаў. Пры гэтым большая частка ўзбраення, што засталося з часоў былога СССР, састарэла і мае патрэбу ў рамонце.

ПРАДАЕЦЦА АДЗІН З КАНАРСКІХ АСТРАВОЎ

Іспанія выставіла на продаж адзін з астравоў Канарскага архіпелага. Востраў Мантанья-Клара, што на поўначы ад больш буйнога Лансаротэ, прадаецца за 9 млн еўра.

Востраў вулканічнага паходжання і займае плошчу каля 300 гектараў. Лотам ужо зацікавіўся ўрад Іспаніі. Адзіны істотны мінус такой перспектыўнай пакупкі — будаўніцтва на Мантанья-Клара забаронена з мэтай захавання навакольнага асяроддзя. Дарэчы, Іспанія — не першая краіна, якая прапанавала астравы на продаж. Напрыканцы ліпеня Эстонія аб'явіла аб продажы Птушынага вострава (Linnusita) плошчай 4,8 гектара за 220 тыс. долараў. Набыць латвійскі Круглы востраў у 3,2 гектара на возеры Разнас можна амаль за 1 млн долараў.

ВАЕННЫЯ СУПРАЦЬ... ПЧОЛ

Улады вострава Шры-Ланка вымушаны былі выкарыстаць вайсковыя часці, каб эвакуіраваць турыстаў з сусветна вядомай каменнай крэпасці Сігірыйя.

Надвор'е было вельмі спякотным, ды і турысты паводзілі сябе шумна, што і прывяло да атакі на іх раз'юшаных дзікіх пчол. Ваенным давялося тэрмінова эвакуіраваць дзесяткі чалавек, прычым больш сотні турыстаў апынуліся на бальнічных ложках.

Каменная крэпасць Сігірыйя знаходзіцца ў спісе Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, яе насяляюць некалькі розаў пчол, якіх мясцовыя жыхары лічаць рэінкарнацыяй воінаў цара Касьяпы, які пабудаваў крэпасць у 475 годзе н.э.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.09.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 147,00
1 еўра	2 918,85
1 латвійскі лат	4 186,41
1 літоўскі літ	845,39
1 чэшская крона	105,51
1 польскі злоты	762,55
1 расійскі рубель	83,87
1 украінская грыўня	427,05

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,5982
10 UAH	50,8911
1000 BYR	11,9020
EUR	34,8571

Курс у гандлёвых кампаніях (на 04.09.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісьмецся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у раздзеле «Па самай выгаднай цане». Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ СПРАВАЗДАЧЫ АБ ВЫКАНАННІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ ЗА 2006 ГОД

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 27 чэрвеня 2007 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 29 чэрвеня 2007 года

Зацвердзіць справаздачу аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за 2006 год па даходах у суме 28 666 592 969,9 тыс. рублёў і па расходах у суме 27 488 113 887,4 тыс. рублёў з перавышэннем даходаў над расходамі ў суме 1 178 479 082,5 тыс. рублёў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА
11 ліпеня 2007 года, г. Мінск
№ 256 — З

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯ Ў НЕКАТОРЫЯ КОДЭКСЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ АДКАЗНАСЦІ ЗА ПАРУШЭННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 11 красавіка 2007 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 20 красавіка 2007 года

Артыкул 1. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 63, 2/946) наступныя змяненне і дапаўненне:

1. Артыкул 15.60 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 15.60. Парушэнне рэжыму аховы і выкарыстання ахоўных зон вакол стацыянарных пунктаў гідраметэаралагічных назіранняў дзяржаўнай сеткі гідраметэаралагічных назіранняў

Парушэнне рэжыму аховы і выкарыстання ахоўных зон вакол стацыянарных пунктаў гідраметэаралагічных назіранняў дзяржаўнай сеткі гідраметэаралагічных назіранняў — цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да дваццаці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — да пяцідзесяці базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — да двухсот базавых велічынь.».

2. Дапоўніць Кодэкс артыкулам 15.64 наступнага зместу:

«Артыкул 15.64. Парушэнне патрабаванняў заканадаўства аб гідраметэаралагічнай дзейнасці пры вытворчасці гідраметэаралагічнай інфармацыі або выкананні асобных работ і аказанні паслуг

Парушэнне патрабаванняў заканадаўства аб гідраметэаралагічнай дзейнасці пры вытворчасці гідраметэаралагічнай інфармацыі або выкананні асобных работ і аказанні паслуг, якія складаюць гэты від гідраметэаралагічнай дзейнасці, —

цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да трыццаці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — да ста базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — да трохсот базавых велічынь.».

Артыкул 2. У частцы 1 артыкула 3.20, пункце 28 часткі 1 артыкула 3.30 Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 20 снежня 2006 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 14, 2/1291) лічбы «15.60— 5.63» замяніць лічбамі «15.60—15.64».

Артыкул 3. Гэты Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА
10 мая 2007 года, г. Мінск.
№ 222 — З

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯЎ І ЗМЯНЕННЯЎ У ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ЭЛЕКТРАСУВЯЗІ»

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 14 чэрвеня 2007 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 22 чэрвеня 2007 года

Артыкул 1. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 года «Аб электрасувязі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 122, 2/1142) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. Артыкул 6 пасля слоў «Дзяржаўнай камісіяй па радыёчастотах» дапоўніць словамі «пры Савеце Бяспекі Рэспублікі Беларусь».

2. У артыкуле 8:

абзац сёмы выключыць;

абзац восьмы лічыць абзацам сёмым.

3. Артыкул 9 дапоўніць часткай другой наступнага зместу:

«У мэтах забеспячэння каардынацыі дзейнасці ў галіне стварэння і развіцця сетак электрасувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь стварае Міжведамасны каардынацыйны савет, вызначае парадак яго дзейнасці і персанальны склад.».

4. Артыкул 10 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 10. Дзяржаўная камісія па радыёчастотах пры Савеце Бяспекі Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўная камісія па радыёчастотах пры Савеце Бяспекі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі ў сферы размеркавання і выкарыстання радыёчастотнага спектра.

Палажэнне аб Дзяржаўнай камісіі па радыёчастотах пры Савеце Бяспекі Рэспублікі Беларусь і яе склад зацвярджаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.».

5. У артыкуле 16: з часткі сёмай другі сказ выключыць;

частку дзесятую выключыць.

6. У артыкуле 30:

часткі першую і трэцюю дапоўніць словамі «пры Савеце Бяспекі Рэспублікі Беларусь»;

у частцы чацвёртай словы «Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь» замяніць словамі «Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь».

Артыкул 2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін пасля ўступлення ў сілу гэтага Закона прыняць неабходныя меры па прывядзенню заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам.

Артыкул 3. Гэты Закон уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА
6 жніўня 2007 года, г. Мінск.
№ 277 — З

Абаненты МТС пераходзяць на «шасцёрку» з новым кодам

Аператар сотавай сувязі «Мабільныя ТэлеСістэмы» пачаў падключаць сваіх абанентаў на нумары з новым занальным кодам сеткі 33.

У бягучы момант новыя абаненты МТС могуць атрымаць тэлефонны нумар у дыяпазоне ад 6000000 да 6299999. Як паведамляе прэс-служба кампаніі, з увядзеннем новай нумарацыі захоўваецца скарочаны сямізначны набор для здзяйснення галасавых выклікаў і адпраўкі SMS-паведамленняў унутры сеткі МТС. Скарочаны сямізначны набор нумара захоўваецца таксама для адпраўкі MMS-паведамленняў тым абанентам МТС, нумары якіх маюць той жа занальны код, што і нумар абанента, які адпраўляе паведамленне, гэта значыць, з зоны 29 у зону 29 і з зоны 33 у зону 33.

А вось для адпраўкі MMS-паведамлення абаненту МТС, нумар якога мае іншы занальны код (з зоны 29 у зону 33 ці з зоны 33 у зону 29), прыйдзецца ўказваць нумар абанента ў нацыянальным 8 (033) XXXXXXX ці міжнародным фармаце +375 (33) XXXXXXX.

Пры здзяйсненні плацяжоў, каб папярэдзіць магчымую блытаніну, абавязкова трэба ўказваць атрымальніка плацяжу (у дадзеным выпадку гэта МТС) і свой сямізначны нумар. Указанне кода зоны (29) ці (33) для здзяйснення плацяжу не патрабуецца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Паведамленне прэс-цэнтра Канстытуцыйнага Суда

Аб пенсійным забеспячэнні

Канстытуцыйным Судом 7 верасня гэтага года ў адкрытым судовым пасяджэнні будзе разгледжана справа аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь пункта «г» часткі першай артыкула 68 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні».

Вытворчасць па справе ўзбуджана Канстытуцыйным Судом 15 чэрвеня 2007 г. па прапанове Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Неабходна высветліць, ці валодаюць дзеці, чые бацькі былі неабгрунтавана рэпрэсаваны па палітычных матывах у перыяд рэпрэсій 20—80-х гадоў XX ст. і затым рэабілітаваны, правам на павышэнне пенсіі.

21 снежня 1990 г. Вярхоўным Саветам было зацверджана Палажэнне аб парадку аднаўлення правоў грамадзян, якія пацярпелі ад рэпрэсій у 20—80-х гадах. У ім першапачаткова ішла гаворка аб грамадзянах, незаконна рэпрэсаваных па палітычных, сацыяльных, нацыянальных, рэлігійных і іншых матывах, і не акцэнтавалася ўвага на дзецях.

Пастановай Вярхоўнага Савета ад 23 снежня 1991 г. Палажэнне было дапоўнена пунктам 16, у адпаведнасці з якім пацярпелымі ад палітычных рэпрэсій прызнаны таксама дзеці, што знаходзіліся ў месцах пазбаўлення волі, у ссыльцы, высыльцы, на спецпасяленні ў сувязі з рэпрэсаваннем іх бацькоў.

Пастанова Вярхоўнага Савета ад 3 снежня 1993 г. ільготы, устаноўленыя для ахвяраў палітычных рэпрэсій, нароўні з дзецьмі, што знаходзіліся разам з бацькамі ў месцах пазбаўлення волі, у ссыльцы, высыльцы, спецпасяленні, распаўсюдзіла і на дзяцей, якія засталіся сіротамі ў сувязі з рэпрэсаваннем іх бацькоў.

Пастанова Вярхоўнага Савета ад 18 кастрычніка 1994 г. выклала пункт 16 у новай рэдакцыі, у адпаведнасці з якой пацярпелымі ад палітычных рэпрэсій прызнаны:

1) дзеці, якія знаходзіліся разам з бацькамі ў месцах пазбаўлення волі, у ссыльцы, высыльцы, на спецпасяленні;

2) дзеці, якія засталіся ў непаўналетнім узросце без апекі бацькоў, неабгрунтавана рэпрэсаваных па палітычных матывах;

3) дзеці, муж (жонка) асобаў, расстраляных або памерлых у месцах пазбаўлення волі і рэабілітаваных пасмяротна.

На практыцы пенсіі павышаюцца дзецям, якія знаходзіліся разам з бацькамі ў месцах пазбаўлення волі, у ссыльцы, высыльцы, на спецпасяленні. Астатнія катэгорыі дзяцей такога павышэння пенсіі не атрымалі. Наколькі гэта правамерна — Канстытуцыйны Суд і павінен вынесці свой вердыкт.

Людміла МУРАШКА,
начальнік аддзела зваротаў і міжнародных сувязяў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МОЛАДА — НЕ ЗЕЛЕНА

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

— Які працэнт вясковай моладзі ўваходзіць у БРСМ?

— Канешне, вясковая моладзь больш занятая ў параўнанні з гарадской. У яе свой двор, гаспадарка. Наша задача — заняць моладзь у вольны час. На сёння ў нашай арганізацыі каля 15 працэнтаў моладзі з вёскі. Аднак гэты паказчык расце з кожным днём. Зараз мы знайшлі падтрымку ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі: ствараем галіновы камітэт.

— У якім з рэгіёнаў Беларусі моладзь больш актыўная?

— У апошні час выдзяляюцца Віцебск і Магілёў. Асабліва адзначу Віцебшчыну. Праграму «Уладар вёскі» трэба распаўсюджваць па ўсёй рэспубліцы. Чым работнікі сельскай гаспадаркі горшыя за сталічных бізнэсменаў? Яны любяць сваю працу, сям'ю, жывуць у вёсцы і маюць магчымасць адпачыць: скокнуць з парашутам, схадзіць у горы. Гэта новая арыгінальная форма працы на вёсцы.

— Якія мерапрыемствы за пяць гадоў існавання БРСМ сталі яго візітнай карткай?

— Асноўнай мэтай БРСМ застаецца мабілізацыя маладзёжнай ініцыятывы на карысць беларускага грамадства. Галоўнае — не сядзець па кабінетах і перапісваць горы макулатуры, а выходзіць на месцы і жыць праблемамі моладзі. Каньком нашай арганізацыі безумоўна стала працаўладкаванне. Працаўладкавана каля 135 тыс. маладых людзей. Калі параўноўваць з савецкім камсамолам, росквіт якога прыйшоўся на 80-я гады, то тады працаўладкоўвалі 38 тыс. маладых людзей. Толькі сёлета ў Беларусі працаўладкавана звыш 42 тыс. І гэта не канчатковая лічба. Брэндавымі акцыямі БРСМ сталі «За Беларусь!», «Служым Беларусі!», «Стоп СНІД!», «Алімпія». Адбываюцца традыцыйныя турзлёты, арганізоўваюцца лагеры: «Сяброўства славян», «Бе-Ла-Русь». У добрым сэнсе слова мы сёння канкурыруем з аддзеламі адукацыі, спорту і турызму на месцах, асабліва ў сельскай мясцовасці. У прынцыпе гэта правільна. Я лічу, што мы выйшлі на новы ўзровень адносінаў з дзяржавай. Мы з'яўляемся галоўнымі сувыканальнікамі праграмы «Моладзь Беларусі», якая распрацавана на пяць гадоў. Такой праграмы не існуе ні ў адной краіне ні на постсавецкай прасторы, ні ў Еўропе. Мы рэалізуем 60—70 працэнтаў праграмы «Моладзь Беларусі». Вярнуліся да будатрадаўскага руху, аднавілі паездкі на БАМ. Стаяла задача выйсці на самафінансаванне, і мы цудоўна выконваем яе. Добры прыклад — наша радыёстанцыя «Пілот-FM». Яна пашырае свой дыяпазон вяшчання. У снежні мы адкрыліся ў Брэсце, у чэрвені — у Магілёўскай вобласці, а ў кастрычніку адкрыем новы рэгіён — Віцебшчыну, хоць планавалі выйсці на гэту геаграфію толькі да 2009 года. Прыходзяць новыя рэкламадаўцы, павялічваецца прыбытак. Сёлета ён вырасце ўдвая і складзе 200 млн. Тыповая сітуацыя і ў іншых прадпрыемстваў. «Спадарожнік» у 2005—2006 гады меў 1,5 тыс. турыстаў, а ў канцы гэтага года мы перавысім планку ў 5 тыс. Яшчэ плануем наладзіць маладзёжную латарэю «Юнацтва».

— Вы казалі аб падтрымцы маладзёжнай ініцыятывы. Якую з іх асабліва выдзеліце?

— Важным крокам назаву ініцыятыву моладзі правесці ў 2009 годзе Сусветны фестываль моладзі менавіта ў нас. Пакуль Сусветная федэрацыя разглядае тры кандыдатуры — Беларусь, Індыя і Лівія. Мы вельмі спадзяёмся, што фестываль пройдзе ў нас. Варыцца толькі ў сваім катле і не бачыць, што адбываецца справа, злева, за спінай, нельга. Мы вельмі ганарымся, што падпісалі пагадненні з маладзёжнымі арганізацыямі розных дзяржаў свету, якія спрабуюць будаваць нармальную будучыню сваёй краіны. Гэта Венгрыя, Грэцыя, Сірыя, Казахстан, Азербайджан, Куба, Венесуэла, Расія, Украіна. Заўважу, што ўпершыню 8 замежных дэлегацый прыехалі, каб павіншаваць БРСМ са святам, абмяняцца меркаваннямі. Дарэчы, сярод ініцыятыў БРСМ — бізнэс-планы па будынках, якія пустуюць, каб зрабіць у іх цэнтры моладзі. Такі, напрыклад, ёсць у самым цэнтры Гродна.

— Якой вы бачыце будучыню БРСМ у сваіх думках? Якія праблемы патрэбна вырашаць зараз?

— Паводле прагнозаў, склад арганізацыі яшчэ больш пашырыцца, бо 430 тыс. БРСмаўцаў — гэта толькі 16 працэнтаў маладых людзей краіны ва ўзросце ад 14 да 31 года, якіх у нас звыш 2 млн. А што робяць астатнія 84 працэнты? Чым яны займаюцца ў вольны час? Мяркую, што ў бліжэйшую пяцігодку мы вырасцем на 30 працэнтаў. Сярод нашых клопатаў — наладжванне дакладнай кадравай палітыкі, каб не было такога, што першым сакратаром раёна ці горада становіцца студэнт, які толькі скончыў школу.

У свае пяць гадоў БРСМ — самая масавая, магутная маладзёжная арганізацыя, якая нясе вялікую сацыяльную нагрузку ў грамадстве. Такіх буйных арганізацый у свеце адзінкі: у Кітаі, В'етнаме, Індыі, Сірыі, на Кубе, дзе магутны маладзёжны рух...

Ірына ПРЫМАК.

«ШЭРАЯ» ЗАРПЛАТА. НЕ ПАПАДЗІЦЕСЯ Ў САЦЫЯЛЬНЫ КАПКАН!

«Нарэшце я атрымаў тое, што хацеў: цікавы калектыў, добрую зарплату, Інтэрнэт на рабочым месцы. Наогул я зараз называюся «інжынер-электроншчык» і працую на заводзе. Гучыць, канешне, не вельмі, але цяпер я не атрымліваю зарплату «ў канверце» і не бегаю за «дзядзькам Дырэктарам» у надзеі атрымаць падачку ў выглядзе сваіх заробленых грошай. Думаю, на дадзеным этапе мне гэта падыходзіць!».

Пост на адным з форумаў у Інтэрнэце.

Як шмат якасных змяненняў адбылося ў абліччы гарадоў і пасёлкаў апошнім часам! І заўтрашні дзень бачыцца ўжо не такім нявесёлым, як гэта было 10—15 гадоў таму.

Павышэнне ўзроўню жыцця беларускага народа — вось галоўная задача на цяперашнім этапе сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі. І ў аснове вырашэння гэтай задачы — забеспячэнне ўстойлівага росту заработнай платы, якая вызначае пакупніцкую здольнасць насельніцтва і з'яўляецца адной з крыніц фінансавання многіх дзяржаўных расходаў, у тым ліку расходаў на ўтрыманне аб'ектаў аховы здароўя, адукацыі, культуры, мерапрыемстваў па добраўпарадкаванню населеных пунктаў, ахове правапарадку і інш.

У адпаведнасці з заканадаўствам з заработнай платы і іншых даходаў фізічных асобаў утрымліваецца падаходны падатак, які паступае ў бюджэт той адміністрацыйнай тэрытарыяльнай адзінкі (раёна, горада, вобласці), у якой пражываюць яго плацельшчыкі. А сродкі гэтага бюджэту накіроўваюцца на ўтрыманне аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы.

У гэтай сувязі на пярэдні план паўстае праблема вываду заработнай платы з «ценю», іншымі словамі — праблема легалізацыі даходаў насельніцтва. І праблема гэта шматузроўневая. Але, як гэта ні падаецца дзіўным на першы погляд, у яе вырашэнні зацікаўлены ўсе: і грамадзяне, што атрымліваюць заработную плату «ў канвертах», і іх работадаўцы, і, канешне ж, дзяржава.

Не з'яўляецца сакрэтам той факт, што некаторыя нядобрасумленныя суб'екты гаспадарання, жадаючы плаціць падаткі і адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны па мінімуму, заніжаюць звесткі па аплаце працы, якія адлюстроўваюцца ў бухгалтарскім уліку, або не адлюстроўваюць іх на рахунках прадпрыемстваў зусім. І калі недзе з'яўляецца «чорны нал», якім можна плаціць зарплату «ў канвертах», то гэта прыкмета таго, што дзейнічае крыніца атрымання няўлічаных грошай, выплата якіх у выглядзе заработнай платы «ў канверце» з'яўляецца толькі апошнім звяном у ланцужку парушэнняў заканадаўства ў сферы падаткаабкладання, у выніку чаго ў бюджэт нашай краіны не трапляюць значныя сумы грашовых сродкаў. Атрымальнік такой зарплаты нароўні з наймальнікам становіцца ўдзельнікам небяспечнай гульні з законам, якая завецца ценявой эканомікай.

Выплачваючы заработную плату «ў канверце», нядобрасумленныя суб'екты гаспадарання і індывідуальныя прадпрымальнікі зламысна ідуць на некаторыя супрацьпраўныя дзеянні.

Як паказвае практыка, асноўнай крыніцай для выплаты «канвертнай» зарплаты з'яўляецца няўлічаная выручка, грашовыя даходы ад незаконных фінансавых аперацый і незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама наяўнасць у штаце «мёртвых душ» (якім зарплата налічваецца, але не выплачваецца), прэміяльныя і іншыя выплаты, якія налічваюцца неабгрунтавана.

Часцей за ўсё парушэнні сустракаюцца ў сферах будаўніцтва, гандлю, абслугоўвання насельніцтва, прычым у камерцыйных арганізацыях. Часам высвятляецца, што чалавек афіцыйна, па ведамасці, атрымаў зарплату толькі часткова, а то і зусім працаваў без заключэння працоўнага дагавора.

Ужо ў І паўгоддзі 2007 года пры правядзенні кантрольных мерапрыемстваў падатковымі органамі выяўлена 146 выпадкаў выплаты 332 грамадзянам заработнай платы без адлюстравання ў рэгістрах бухгалтарскага ўліку («у канвертах»).

Так, пры правядзенні выязной комплекснай праверкі аднаго з плацельшчыкаў пры ўдзеле УКДБ Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці былі праведзены апытанні былых супрацоўнікаў арганізацыі, на падставе якіх установлены факты выплаты заработнай платы траім работнікам у большым памеры, чым адлюстравана ў ведамасцях. Гэтыя выплаты расцэнены як заработная плата «ў канвертах», дадаткова прад'яўлена да выплаты падаходнага падатку ў суме 1,7 млн руб., адлічэнняў у фонд садзейнічання занятасці — 0,6 млн руб.

У ходзе выязных комплексных праверак двух другіх плацельшчыкаў сумесна з Наваполацкім МРА УДФР КДК установлены факты выплаты (красавік 2007 г.) заработнай платы ў сумах 22 млн руб. і 20 млн руб., не адлюстраваных у рэгістрах бухгалтарскага ўліку. Па выніках праверак даналічаны падаходны падатак у суме 4 млн руб.

Дабіцца пэўнага поспеху ў барацьбе з гэтай з'явай можна не толькі шляхам сумесных дзеянняў падатковых і праваахоўных органаў, умацавання кантролю з іх боку над наймальнікамі і работнікамі, але і з дапамогай інфармацыі ад фізічных асобаў, якім наймальнік прапануе зарплату «ў канверце».

Неабходна адзначыць, што з мэтай недапушчэння парушэнняў заканадаўства аб працы і занятасці насельніцтва падатковымі органамі праводзіцца пастаянная растлумачальная работа сярод насельніцтва і плацельшчыкаў праз сродкі масавай інфармацыі, указаныя пытанні асвятляюцца прэс-правядзенні семінараў з плацельшчыкамі, гутарак і лекцый з працоўнымі калектывамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі і наёмнымі асобамі, адпаведная інфармацыя таксама размешчана на стэндах у інспекцыях і на рынках.

Акрамя таго, у мэтах прафілактыкі правапарушэнняў у сферы падатковага заканадаўства, умацавання тлумачальнай работы сярод плацельшчыкаў сілами пярвічных арганізацый ГА «БРСМ», інспекцый МПЗ Рэспублікі Беларусь па абласцях і г. Мінску праведзена маладзёжная акцыя «Не — заработнай плаце «ў канверце!» Удзельнікамі акцыі на рынках, у гандлёвых цэнтрах, на стэндах інспекцый размешчана інфармацыя аб наступствах атрымання заработнай платы «ў канвертах», праведзены тлумачальныя сустрэчы з патэнцыяльнымі атрымальнікамі такой зарплаты.

Важна ведаць, што, пагаджаючыся на заработную плату «ў канверце», работнік найперш папаўняе кішэню свайго наймальніка, а не бюджэт горада, у якім жыве, а таксама садзейнічае ўчыненню правапарушэнняў і нават злачынстваў у сферы падатковага заканадаўства, што для наймальнікаў можа пацягнуць за сабой адміністрацыйную адказнасць, а ў некаторых выпадках і крымінальную.

Вельмі часта негатыўныя наступствы зарплаты «ў канверце» людзі звязваюць толькі з пенсіямі па ўзросту. Тлумачачы гэта тым што да пенсіі яшчэ далёка, а сродкі патрэбны зараз, і пагаджаюцца на працу або без афармлення, або на маленькую (па бухгалтарскай ведамасці) зарплату, але з даплатай ў так званым канверце.

Аднак праблема выплат заработнай платы «ў канверце» — найперш сацыяльная: гэта праблема выплат сацыяльных дапамог, сацыяльнага забеспячэння насельніцтва. Бо чым менш грошай паступае ў бюджэт, тым меншая падтрымка сацыяльнага забеспячэння нашых грамадзян.

Многія да гэтага часу не падазраюць, што зарплата ў канверце — гэта сацыяльны капкан. У яго можна папасці ў любую хвіліну. Атрымліваючы «шэрыя» грошы і думаючы пры гэтым аб істотнай выгадзе, работнік у многім абдзяляе сябе і сваіх блізкіх.

Па-першае, работнік не абаронены ад самавольства з боку наймальніка ў выпадку «нечаканага» звальнення. Не такія ўжо рэдкія выпадкі, калі індывідуальныя прадпрымальнікі або кіраўнікі камерцыйных структур пазбаўляюцца ад няўгодных работнікаў, не выплаціўшы ім заработную плату за некалькі адпрацаваных месяцаў. Ні аб якіх гарантыях, прадугледжаных працоўным заканадаўствам для выпадкаў звальнення па ініцыятыве наймальніка, і гаварыць не даводзіцца. Працоўныя дагаворы ў такіх выпадках, як правіла, адсутнічаюць; як следства, няма і абавязацельстваў па выплаце заработнай платы.

Па-другое, нелегальна атрыманыя грашовыя сродкі вельмі праблематычна накіраваць на набыццё жылля, аўтамабіля, валюты, аплату абучэння дзяцей, іншыя буйныя расходы, паколькі такія аперацыі знаходзяцца на кантролі падатковых органаў, якія абавязкова патрабуюць пацвердзіць расходы легальнымі крыніцамі. Патрабаваць прадстаўлення згаданай дэкларацыі, акрамя падатковых органаў, могуць таксама органы Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органы ўнутраных спраў, органы дзяржаўнай бяспекі, а таксама пракуратуры. Пры гэтым тэрмін, пасля якога падатковыя органы не мелі б права спаганяць нявыплачаныя сумы падаходнага падатку, заканадаўствам не абмежаваны.

Па-трэцяе, паколькі форма аплаты працы «нелегалаў», як правіла, здзельная, то становіцца вельмі нявыгадна хварэць. Усе бальнічныя лісты аплачваць няма каму, ды і навошта. А калі чалавек захварэе сур'ёзна, то працоўнае месца, хутчэй за ўсё, за ім не захаваецца.

Па-чацвёртае, апошнім часам назіраецца рост актыўнасці насельніцтва ў атрыманні банкаўскіх крэдытаў на будаўніцтва або набыццё жылля, іншыя спажывецкія мэты. І тут для «нелегала» гарыць чырвонае святло. Бо пацвердзіць сваю плацежаздольнасць можна толькі афіцыйнай заработнай платай, а «ліпавыя» даведкі могуць пацягнуць сур'ёзныя штрафы.

І самае галоўнае. Жывучы сённяшнім днём, трэба задумвацца аб дні заўтрашнім, а менавіта: аб памеры пенсіі, якую будзеце атрымліваць праз некалькі гадоў, каб не давялося потым шкадаваць, што ў свой час не паклапаціўся аб сваім будучым дабрабыце, што стаў раптам цяжарам для ўласных дзяцей, або аб тым, што даводзіцца прасіць міласціну ў людзей або дзяржавы.

Па фактах выплаты заработнай платы «ў канверце», якія маюць месца, звяртайцеся ў інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па месцы жыхарства або работы, на тэлефон даверу Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь (017) 206-53-53, а таксама на сайт www.nalog.by.

Аддзел інфармацыйна-растлумачальнай работы Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Дыскусійная трыбуна

НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ — ПРЫЯРЫТЭТ

Нядаўна Беларусь нягучна і без шырокіх каментарыяў аб'явіла аб пераарыентацыі беларускай валюты: цяпер, нагадаю чытачам, наш рубель будзе прывязвацца замест расійскага рубля да амерыканскага долара. Чаго тут больш: эканомікі ці палітыкі? Аб гэтым і іншых актуальных знешнеэканамічных праблемах і іх наступствах наш карэспандэнт гутарыць з незалежным беларускім эканамістам, кіраўніком аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Л.Ф. ЗАІКАМ.

— Леанід Фёдаравіч, спачатку давайце ўдакладнім: што ўвогуле значыць прывязка і, у прыватнасці, беларускага рубля да замежнай валюты? У чым тут сэнс і што гэта нам дае?

— Краін у свеце амаль две сотні, а моцных, устойлівых валют (іх яшчэ называюць цвёрдымі) — усяго нічога: долар ЗША, еўра, японская іена, швейцарскі франк і яшчэ некалькі. Таму большасць краін звычайна суадносіць ці прывязвае абменны курс сваёй грашовай адзінкі да адной з такіх трывалых валют. Прывязка — гэта, вобразна кажучы, у першую чаргу выбар канкрэтнай краінай барометра ў небяспечным плаванні па неспакойнаму і часам непрадказальнаму сусветнаму фінансавому мору, які павінен адразу і тонка рэагаваць на змены рынку. Мэта прывязкі — максімальна знізіць верагодныя страты на розніцы абменных курсаў грашовых адзінак.

Напрыклад, для нас гэта азначае, што залаты змест беларускага рубля суадносіцца з залатым зместам амерыканскага долара. Важны момант — пры выбары валюты для прывязкі абавязкова ўлічваюцца маштабы яе выкарыстання пры міжнародных гандлёвых здзелках. У дадзеным выпадку долар — бясспрэчны лідар.

— Аднак да апошняга часу ў нас, як мне здаецца, не было важкіх прэтэнзій да расійскага рубля. Што здарылася?

— А іх і зараз няма. Нашы грошы і, так бы мовіць, наша грашовая ўлада жывуць сваім уласным жыццём. Яна час ад часу вымушана прымаць абсалютна тэхналагічныя рашэнні, прадыктаваныя чыста прагматычнымі намерамі. Напрыклад, аб прывязцы да той ці іншай замежнай валюты. Апошнія дзесяць гадоў расійскі рубель у адносінах да долара ЗША няўхільна ўмацоўваўся. Калі ў Расіі пасля сумна вядомага дэфолту 1998 года адзін долар каштаваў 30 рублёў, то цяпер — 25. Гэтае падаражанне рубля называецца рэвальвацыяй. Яна нам не на карысць.

Раней беларускі вытворца пры продажы ў Расію свайго тавару, скажам, у 100-доларавым эквіваленце ЗША, атрымліваў 3000 расійскіх рублёў, то цяпер за гэту самую прадукцыю ўжо 2500. Розніца, як бачыце, адчувальная. Гандаль з Расіяй з-за ўмацавання яе валюты аб'ектыўна становіцца менш выгадным. Прывязка нашай валюты да расійскага рубля робіць беларускі экспарт у Расію больш дарагім. Гэта датычыцца і мясамалочнай прадукцыі, і калійных угнаенняў, і нафтапрадуктаў. Нашы тавары з-за ўмацавання рубля становяцца менш канкурэнтаздольнымі ў Расіі — адным з нашых галоўных гандлёвых партнёраў. Адсюль і пераарыентацыя беларускай валюты.

— Тым не менш некаторыя расійскія палітыкі і палітолагі ў гэтым рашэнні ўбачылі пераважна палітычную складовую, маўляў, Беларусь — ненадзейны саюзнік, паварочваецца тварам да Захаду. А як на ваш погляд?

— Эканамічная складовая гэтага рашэння для мяне бясспрэчная. Яна абумоўлена ў першую чаргу прагматычнымі грашовымі меркаваннямі і не звязаная з жаданнямі Расіі ці Злучаных Штатаў «прывязаць» ці «не прывязаць» Беларусь да сваёй валюты. Проста ў нашых імпартна-экспартных аперацыях асноўная валюта — долар. Акрамя гэтага, валюта ЗША больш хутка і дакладна, чым расійскі рубель, адлюстроўвае ўсе перамены на сусветным рынку. Мушу заўважыць, што і расійскі рубель таксама прывязаны да амерыканскага долара.

— І ўсё ж ці ёсць тут элементы палітыкі?

— Вядома. Мы паказваем Расіі, што арыентуемся на каштоўнасці і праблематыку сусветнай эканомікі, а не толькі расійскай. Дарэчы, апошнім часам расійская эканоміка жыве выключна сваімі эгаістычнымі інтарэсамі, яна літаральна заваленая амерыканскімі долярамі. Між іншым, гэта не зусім добра для краіны. З-за перанасычанасці замежнай валютай пачынае развівацца інфляцыя.

— А чаму мы не прывязаліся да еўра?

— Таму што гэта нявыгадна. Тыя краіны, якія выбралі еўра, страцілі ў фінансавым плане. Еўра паступова ўмацоўваецца і тым самым пагаршаюцца цэнавыя ўмовы для экспарту ў краіны зоны гэтай валюты.

— Ці не паўплывае адмоўна наша прывязка да долара на развіццё беларуска-расійскай інтэграцыі, бо адной з яе канчатковых мэтаў планаваўся пераход на адзіную валюту?

— Перайсці на яе можна даволі хутка. Толькі навошта пакуль? У грашовай сферы Беларусь і Расія не перашкаджаюць адна другой, нічога дрэннага не робяць свайму саюзніку. Іншая справа, што наша прывязка да амерыканскага долара сведчыць аб рашучасці Беларусі ў фінансавых адносінах у першую чаргу кіравацца сваімі эканамічнымі нацыянальнымі інтарэсамі. Скажам, цяпер мы можам больш паспяхова гандляваць сваёй прадукцыяй на еўрапейскіх рынках. Ды і ў гандлі са Злучанымі Штатамі мы маем пэўную перавагу па імпарту.

Што датычыць пераходу на адзіную валюту, то тут усё будзе залежаць ад супадзення нацыянальных інтарэсаў Беларусі і Расіі, палітычнай волі іх кіраўнікоў. Аднак пакуль мы назіраем, паўтару ся, рост эгаістычных настрояў капітанаў расійскага бізнэсу.

— Газавы канфлікт напрыканцы мінулага года, здаецца, як ніколі дагэтуль рэльефна акрэсліў эканамічныя супярэчнасці саюзнікаў?

— Так. Асабліва гэта відавочна ў сферы паставак энерганосьбітаў Беларусі. Расіяне здабываюць газ па 15 дол. ЗША за тысячу кубаметраў. А нам, сваім саюзнікам, прадаюць па 101 долару. І збіраюцца ўзняць цану да 150 дол. ЗША за тысячу кубаметраў. І гэта пры тым, што беларускія геолагі, будаўнікі і спецыялісты ўнеслі вялізарны ўклад у асваенне нафтагазавых радовішчаў. Цяпер нам прапануюць газ па сусветных цэнах. Ці па-саюзніцку гэта? Які сэнс у паскарэнні інтэграцыі, калі мы не маем доступу да энергетычных рэсурсаў Расіі? З другога боку, назіраецца імкненне расійскіх алігархаў танна набыць нашы лепшыя прадпрыемствы.

Цікавая рэч атрымліваецца. Іран дае нам магчымасць на выгадных умовах здабываць у сябе энерганосьбіты. Венесуэла таксама не адмаўляе ў гэтым, а вось Расія менш чым па сусветных цэнах не пагаджаецца прадаваць нам газ і нафту.

**— Чым вы тлумачыце непахісную пазіцыю Газпрама на перамовах з

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

5 верасня 2007 г. № 34 (88)

РЭЗЕРВЫ ЭКАНОМІІ

НЯХАЙ БУДЗЕ СВЯТЛО!

Генеральны дырэктар РУП электраэнергетыкі «Магілёўэнерга» Уладзімір СЯРГЕЕЎ расказаў у інтэрв'ю «Местному самоуправлению» пра магілёўскі вопыт супрацоўніцтва паміж энергетыкамі і сельвыканкамамі ў справе належнай арганізацыі вулічнага асвятлення.

— Я толькі адразу хачу засцерагчы ад памылковага погляду, што вулічнае асвятленне можа поўнасцю кіравацца энергетыкамі, — так пачаў гутарку Уладзімір Васільевіч. — Мы — арганізацыя, якая забяспечвае электраэнергіяй, і наша адказнасць заканчваецца на электрычным патроне. Мы адказваем за тое, каб на ім было напружанне. А вось лямпачка — гэта ўжо спажыванне энергіі. І яе карыстальнік павінен лямпачку ўкруціць, і няхай яна гарыць, пакуль энергія аплачваецца.

— Менавіта «Магілёўэнерга» стала ініцыятарам навядзення парадку ў сферы вулічнага асвятлення ў вёсках?

— Канешне, мы — камерцыйная арганізацыя і фармальна зацікаўлены ў тым, каб прадаць электраэнергіі як мага болей. Ёсць грошы — плаціце і спажывайце. Аднак часам атрымліваецца, што ў адным месцы густа, а ў другім — пуста. Таму мы вырашылі да справы падысці разумна і сістэмна. Мы прапанавалі прыняць палажэнне аб парадку абслугоўвання вулічнага асвятлення ў вобласці. Яго падтрымалі, і мы сапраўды навялі парадак у гэтай сферы. Вулічнае асвятленне стала кіруемым і эканамічным. Прычым, рычагі гэтай эканамічнасці апынуліся ў руках мясцовых органаў улады.

— Якія дамовы ў сувязі з палажэннем вы заключаеце з сельвыканкамамі?

— Першая дамова — на забяспячэнне сацыяльных патрэб у электраэнергіі. У прынцыпе, нічога новага ў ёй няма. Акрамя таго, што да кожнай дамовы з'явіліся дадаткі, якія маюць на ўвазе вулічнае асвятленне. Гэта план кожнага населенага пункта з указаннем вуліц, жылых дамоў, іншых аб'ектаў — калодзежа, калонкі, ФАПа і крамы, а таксама і светлавых апораў. Там адзначана, дзе павінны быць ліхтары. Калі для сельвыканкама гэта «пад'ёмна», то можна зрабіць і на ўсіх апорах патроны, якія будуць працаваць. Маўляў, чакаем ад вас лямпачку і аплату — за энергію і будзе святло.

— Аднак, прадбачу, ахвотнікаў ярка асвяціць вёску не знаходзіцца. Ці не імкнуцца сельвыканкамы, наадварот, зэканоміць на асвятленні?

— Ёсць мінімальныя сацыяльныя стандарты, паводле якіх трэба асвятліць 80 працэнтаў вуліцы альбо мець не менш за дзве светлакропкі ў населеным пункце, калі ён маленькі. Але ў кожнай вёсцы — сваё меркаванне наконт арганізацыі асвятлення. У адной жыхары хочуць ліхтары на ўездзе, выездзе і каля калодзежа. У іншай — каля крамы і калонкі. Праўда, калі погляды жыхароў вёскі з цягам часу памяняюцца, то можна змяніць першапачатковы план ў выглядзе прыняцця дадаткова га пагаднення.

— Ліхтары і фотарэле могуць ламацца, а лямпачкі час ад часу перагараюць. Якім чынам працуе сістэма паведамлення аб праблемах з асвятленнем?

— Любая тэхніка час ад часу выходзіць са строю. Мы можам даведацца, што ў вёсцы няма святла, калі наша брыгада робіць аб'езд. Бабулі альбо іх сваякі не заўсёды датэлефануюцца ў электрасеткі ці ў выканкам, каб паведаміць аб праблеме. Таму мы зрабілі стаўку на старасту — старшага чалавека ў вёсцы. У дамовах з сельвыканкамам прапісана хто з'яўляецца старастай населенага пункта і выступае даверанай асобай у справе працы вулічнага асвятлення.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

«ЯПОНСКАЯ СІСТЭМА» Ў БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЕ

Сёння дырэктару школы, асабліва калі знаходзіцца яна ў невялікім населеным пункце, без гаспадарчай жылкі — ніяк. Ну, не разгонішся ты на бюджэтныя сродкі, каб ператварыць сваю навучальную ўстанову ў месца, куды дзецям сапраўды прыемна прыходзіць. Можна, канешне, абысціся і малым — там-сям нешта падфарбаваць, падраманціраваць або заклікаць на дапамогу бацькоўскія кашалькі — маўляў, дапамажыце, хто чым можа. І многія абыходзяцца. Толькі не дырэктар Ашмянскай СШ № 1 Міхаіл ГРУЖЭЎСКІ.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Шчыра кажучы, спачатку да прапановы наведаць гэту ўстанову адукацыі мы з фотакарэспандэнтам аднеслі даволі скептычна — ну што там можа быць асаблівага? Тым больш напярэдадні 1 верасня, калі ўсе школы рэспублікі пасля навядзення летняга «марафэту» выглядаюць урачыста-адноўленымі?.. Збіраліся зазірнуць на пяць хвілін, а прыехалі — і забыліся пра гадзіннік. Адразу палезлі ў сумкі па дыктафон і фотаапарат.

Размаўляючы з Гружэўскім, немагчыма не падпасці пад уплыў яго моцнай энергетыкі. Гэтак жа, як немагчыма знайсці на падначаленай Міхаілу Мар'янавічу тэрыторыі хоць пядзю нядобраўпарадкаванай зямлі — кожны яе ўчастачак павінен прыносіць карысць і радаваць вока.

Газоны, гранітныя пасыпкі, «каркасы» для клумб з нарэзанага шыферу, блакітныя елачкі, «коратка стрыжаныя» серабрыстыя вербы, туя, сасна, ядловец... А побач — астравы астраў, якія сваім колерам быццам кідаюць выклік вечназялёным суседзям...

— Вам, напэўна, толькі фантана не хапае, — жартуем мы. На што Гружэўскі рэагуе ў момант:

— А мы ўжо пра гэта думалі. У прынцыпе, рэалізаваць ідэю можна. Праблема ў іншым: раз перайшлі на рэжым эканоміі, расходаваць ваду проста так наўрад ці нехта палічыць мэтазгодным.

Галоўную задачу педагагічнага калектыву Міхаіл Мар'янавіч вызначае наступным чынам: зрабіць усё для таго, каб дзіцяці хацелася сюды прыходзіць. Ні больш ні менш. А непасрэдная задача самога дырэктара — увесь час падкідваць калектыву новыя ідэі. Заўважце: не навязваць. Бо не прыжывуцца.

— Я ідэю ціхенька падкідваю, а потым... раблю паўзу, каб калектыў «пераварыў». Праз дзён 5—10 нехта абавязкова падумае, што ідэя — яго ўласная. І з энтузіязмам возьмецца за яе ўвасабленне. А я толькі «за», — усміхаецца Міхаіл Мар'янавіч.

Ён і сам нагадвае вечны рухавік. 20 гадоў кіруе школай, а вока па-ранейшаму «гарыць». Дзякуючы гэтаму «гарэнню», уменню запаліць і захапіць іншых Гружэўскаму не аднойчы прапаноўвалі ўсемагчымыя пасады і партфелі. Але ён пагадзіўся толькі на... грамадскую нагрузку, пасля чаго належны тэрмін адпрацаваў (выключна «па сумяшчальніцтву» і на грамадскіх пачатках) намеснікам старшыні Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў. Але сёлета гэты пост давялося пакінуць у сувязі з павышэннем — Міхаіла Мар'янавіча вылучылі, а потым і выбралі дэпутатам абласнога Савета.

Па школьнаму ўчастку ходзім, як па батанічным садзе.

— Напэўна, даводзіцца траціцца на вартаўнікоў — інакш як зберагчы такую прыгажосць?

— Ды ніхто тут нічога не ламае — вось у чым справа. Прыгажосць выхоўвае прыгажосць. Тэрыторыя школы заўсёды адкрыта — і для дзяцей, і для мясцовых жыхароў. Калі ласка, прыходзьце, любуйцеся, толькі школы не рабіце. З парушальнікаў парадку я памятаю, хіба што, толькі бабулю, якая перад Вербнай вырашыла «пазычыць» у нас яблоўцу. Правялі з ёю выхаваўчую работу, — смяецца Міхаіл Мар'янавіч.

Нішто не каштуе так дорага, як прыгажосць. Прычым, і ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Усе гэтыя дызайны з дэкорамі, а таксама насенне і расада патрабуюць немаленькіх фінансавых затрат. І хоць падлічванне грошай у чужой кішэні — справа малапрыемная, не магу не пацікавіцца ў спадара Гружэўскага: а грошы адкуль? Няўжо бюджэтныя?

— Ды не, — цярпліва тлумачыць ён, — заробленыя. Два гады запар мы займалі першае месца ў рэспубліцы па здачы макулатуры. Сёлета, думаю, будзе тое ж самае — бо ўжо здадзена 28 тон макулатуры плюс 70 тон металалому.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

БУДНІ СЕЛЬСАВЕЦКІЯ

«НЯЛІШНІЯ» ГРОШЫ З ПАДВОРКУ

Узровень даходаў у гарадах і ў сельскай мясцовасці адрозніваўся заўсёды. Так, не сакрэт, што сёння большасць гараджан лічыць прымальным заробак у мільён рублёў і вышэй, тады як для значнай часткі вяскоўцаў зарплата ў 300—500 тыс. —«ужо грошы». Аднак з адной вельмі істотнай агаворкай: калі пры гэтым трымаць уласную гаспадарку. А таксама рэгулярна здаваць лішкі сельгаспрадукцыі.

«Сямейная» справа

Прудкоўскі сельсавет знаходзіцца амаль на самай мяжы з райцэнтрам Чавусы, што, зразумела, можна лічыць адной з яго бясспрэчных пераваг. Аднак дзе «плюс», там часцяком і «мінус». Так, даводзіцца канстатаваць, што тутэйшыя землі — амаль адзін пясок. У сваю чаргу гэта акалічнасць шмат у чым вызначала стан мясцовай гаспадаркі. Калгас, а затым сельгаскааператыў імя Леніна не вылучаўся ні высокімі ўраджаямі, ні добрымі паказчыкамі ў жывёлагадоўлі, што ўрэшце і стала прычынай яго рэарганізацыі, а, дакладней, аб'яднання з СВК «Асінаўскі».

З пункту гледжання эканомікі такі крок падаваўся цалкам лагічным. Але заўважана даўно: рэформы амаль ніколі не абыходзяцца без непапулярных крокаў. Так атрымалася і ў дадзеным выпадку. Нізкія надоі малака, хранічная праблема недахопу кармоў, высокі сярэдні ўзрост супрацоўнікаў, вялікая аддаленасць ад цэнтра новай узбуйненай гаспадаркі — усё гэта падштурхоўвала да рашэння аб закрыцці малочна-таварнай фермы ў вёсцы Рымінка. А ў выніку гэтага без асноўнага занятку засталося 11 чалавек, сярод іх цяпер ужо былы загадчык МТФ Сяргей Сцефаненка.

— Я знайшоў сабе месца, уладкаваўся сацыяльным работнікам у Рымінцы, — кажа Сяргей Мікалаевіч. — Аднак сама па сабе наша вёска невялікая, зараз на надомным абслугоўванні ў мяне ўсяго 5 чалавек. Таму атрымліваецца толькі 0,7 стаўкі, ці крыху больш за 100 тыс. рублёў у месяц. Словам, абысціся без асабістай гаспадаркі ў такой сітуацыі цяжка. Таму мы з жонкай узялі гектар зямлі, трымаем курэй, свіней, а таксама трох кароў. І кожны дзень здаём малако.

Сказаць, што малако дае значны прыбытак, напэўна, нельга. Тым не менш менавіта гэта крыніца даходу фактычна прыносіць гаспадару «другую» зарплату. Апроч таго, жартуюць у сельсавеце, тыя ж Сцефаненкі працуюць «на сямейным падрадзе»: Кацярына Захараўна, жонка Сяргея Мікалаевіча, уладкавалася ў Рымінцы малаказборшчыкам. А гэта хоць і невялікія, але ніколі не лішнія грошы.

Усё пачынаецца з... даверу

Сама па сабе схема збору «прыватнага» малака, здаецца, існуе дзесяцігоддзі. Аднак «працавала» яна далёка не заўсёды. Дастаткова сказаць, што зусім нядаўна ад кожнай каровы ў Прудкоўскім сельсавеце здавалі ўсяго па 640 літраў. Або ў чатыры разы менш, чым летась. Ці ў пяць разоў менш па выніках ужо гэтага года.

— У 1999-м, калі пасля выбараў я ўзначаліў сельскі Савет, мы знаходзіліся ў аўтсайдарах па раёну, таму перш-наперш трэба было разабрацца ў прычынах такога становішча, — распавядае старшыня Мікалай Казлоў. — А яны аказаліся на паверхні. Як і мае быць, з прыватнымі здатчыкамі заключаліся дагаворы. Але вось выконваліся яны далёка не заўсёды. Напрыклад, у мясцовай гаспадарцы маглі спаслацца на кепскі ўраджай і, насуперак абяцанням, проста... не выдаць за малако збожжа.

Першая задача, якую трэба было вырашыць у той час — «аднавіць давер». Дзеля гэтага ў кожным населеным пункце выбралі «даверaных асобаў» (пазней яны сталі называцца старастамі), з якімі наладзілі штодзённую сувязь па тэлефоне. Такая ж сувязь усталявалася і з малаказборшчыкамі. Такім чынам, з'явілася поўная інфармацыя — чым незадаволены той ці іншы чалавек, што ён хоча атрымаць ад сельскага Савета ці гаспадаркі, якія ўзнікаюць цяжкасці. І зразумела, што любая з праблем аказвалася падставай для аператыўнага ўмяшання. «Пры гэтым мы вызначылі, што адказнасць нясуць усе без выключэння, — заўважае Мікалай Казлоў. — Скажам, калі малаказборшчык раптам пракалоў кола і не мае магчымасці выехаць на падворкі, я вымушаны тэрмінова знайсці новую пакрышку. А калі не атрымаецца — зняць пакрышку са свайго аўтамабіля».

> **Такім чынам, з'явілася поўная інфармацыя — чым незадаволены той ці іншы чалавек, што ён хоча атрымаць ад сельскага Савета ці гаспадаркі**

Другім крокам сталі «перамовы» з сельгаскааператывам і строгі кантроль за выкананнем узаемных абавязкаў. Калі ў дагаворы запісана, што за 2000 літраў малака будзе прадастаўлена 0,03 сотні сенажаці, 500 кілаграмаў саломы, а пры здачы малака і цяляці — яшчэ і бясплатная паша, то кожны ведае, што так будзе на самай справе.

Нарэшце, прыйшоўся вельмі дарэчы пераход з аднаразовых на двухразовыя разлікі ў месяц. Прычым, збояў тут ужо няма. І ўсё ж якраз аплата — тэма па-ранейшаму ці не найбольш вострая.

Літры з надбаўкай

Літр бензіну — пяць літраў малака. Аднак весці доўгую размову аб узроўні закупачных цэн не варта, бо ў рэшце рэшт і даволі высокі канчатковы кошт малочнай прадукцыі ў крамах, і кан'юнктура сусветных рынкаў — таксама рэалій. Таму, лічыць Мікалай Казлоў, наракаць на сумнавядомы дыспарытэт няма сэнсу. Трэба шукаць выйсце.

— На жаль, артыкулаў, паводле якіх сельвыканкам можа дадаткова заахвоціць найбольш актыўных здатчыкаў, у нашым Законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» няма, — адзначае Мікалай Казлоў. — Адпаведна, неабходна рабіць стаўку на дзве крыніцы — раённую і абласную прэміі. Безумоўна, гэта вельмі высокая планка. Але, як высветлілася, яна не з'яўляецца недасягальнай, галоўнае паабяцаць, што амаль уся прэмія пойдзе не на нейкія агульныя патрэбы, а непасрэдна людзям. Праўда, варта заўважыць, што каб быў сапраўдны стымул, мы вырашылі дзяліць прэмію не на ўсіх — у спісы трапляюць толькі тыя, хто здае больш за 2 тыс. літраў.

Дарэчы, раённую і абласную прэміі за малако Прудкоўскі сельсавет атрымаў ужо летась. Тады, у залежнасці ад «асабістага ўкладу», аднаму са здатчыкаў выплацілі 75, другому 90, а трэцяму — 150 тыс. рублёў. Словам, прэцэдэнт ёсць. А разам з ім і настрой паўтарыць мінулагодні вынік сёлета.

Паводле слоў старшыні, адно з па-сапраўднаму няпростых пытанняў — знайсці добрага малаказборшчыка. Стрымліваюць тут і зусім невысокая зарплата, і «дадатковыя ўмовы» — даводзіцца шукаць людзей, якія маюць уласнага каня, вупраж і калёсы. Але ці не самая важная ўмова — сумленнасць.

— Каб не ўзнікала якіх-небудзь непаразуменняў, пры сельвыканкаме створана спецыяльная камісія, у склад якой уваходзіць старшыня, сакратар, лабарант з фермы і кіраўнік брыгады сельгаспрадпрыемства, — кажа Мікалай Казлоў. — Камісія перыядычна бярэ пробы малака, да таго ж, робіць такія праверкі раптоўна. І калі высвятляецца адхіленне ад нарматыўных 3,4 працэнта па тлустасці, пачынаецца разбор, вынікам якога становяцца не толькі матэрыяльныя санкцыі, але і агульны сход з вынясеннем вымовы. Пры гэтым апошняя мера атрымліваецца ці не самай эфектыўнай — праз непрыемную працэдуру такога сходу не хоча прайсці ніхто.

Дагавор — таксама выйсце?

Яшчэ пяць гадоў таму на тэрыторыі Прудкоўскага сельсавета налічвалася 79 прыватных кароў, а сёння — толькі паўсотні. Нягледзячы на блізкую адлегласць ад райцэнтра, агульная колькасць жыхароў сельсавета працягвае пакрысе змяншацца, тут становіцца ўсё больш пажылых людзей. Што ж да моладзі, то, заўважае старшыня, у яе ўжо крыху іншая псіхалогія. Як толькі стаў павышацца ўзровень дабрабыту, пачасціліся і меркаванні: «Лепш пажыць для сябе, а малако, кефір ці смятану можна заўсёды купіць у краме». І, напэўна, аспрэчыць такую думку сапраўды нельга.

— У той жа час практычна ўсе нашы жыхары трымаюць гаспадарку, большасць мае па 40—50 сотак, а некаторыя — і па гектару зямлі, — зазначае Мікалай Казлоў. — Прычым, гэта — таксама непасрэдны даход вяскоўцаў. Таму сёння ў нас ёсць задума стварыць уласную гасразліковую брыгаду, якая б дапамагала людзям у апрацоўцы ўчасткаў і ўборцы ўраджаю. Стартавая «раскладка» тут выглядае нібыта някепска — ва ўласнасці нашых жыхароў маецца 27 коней і 11 трактароў. Засталося вырашыць праблему са штатам. Прычым, хутчэй за ўсё, з улікам невялікага памеру сельсавета, больш правільна набраць супрацоўнікаў брыгады па сумяшчальніцтву — як кажуць, без «адрыву» ад асноўнага месца работы.

Сяргей ГРЫБ.

Чавускі раён.

ПАМІЖ ПОЛЬШЧАЙ І УКРАІНАЙ

размясціўся Тамашоўскі сельсавет

Людзі ў Тамашоўцы і навакольных вёсках прывыклі жыць ва ўмовах памежжа. Граніца Савецкага Саюза з Польшчай праходзіла тут з пасляваенных часоў, а да граніцы з Украінай таксама паступова прызвычайваюцца. Цяжка яе бывае распазнаць у лесе. То нашы, то іхнія грыбнікі час ад часу ўсё ж парушаюць межы незалежных дзяржаў, бывае, што незнарок. Вёскі Орхава, Рыцец, Тамашоўка — крайнія пункты на паўднёвым захадзе краіны. На карце Тамашоўскі сельсавет выцягнуты вузкай палоскай паміж Украінай і Польшчай.

Для тутэйшых даярак не навіна, калі напамінаюць, што на дзённую дойку ў поле трэба абавязкова ездзіць з пашпартам. Розныя кампаніі, звязаныя з пагранічным рэжымам, перажывалі вяскоўцы. Адзін начальнік заставы, напрыклад, нават заахвочваў пасьбу кароў блізка ад нейтральнай паласы. Бо нарад пагранічнікаў прайшоў і пайшоў далей, а чалавек цэлы дзень стаіць у полі і бачыць, што робіцца ўздоўж граніцы. Апошнім часам, праўда, жывёла пераведзена на стойлавае ўтрыманне, больш у полі кароў не дояць. Але тамашоўцы да ўсіх кампаній ставяцца з разуменнем: такі лёс жыхароў памежжа.

Раней Тамашоўка была прыгарадам цяпер польскага горада Владавы. Горад зусім побач, купалы яго царквы і касцёла добра відаць з вёскі. Стаіць і масток праз Буг, цераз які раней ездзілі з чыгуначнай станцыі ў горад. Цяпер два рады высокай агароджы з калючага дроту закрываюць кароткі шлях. Ехаць даводзіцца праз Дамачава, афіцыйны пагранпераход, які знаходзіцца недзе ў 20 кіламетрах ад Тамашоўкі. І людзі ездзяць даволі часта — з аднаго і другога боку жыве шмат сваякоў, сяброў. Але «камерцыйных тураў» становіцца менш. Устойліва развіваецца мясцовае ААТ «Камароўка», да якога далучылі слабейшыя гаспадаркі. Сталі нятаннымі візы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ОТКРЫТЫЙ ФОРУМ

НЕ ФОРМАЛЬНЫЙ ПОДХОД

Новые направления политики государства, принципиальные требования Президента Республики Беларусь повернуть государственный механизм к конкретному человеку обязывают нас коренным образом пересмотреть свои подходы к работе. Методы ее организации с применением административного ресурса, какие бы они не были, уходят. Приходит осознание, что наши люди могут и должны работать с отдачей только тогда, когда за их плечами стоит минимум проблем как личного, так и бытового характера. Эти проблемы должна решать власть. Время требует от нас не формального подхода к работе с людьми, а активной, целеустремленной настойчивости по созданию комфортной среды жизнедеятельности для наших граждан.

Как совершенствовать «обратную связь» между властью и населением

В Кировском районе на деле создаются должные условия для жизни людей. Ежегодно сдается в эксплуатацию порядка 7 тыс. квадратных метров жилья, введены в эксплуатацию агрогородки Мышковичи, Павловичи, Барсуки. В текущем году ведутся работы по строительству агрогородков Боровица и Жиличи. Многое сделано в области благоустройства населенных пунктов и наведения порядка на земле. Переустраивается под современные стандарты торговая и бытовая сеть. Развиваются сети газификаций и связи. Ведется работа по улучшению качественных показателей государственных социальных стандартов...

В рамках практической реализации требований Директивы Президента Республики Беларусь № 2 «О мерах по дальнейшей дебюрократизации государственного аппарата» за сравнительно короткий срок созданы условия для работы заявительного принципа «одно окно».

На базе стоматологической поликлиники, расположенной в центре города, после ремонта с апреля 2007 г. начал действовать Центр обслуживания населения. Сегодня в одном здании расположено 14 организаций по выдаче справок и иных документов. Концентрация этих жизненно важных служб в одном месте позволяет сегодня воспользоваться их услугами, осуществить тот или иной вид оплаты при отсутствии очередей, не выходя из здания.

На уровне сельских Советов депутатов также определен перечень административных процедур по заявительному принципу «одно окно».

Кроме того, председатели сельских Советов депутатов тесно контактируют со старостами населенных пунктов с целью выяснения социально-общественной ситуации в деревнях, решения текущих вопросов повседневной жизни людей.

К решению проблем жизнеобеспечения населения привлечены руководители сельскохозяйственных производственных кооперативов и подсобных предприятий, которые в большинстве своем являются депутатами сельских или районного Советов депутатов. Самые важные вопросы на селе: посев, посадка, уборка сельскохозяйственных культур, выделение пастбищ, сена, транспорта — все это решается с их участием. Ведь в деревне живут люди, которые честно работали и работают сегодня, укрепляя благосостояние нашего государства. Об этом мы должны помнить постоянно.

Районный Совет депутатов и райисполком ввели новую форму работы по изучению ситуации в отдаленных населенных пунктах. С этой целью мы образовали 9 мобильных групп из числа работников райсовета, райисполкома, районных служб, которые выезжают на места и встречаются с населением в тот момент, когда люди покупают продукты из автомагазина или когда завозится хлеб. Все поступившие вопросы оформляются протоколом поручений и направляются в соответствующие инстанции на реагирование. Лично мне эта форма работы понравилась. Думаю, что она приносит пользу людям.

Уже третий год ежемесячно выезжает в какой-то из сельских Советов района рабочая группа из числа работников райсовета, райисполкома, районных служб и председателя суда района для изучения ситуации на месте в соответствии с требованиями, что вытекает из требований Директивы Президента Республики Беларусь № 1 от 11 марта 2003 года «О мерах по укреплению общественной безопасности и дисциплины»). В течение месяца рабочей группой изучается криминогенная обстановка, которая сложилась на территории данного Совета. Затем на заседании до местных жителей доводится информация по итогам проведенной проверки. Там же рассматриваются административные протоколы, проводится заседание районного суда. Кроме этого, заслушиваются отчеты руководителей СПК и председателей Советов о проводимой работе по реализации требований Директивы. Председатель суда района Надежда Чмара в конце итогового заседания дает юридические консультации по всем интересующим людей вопросам.

Активная позиция власти в решении вопросов жизнеобеспечения населения, совершенствование цепочки «обратной связи» между властью и населением способствуют сохранению управляемой общественно-политической ситуации в районе. А это позволяет в полной мере решать задачи социально-экономического развития территории.

Василий МАРКЕВИЧ,
председатель Кировского районного Совета депутатов.

НЯХАЙ БУДЗЕ СВЯТЛО!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Ці апраўдваюць сябе фотарэле асвятлення, якія ўстанаўліваюцца ў вёсках?

— Чуюцца размовы, што грошай на аплату вулічнага асвятлення не хапае. І таму маюцца прэтэнзіі да фотарэле: маўляў, рана ўключае святло і позна адключае. Мы яшчэ бачым блікі ад прыгожага захаду сонца — а яно ўжо гарыць. Ці светла ад белага снегу — а яно яшчэ паліць.

Таму хачу сказаць: рэле зроблена паводле дзяржаўных стандартаў, і яно не мае «пачуццяў» наконт прыгажосці захаду альбо блікаў белага снегу. Яму недастаткова «люксаў», у якіх вымяраецца інтэнсіўнасць святла. Мы рэле не перароблім.

Затое мы здольны, калі ёсць жаданне, зрабіць просты рубільнік, і чалавек можа паваротам ручкі выключыць асвятленне альбо ўключыць яго. Калі сельвыканкам давярае гэту справу старасце, то мы такое робім.

— Але стараста можа з'ехаць, захварэць ці нешта іншае...

— Так, ёсць яшчэ адна магчымасць для эканоміі. Аднак энергетыкі не маюць права яе рэалізоўваць, пакуль гэта не падтрымаюць органы ўлады. Нас ужо просяць устанавіць дадатковае рэле часу, каб святло не палілася ўначы, альбо каб ліхтары ўключаліся пазней і адключаліся раней.

Мы такое зрабіць можам, тэхнічна гэта цалкам магчыма. Аднак тут трэба разумець, што давядзецца рабіць выбар: выконваць сацыяльныя стандарты ў поўным аб'ёме альбо часткова не выконваць з прычыны эканоміі. Але мы на сябе такую адказнасць браць не можам, гэта павінен вырашаць райвыканкам. На маю асабістую думку, усё залежыць ад таго, куды пойдуць зэканомленыя грошы. Калі можна паменшыць асвятленне ўначы ў вёсцы, і сродкі ад эканоміі накіраваць на чыстку комінаў бабулям і рамонт праводкі ў дамах шматдзетных сем'яў, то я б не быў супраць. Правілы трэба выконваць, але з любога правіла, як паказвае жыццё, можна рабіць разумнае выключэнне.

— А калі лямпачка перагарэла альбо сапсавалася рэле, якім чынам вядуцца іх замена і рамонт?

— Гэта якраз справа другой дамовы, паводле палажэння. Я з самага пачатку зазначыў, што лямпачка — гэта адказнасць сельвыканкама. Нам выдаюць лямпачкі, і мы ўстанаўліваем іх — гэту працу не можа выканаць любы чалавек, бо яна вядзецца на вышыні і патрабуе спецыяльных навыкаў, а потым выстаўляем рахунак за выкананую працу. Першы раз, калі прыводзілі ў парадак вулічнае асвятленне ў вёсках, закруцілі свае лямпачкі, цяпер іх дае прадстаўнік мясцовай улады.

Калі здарылася паломка альбо не гарыць лямпачка, сельвыканкам можа падаць заяўку ў раённы цэнтр і на працягу 10 дзён наша брыгада прыедзе — адрамантуе і паставіць лямпачку. Гэта, натуральна, каштуе грошай. І за адну лямпачку можна прыстойна заплаціць: заробак рамонтнікам, кошт паліва і амартызацыя для аўтамабіля і гэтак далей.

> Вулічнае асвятленне стала кіруемым і эканамічным. Рычагі гэтай эканамічнасці апынуліся ў руках мясцовай улады

Але тут таксама ёсць магчымасць зэканоміць. Паводле графіка, на электрасетках праводзяцца папераджальныя планавыя работы. Стаўбы ж існуюць не толькі для вулічнага асвятлення, яны нясуць электрычнасць у дамы і на фермы. І калі нашы спецыялісты прыедуць, яны, паралельна з выкананнем сваіх задач, памяняюць спаленыя лямпачкі абсалютна бясплатна.

Але ў гэтым выпадку трэба чакаць, абыходзіцца без святла пэўны час. І задача старшыні сельвыканкама — растлумачыць мясцовым жыхарам: за зэканомленыя грошы можна адгрэйдзіраваць дарогу альбо зрабіць пад'езд да могілак. Вось такое жыццё.

— Скажыце, калі ласка, ці апраўдаў сябе ўвогуле новы парадак абслугоўвання вулічнага асвятлення ў вобласці?

— Апраўдаў на 100 працэнтаў. І вялікая перавага палажэння не толькі ў навядзенні парадку і стварэнні дакладнай сістэмы працы, але і ў тым, што для сельвыканкама тут ёсць эканамічны інтарэс. Напрыклад, на тэрыторыі вобласці ёсць яшчэ некалькі тысяч ліхтароў з лямпамі напальвання, а не газавымі. Іх трэба абавязкова памяняць. І мы робім гэта паступова па сваёй ініцыятыве. За энергію тут плаціцца бюджэтнымі грашыма, і іх трэба эканоміць.

Мне хочацца, каб раўнавага, якая ўсталявалася ў нас у вобласці дзякуючы сістэмнай працы, захавалася. Гэта раўнавага паміж патрэбамі ў вулічным асвятленні і магчымасцямі яго аплачваць.

Так, у палажэнні запісана, што калі энергія, якую выкарысталі за месяц, не аплачваецца, мы робім папярэджанне і адключаем яе. Аднак раўнавага ёсць. Ёсць узаемаразуменне і прытрымліванне разумных падыходаў. І калі мы памяняем усе лямпы на больш эканамічныя, раўнавага будзе яшчэ больш устойлівай. Газавыя лямпачкі даюць эканомію прыкладна ў паўтара раза. Сёлета, я мяркую, замена завершыцца.

— Цяпер шмат гавораць пра эканомію. І ў прыватнасці пра тое, што пакуль не зменіцца псіхалогія чалавека, значных вынікаў у гэтай сферы не будзе. Як, паводле вашага меркавання, навучыцца эканоміць?

— Крыніц эканоміі шмат, і ў сельскай мясцовасці таксама. Ёсць вялікая колькасць неэфектыўных рэчаў, але пасля выхаду Дырэктывы № 3 пра іх, нарэшце, загаварылі.

Масавая свядомасць, псіхалогія людзей таксама мяняецца. Трэба толькі праводзіць працу па энергазберажэнню разумна. Вось мы прадумалі і псіхалогію, і эканоміку, і палажэнне пра вулічнае асвятленне распрацавалі. І гэта не проста паперка: палажэнне працуе, таму што падтрымліваецца балансам інтарэсаў.

Трэба прадумаць падобныя схемы ўсюды. Каб людзям было нявыгадна рабіць дрэнна. А потым чалавек прызвычаіцца эканоміць. Мы ж разумныя істоты.

— Што б вы пажадалі сваім партнёрам — сельвыканкамам?

— Я сказаў бы ім дзякуй за тое, што ў нас сёння ёсць і працуе сістэма ўзаемадзеяння. Дзякуй, што яны нам плацяць — хоць часам і з затрымкамі, але яны не маюць масавага характару.

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.

«ЯПОНСКАЯ СІСТЭМА» Ў БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Каб стымуляваць дзяцей да такога роду дзейнасці, у СШ № 1 створана своеасаблівая сістэма, паводле якой, акрамя спаборніцтва паміж класамі і вучнямі, існуе спаборніцтва кожнага з самім сабой. Інакш кажучы, кожны год ты параўноўваеш свае цяперашнія вынікі з папярэднімі і робіш адпаведныя высновы... Дарэчы, нехта з навукоўцаў, пачуўшы пра такі падыход, сказаў Гружэўскаму, што ён працуе па японскай сістэме. Міхаіл Мар'янавіч шчыра здзівіўся...

У яго свая сістэма, у адпаведнасці з якой у школе дзіцяці павінна быць утульна — незалежна ад таго, датычыць гэта вонкавага выгляду ці «начынкі». Гружэўскаму не сорамна паказаць любому госцю, няхай сабе і міністру, ні бібліятэку, ні спартыўную залу, ні туалет, ні прышкольную тэрыторыю. А яшчэ яго гонар — караблі з чырвонымі ветразямі. Ідэя, увасобленая ў жыццё настаўнікамі і вучнямі школы два гады таму, сёння разышлася па ўсёй рэспубліцы. Кіраўнікі іншых навучальных устаноў звяртаюцца да Гружэўскага з просьбай... даслаць ім чарцяжы караблёў. «А як даслаць? Мы ж іх без чарцяжоў рабілі, як Бог на душу паклаў...».

Ашмянская сярэдняя школа № 1 — ці не адзіная ў рэспубліцы, дзе грошы зарабляюць яшчэ і ўласнымі канцэртамі. Размова ідзе не пра звычайную самадзейнасць, а пра тры ўзорныя калектывы — фальклорны калектыў песні і танца «Званочкі», вядомы не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі, студыя эстраднай песні «Палёт» і тэатр танца «Эфект». Білеты на «Калядныя сустрэчы», якія ладзяцца штогод сіламі гэтых калектываў у актавай зале школы, раскупляюцца імгненна. Да 220 стацыянарных пасадачных месцаў дадаецца яшчэ 80 — у ход ідуць прыстаўныя крэслы. Падчас «Калядных сустрэч» даецца 5 канцэртаў. І ўсё роўна кожны раз чалавек пяцьдзесят застаецца «за бортам» — не могуць трапіць на шоў-праграму па прычыне адсутнасці білетаў.

— Паколькі ёсць павышаны попыт на нашу канцэртную дзейнасць, сёлета будзем павышаць цану білетаў да 3 тыс. рублёў, — гаворыць Міхаіл Мар'янавіч.

Заказаць залу і канцэрт у індывідуальным парадку могуць і канкрэтныя арганізацыі — скажам, будаўнікі ці работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі падчас свайго прафесійнага свята. Паслуга гэта, як вы разумееце, платная, дзякуючы чаму рэгулярна папаўняецца школьная каса.

— Але не думайце, што нашы дзеці толькі танцуюць, спяваюць і корпаюцца ў клумбах. Яны часам яшчэ і вучацца, — усміхаецца Гружэўскі.

Сёлета 74 працэнты выпускнікоў школы паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы (пяць гадоў таму гэта лічба складала ўсяго 45 працэнтаў). Зноў спрацавала «японская сістэма» — кожны год спаборнічаць з самім сабой?

— І не толькі яна, — тлумачыць Міхаіл Мар'янавіч. — Па-першае, поспехі звязаны з дыферэнцыяцыяй і прафілізацыяй сістэмы навучання. У нас, акрамя базавых, створаны ліцэйскі і гімназічны (адзіны ў рэспубліцы) і ліцэйскі юрыдычны класы. Сёлета дададзім яшчэ і мультыпрофільны, дзе кожны будзе вывучаць прадметы па індывідуальнай праграме. Па-другое, лічу, што на нас спрацавала цэнтралізаванае тэсціраванне. Як толькі яно пачало ўкараняцца, паказчык паступленняў у ВНУ пайшоў уверх. Усе разумеюць, што ЦТ адрэзала магчымасць пратэкцыянізму. Сёння дзеці знаходзяцца ў аднолькавых умовах, і падчас уступнай кампаніі школьнікі з «перыферыі» дэманструюць не горшыя, а часам нават і лепшыя веды, чым іх аднагодкі з буйных гарадоў.

...А потым Міхаіл Мар'янавіч правёў нас «по тихим школьным этажам», па ходу адчыняючы дзверы кабінетаў і класаў. Прыдрацца сапраўды не было да чаго...

Наталля КАРПЕНКА.
Ашмянскі раён.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

АДНЫМ — РАМОНТ. ДРУГІМ — ДАРОГУ

Веляшковічы — кіламетраў за 13 ад Лёзна. Старшыня Веляшковіцкага сельскага Савета Людміла Васількова расказала пра мясцовае жыццё. Праблем тут хапае, як і ўсюды. Добра было, калі ў штаце сельвыканкама меліся «свае» геадэзіст, спецыяліст па зямельных пытаннях. Цяпер яны прымаюць грамадзян толькі раз у тыдзень. А што рабіць чалавеку, калі тэрмінова трэба вырашыць нейкае пытанне?

У саміх Веляшковічах, што сталі першым аграгарадком у раёне, каля 400 жыхароў. А на тэрыторыі сельсавета знаходзіцца 33 населеныя пункты, у якіх жывуць болш за 2000 чалавек. Толькі палова з іх — працаздольныя.

Дзіўна, што ў такім прыгожым месцы ніхто не займаецца арганізацыяй так званага сельскага турызму.

— Чаму? — пытаюся ў старшыні.

— Не знайшлося пакуль што ініцыятыўных людзей. Вось ёсць у нас вёска Ніканаўшчына з адным жыхаром, ды і той дачнік. Канешне, энтузіясты маглі б зрабіць тую ж Ніканаўшчыну своеасаблівым этнацэнтрам для гасцей Лёзненшчыны. А якое прыгожае ў нас Грабеніцкае возера! Мо, хто з нашай інтэлігенцыі пажадае заняцца яго «раскруткай»? Тым больш што турыстычны бізнэс абкладваецца мінімальнымі падаткамі. Індывідуальныя прадпрымальнікі, канешне, ёсць. Напрыклад, прадпрымальнік Ткачоў другі год займаецца нарыхтоўкай дроваў. Людзі задаволены яго паслугамі: машына дроў, ужо гатовых для таго, каб імі можна было карыстацца, каштуе 140 тыс. рублёў. Для параўнання, дровы з лясгаса трэба яшчэ «давесці да розуму».

На жаль, у сельскага Савета няма сур'ёзных крыніц самафінансавання. Незавершаных аб'ектаў будаўніцтва на балансе не значыцца. Хіба што можна браць грошы за збор ягад і грыбоў. Але ж масавага збору на тэрыторыі сельсавета не назіраецца.

Расказала мне Людміла Іванаўна пра тое, што дзякуючы стварэнню аграгарадка тут былі ўстаноўлены тэлефоны, заменены водаправодная сетка і водазаборныя калонкі, вуліцы заасфальтаваны... Што датычыць газіфікацыі, то на праблемы, звязаныя з ёй, мне паскардзіліся ў мясцовай школе жанчыны, якія рабілі чарговы касметычны рамонт на першым паверсе. Гаварылі яны вельмі эмацыянальна і амаль што адначасова, але сутнасць іх «імправізаванай скаргі» я добра зразумеў. «Мясцовая газавая служба падвяла трубу ў аграгарадок, пачала пракладваць ветку да Кавалёў. Але ўсё неабходнае, каб прыватныя спажыўцы падключыліся да газу, не зрабіла. У выніку і газу няма, і дарога разбітая. Людзі на вуліцу выйсці не могуць — такі бруд».

***

Школе ў Веляшковічах у 2004-м споўнілася 140 гадоў. Памятаецца, пісалі тады пра гэты «знакавы» юбілей рэгіянальныя СМІ: «Свята. Свята якое!» Шкада, што юбіляр так і не атрымаў сапраўднай увагі, якой сапраўды заслугоўвае. Вось, у прыватнасці, сучасныя вокны толькі ў некалькіх кабінетах, у тым ліку і ў дырэктара. Добра, што дах больш не працякае. Як расказалі месцічы, кацельня знаходзіцца непасрэдна ў школьным будынку, што, мякка кажучы, не дазваляецца. А што рабіць? І вучыцца, і абаграваць трэба. Але хочацца, каб абласное ўпраўленне адукацыі звярнула на гэта ўвагу.

Пётр Вінаградаў працуе дырэктарам школы ўжо даўно. Жартуе, што выйдзе на пенсію і будзе проста настаўнікам, калі возьмуць. Расказаў пра багатую гісторыю школы. Зараз тут вучыцца 167 чалавек. Прызавыя месцы займаюць на рэспубліканскіх конкурсах па інфарматыцы... Ёсць пры школе свой агарод. Расаду кветак летась вырасцілі і прадалі за 1 млн рублёў. У спартыўнай зале праходзяць спаборніцтвы паміж калектывамі мясцовых гаспадарак.

Шкадуе нераўнадушны дырэктар, што скарацілі напалову стаўкі псіхолага і сацыяльнага педагога. І гэта пры тым, што 12 «цяжкіх» сем'яў стаяць у сельвыканкаме на ўліку. Ды і савету прафілактыкі было б лягчэй з дапамогай прафесіяналаў перавыхоўваць як дзяцей, так і бацькоў.

***

Вельмі не хочацца, каб з-за вышэйпералічаных праблем нехта з адказных асобаў на нас пакрыўдзіўся. Урэшце, і чыноўнікі, і журналісты працуюць на дабрабыт людзей разам. І калі ад гэтай працы ёсць аддача, значыць, і першыя, і другія «ядуць свой хлеб» недарэмна.

Толькі добрыя словы гаварылі мясцовыя жыхары ў адрас Веляшковіцкай участковай бальніцы, дзе часткова будзе практыкавацца так званы сястрынскі догляд. Маюць неабходнасць старыя ў такой паслузе, асабліва ў зімовы час. Функцыянуюць яшчэ і дзве пачатковыя школы, школа-сад, 3 дзіцячыя садкі, некалькі дамоў культуры, сельскі клуб, 4 ФАПы, участак ЖКГ, 2 аддзяленні банка, 5 аддзяленняў паштовай сувязі. (У некаторых сельсаветах аб такой развітай інфраструктуры і не мараць.)

Пра добраўпарадкаванне могілак таксама не забываюць. Праўда, і тут ёсць праблема: як на вялікай вышыні зразаць галіны старых дрэў? Прамысловыя альпіністы з Віцебска просяць за гэта дорага. Але ж на Лепельшчыне ёсць добры вопыт, калі сельсавет самастойна вырашыў падобную праблему. Добра, што старшыня Веляшковіцкага Савета вырашыла пракансультавацца па гэтай тэме з калегамі...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Лёзненскі раён.

ПАМІЖ ПОЛЬШЧАЙ І УКРАІНАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

З Саловіцкім сельсаветам Турыйскага раёна Украіны тамашоўцы сябруюць. Ездзяць адзін да аднаго на святы вёскі, абменьваюцца вопытам. А сёлета іх напаткала адна бяда — ураган. Вечарам ліпеньскага дня пранёсся вецер такой разбуральнай сілы, што павыкарчоўваў з карэннем 50-гадовыя бярозы, а не маладзейшыя за іх сосны дзе-нідзе пазакручваў вакол сваёй восі. Праўда, з украінскаму боку стыхія прынесла большыя страты — разбурыла дамы і гаспадарчыя пабудовы, пазрывала стрэхі, папляжыла лес.

«Калі прайшоў ураган, — расказвае старшыня Тамашоўскага сельскага Савета Сяргей Пархац, — то раніцай мы агледзелі, што завалена дарога на Орхава і Рыцец. Амаль два дні працавалі леснікі і ўсе, каго ўдалося мабілізаваць, каб расчысціць шлях да вёсак». Зараз павалены, паламаны лес паступова расчышчаюць і пераапрацоўваюць. Па названай дарозе раз-пораз праязджаюць машыны, гружаныя бярвеннямі.

— Ад урагану пацярпела каля 800 гектараў лесу, — расказвае ляснічы Тамашоўскага лясніцтва Уладзімір Пракаповіч. Зараз тут, акрамя сваіх рабочых, знаходзяцца чатыры брыгады суседніх лясніцтваў Брэсцкага лясгаса, брыгада Кобрынскага лясгаса, брэсцкай ПМК-22, СВК «Астрамечава». Працуюць вахтавым метадам. Людзі прыязджаюць на тыдзень—другі. Для кожнай брыгады знайшлі жыллё ў навакольных вёсках, у асноўным пустуючыя дамы. Там рабочыя размяшчаюцца, гатуюць ежу. Тамашоўскі ўчастковы Аляксандр Герасімчук сказаў, што лесараспрацоўшчыкі — у перважнай большасці людзі сур'ёзныя, да іх у міліцыі пакуль ніякіх пытанняў не ўзнікала.

Паводле слоў Уладзіміра Пракаповіча, ім яшчэ пашанцавала, што пад ураган трапіў буйны лес. Таму распрацоўка вядзецца адносна хутка. Прыкладна палову спілаваных дрэў ідзе на дзелавую драўніну, астатнія — на дровы. Пакупнікоў хапае: бяруць Брэст і Брэсцкі раён, Пінск, раёны Мінскай вобласці, некаторая частка накіроўваецца на экспарт. Брыгада Тамашоўскага лясніцтва з шасці чалавек у дзень нарыхтоўвае 20—25 кубаметраў драўніны. Вальшчык лесу Уладзімір Якімчук працуе на гэтай дзялянцы ўжо месяц. Кажа, што работа для яго прывычная, толькі ўмовы крыху экстрэмальныя. Пасля ўрагану засталося многа схіленых дрэў, пасутнасці — аварыйных. Увесь час трэба быць пільным, пакуль пілуеш адно дрэва, каб не звалілася на цябе другое. Мужчыны працуюць поўны рабочы дзень, толькі выхадны цяпер у іх адзін замест двух звычайных. Трэба спяшацца, работа павінна быць скончана да халодоў, тады і якасць драўніны асабліва не пацерпіць.

Наогул жа месца тут ціхае, стыхіі да гэтага часу абыходзілі яго бокам. Летась вясной была невялікая паводка, калі рака разлілася. Вада прыбыла ноччу. А ранкам убачылі дзіўную карціну: поле з боку Владавы падтоплена. А на рулонных цюках саломы сядзяць лісы. Так ім давялося перачакаць паводку, добра што вада сышла хутка.

Сёлета ў Тамашоўцы і навакольных вёсках нават добра ўрадзілі яблыкі. У большасці раёнаў Брэстчыны на іх неўраджай, а тут мароз не пашкодзіў цвету. Вёска, цэнтральная сядзіба гаспадаркі і сельсавета, — прыгажэе на вачах. Зараз не сорамна прымаць госця ці то з Польшчы, ці з Украіны. Пасля таго як афіцыйна быў здадзены аграгарадок, будаўніцтва не закончылася. Сёлета ўвайшоў у строй спартыўны комплекс з басейнам, пабудаваны штучны вадаём з прыгожым дэкаратыўным мосцікам. Пра ААТ «Камароўка» можна сказаць: моцная гаспадарка, якая паступова развіваецца. Сельгаспрадпрыемства будуе дамы для сваіх работнікаў. Зараз з іх «вымалёўваецца» цэлая новая вуліца. Ды і самі вяскоўцы пакрысе будуюцца. Паводле слоў старшыні сельскага Савета Сяргея Пархаца, чаргі на атрыманне ўчасткаў тут няма. Але ж і нельга сказаць, што няма жадаючых атрымаць участак. Рашэнні аб выдзяленні зямельнага надзела сесія мясцовага органа ўлады прымае рэгулярна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Брэсцкі раён.

УСЕ 100-БАЛЬНІКІ ЦТ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ — ПРАДСТАЎНІКІ СТАЛІЧНАГА РЭГІЁНА

Мінскі абласны інстытут павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў да канца бягучага года будзе пераўтвораны ў рэгіянальны інстытут развіцця адукацыі. Аб гэтым на абласной жнівеньскай педагагічнай канферэнцыі, якая традыцыйна папярэднічае пачатку навучальнага года, паведаміла начальнік упраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама Таіса ДАНІЛЕВІЧ.

Зрабіць выпускніка канкурэнтаздольным пры паступленні могуць толькі трывалыя і глыбокія веды

На сённяшні дзень у сістэме адукацыі Міншчыны працуюць 60 тыс. кіраўнікоў, спецыялістаў і рабочых, у тым ліку 34 тыс. педагогаў. Асноўная частка спецыялістаў занята ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі — больш за 22 тыс. 7 тыс. педагогаў працуюць у сістэме дашкольнай адукацыі і каля 2 тыс. — у сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У мінулым навучальным годзе ўсе раёны Мінскай вобласці выйшлі на 80-працэнтны паказчык колькасці настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй, а Мінскі, Дзяржынскі і Крупскі раёны — на 90 і больш працэнтаў. На думку кіраўніка абласнога ўпраўлення адукацыі, не менш актуальным з'яўляецца таксама пытанне павышэння прафесійнай кампетэнцыі непедагагічных работнікаў (бухгалтараў, эканамістаў, інспектараў па кадрах, інжынераў, тэхнолагаў па харчаванню, дыетолагаў, дыетсёстраў і г.д.), ад якіх стабільнасць работы сістэмы адукацыі Міншчыны залежыць не ў меншай ступені .

Сяроднеабласны паказчык ахопу дзятвы дашкольнай адукацыяй у сельскай мясцовасці дасягнуў у сталічным рэгіёне 76 працэнтаў, што на 23 працэнты перавышае аналагічны паказчык па краіне ў цэлым. Лідзіруюць у гэтым накірунку Нясвіжскі, Барысаўскі, Клецкі, Мінскі, Капыльскі і Старадарожскі раёны. Значна ніжэйшы за сяродні абласны паказчык ахопу дзятвы дашкольнай адукацыяй у Смалявіцкім, Вілейскім, Дзяржынскім і Лагойскім раёнах. У Мінскай вобласці функцыянуюць ужо 13 цэнтраў развіцця дзіцяці, якія забяспечваюць павышаны ўзровень адукацыйных паслуг. У мінулым навучальным годзе 6 такіх устаноў адкрылася ў Вілейскім, Дзяржынскім, Мядзельскім, Нясвіжскім, Пухавіцкім і Чэрвеньскім раёнах. Акрамя таго, за прайшоўшы год адкрыты 129 новых формаў дашкольнай адукацыі.

Зараз у цэнтры ўвагі абласнога ўпраўлення адукацыі знаходзіцца пытанне развіцця сеткі ўстаноў і груп санаторнага тыпу. Відавочна, што 7 санаторных дзіцячых садоў і 60 санаторных груп, якія ёсць у вобласці, не могуць задаволіць патрэбнасць у рэабілітацыі і комплексным аздараўленні дзяцей. Таму, зыходзячы з сітуацыі, у гэтым годзе плануецца перапрафіляваць дашкольныя ўстановы агульнага тыпу ў санаторныя ў Вілейскім, Любанскім і Стаўбцоўскім раёнах, а таксама адкрыць дадаткова 12 санаторных груп у дашкольных установах Барысаўскага, Дзяржынскага, Клецкага, Любанскага, Мінскага і Салігорскага раёнаў.

Цяжка спрачацца з меркаваннем, што зрабіць выпускніка канкурэнтаздольным пры паступленні ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы могуць толькі трывалыя і глыбокія веды. У Мінскай вобласці працэнт паступлення паступова расце: у 2006 годзе 47 працэнтаў выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў паступілі ў ВНУ і 27 працэнтаў — у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Стабільна высокія вынікі дэманструюць гімназіі Дзяржынска, Слуцка, Салігорска, Вілейкі, Бараўлянскай гімназіі, гімназіі № 1 Барысава і Нясвіжскай беларускай гімназіі — кожны год больш за 90 працэнтаў выпускнікоў гэтых навучальных устаноў пацвярджаюць сваю канкурэнтаздольнасць і становяцца студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў. Высокія паказчыкі дэманструюць таксама выпускнікі ліцэйскіх класаў Старадарожскага, Мінскага і Барысаўскага раёнаў. А пазіцыі лідара па якасці ліцэйскай адукацыі займае Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй.

Дарэчы, па выніках прайшоўшага ў чэрвені гэтага года цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове адразу тры выпускнікі навучальных устаноў Міншчыны здолелі атрымаць максімальны бал: у 100 балаў былі ацэнены веды Алены Цюховлай (Крупскі ліцэй), Таццяны Варажбіцкай (Негарэльская сярэдняя школа № 1) і Кацярыны Часаўскіх (Чэрвеньская гімназія № 1). А, напрыклад, агульны бал гімназісткі з Дзяржынска Кацярыны Дулуб (маецца на ўвазе сума балаў трох дысцыплін плюс сярэдні бал школьнага атэстата) склаў 389 балаў з магчымых 400.

У бягучым годзе практычна трэцяя частка абласнога бюджэту, а гэта амаль 695 млрд рублёў, накіроўваецца ў сістэму адукацыі. На набыццё аўтобусаў — 1,5 млрд рублёў, спартыўнага рыштунку — 0,5 млрд рублёў і праграму «Інтэрнат» — больш як 1 млрд рублёў.

Вельмі важнай падзеяй стала адкрыццё ў вобласці 1 верасня двух новых сельскіх школ. Новая школа ў вёсцы Азярцо, што ў Мінскім раёне, разлічана на 360 навучэнцаў. Яе будаўніцтва распачалося яшчэ ў 1992 годзе, але з-за недахопу фінансавання работы былі спынены і аднавіліся толькі ў 2005 годзе. Лабараторыі, майстэрні, камп'ютарныя класы, спартыўныя пляцоўкі, бегавая дарожка, стадыён — агульны кошт праекта склаў каля 6 млрд рублёў. Другая новабудоўля — сярэдняя школа ў вёсцы Старлыгі Мядзельскага раёна — стала заменай знесенаму некалькі гадоў назад старому школьнаму будынку. Увогуле на правядзенне капітальнага і бягучага рамонтаў устаноў адукацыі Міншчыны ў абласным бюджэце прадугледжаны ў бягучым годзе звыш 25 млрд рублёў.

Асобна трэба спыніцца на інфарматызацыі навучальных устаноў. На камп'ютарызацыю школ у новым навучальным годзе ўлады Мінскай вобласці выдзелілі 2,3 млрд рублёў. На гэтыя сродкі будуць закуплены 93 кам'ютарныя класы, а таксама неабходнае праграмнае забеспячэнне.

Новыя камп'ютары, укамплетаваныя сучаснымі вадкакрышталічнымі маніторамі, стануць добрым дапаўненнем да камп'ютарнага парка, які быў створаны ў школах раней. Зараз паказчык камп'ютарызацыі складае ў вобласці 1 камп'ютар на 14 навучэнцаў.

— Але аснашчэнне адукацыйных устаноў сучаснай тэхнікай не з'яўляецца для нас самамэтай, — падкрэсліла Таіса Данілевіч. — Бо не менш важна стварыць умовы для прадуктыўнага і эфектыўнага яе выкарыстання. Інтэнсіўная камп'ютарызацыя ставіць перад намі новыя задачы: гэта і неабходнасць стварэння школьных лакальных сетак з выхадам у Інтэрнэт, і пытанні пастаяннага тэхнічнага і праграмнага суправаджэння навучальнага працэсу. Абласны конкурс «Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў адукацыйным працэсе» дазволіў нам ацаніць узровень кампетэнцыі педагогаў і навучэнцаў у галіне інфармацыйных тэхналогій і зрабіць пэўныя высновы ўвогуле аб стане інфармацыйнай адукацыйнай прасторы...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

6-гадовая жыхарка Плешчаніц Лагойскага раёна Вікторыя ПЛЫГАЎКА.

Краіна здароўя

Выпуск № 21 (34)

Прывітанне, чырвоны!

На ўсялякі выпадак

Імкніцеся, каб у вашым асеннім гардэробе не было сініх ці блакітных рэчаў, таму што яны здольны выклікаць песімістычны настрой. Аддайце перавагу цёплым адценням, напрыклад, чырвонаму і аранжаваму.

Святлана ТОМЧЫНА.

Лечыць ільняны алей

У Беларусі распрацаваны спосаб стабілізацыі алею ільнянога семені. Яго аўтарамі з'яўляюцца доктар біялагічных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, лаўрэат дзяржпрэміі ў галіне анкалогіі Таццяна Марозкіна і доктар медыцынскіх навук, прафесар БДМУ, заслужаны дзеяч навукі Беларусі Аляксандр Захарэўскі.

Як расказала Таццяна Марозкіна, у нашай краіне такі алей не выпускаўся з-за праблемы яго захоўвання. Спосаб стабілізацыі раслінных алеяў, распрацаваны беларускімі спецыялістамі, заключаецца ў тым, што ў іх дадаюцца пэўныя вітаміны антыаксідантнага дзеяння і бэта-караціны. Пры гэтым алей стабілізуецца, замаруджваецца яго прагарканне, папярэджваецца акісленне ненасычаных тлушчавых кіслот, якія ў ім утрымліваюцца. Тэрмін захоўвання ільнянога алею з выкарыстаннем гэтага спосабу павялічваецца з некалькіх месяцаў да 5 гадоў.

Што датычыць уласцівасцяў алею ільнянога семені, то Таццяна Марозкіна адзначыла, што існуюць дзве важныя для арганізма чалавека ненасычаныя тлушчавыя кіслоты: альфа-лінолевая кіслата — «амега-3» і лінолевая кіслата — «амега-6». У ільняным алеі ўтрыманне «амега-3» складае каля 75 працэнтаў, «амега-6» — 20 працэнтаў. Для параўнання, у сланечнікавым і іншых алеях знаходзіцца толькі 1—3 працэнты альфа-лінолевай кіслаты. Акрамя таго, падкрэсліла Таццяна Марозкіна, лён — адзіная расліна, якая па свайму складу падобна на рыбін тлушч, а па некаторых параметрах — больш карысная за яго. Да слова, адзначыла спецыяліст, сакрэт даўгалецця нашых продкаў быў менавіта ва ўжыванні свежавыціснутага алею ільнянога семені.

Алей ільнянога семені мае шэраг пераваг перад лекавымі прэпаратамі, якія зніжаюць узровень халестэрыну. У іх, як правіла. выкарыстоўваюцца так званыя інгібітары (прыгнятальнікі) — ферменты, якія сінтэзуюць у арганізме халестэрол. Адначасова з гэтым змяншаецца сінтэз пэўных гармонаў, што адмоўна адбіваецца на здароўі пацыента. Пры выкарыстанні жаўцягонных прэпаратаў, якія таксама прымяняюцца для змяншэння ўзроўню халестэрыну, павялічваецца рызыка развіцця рака кішэчніка, таму што жоўць валодае канцэрагеннымі ўласцівасцямі. Дзякуючы сваім унікальным уласцівасцям алей ільнянога семені актыўна зніжае ўзровень халестэрыну без шкодных для здароўя чалавека наступстваў.

Спектр прымянення алею ільнянога семені вельмі шырокі. Ён умацоўвае сасуды, выкарыстоўваецца як жаўцягонны сродак, перашкаджае ўтварэнню камянёў, тромбаў і злаякасных пухлін, стымулюе імунаахоўныя ўласцівасці арганізма, павышае яго супраціўляльнасць да неспрыяльных фактараў знешняга асяроддзя. Сучасныя даследаванні паказалі, што ўжыванне ільнянога алею зніжае рызыку інсульту на 37 працэнтаў.

Вольга ШВАЙКО, БЕЛТА.

На тэму дня

ВУЧЭБНЫЯ НАГРУЗКІ НА ШКОЛЬНІКАЎ АБЯЦАЮЦЬ МІНІМІЗАВАЦЬ

Фота Пятра ФАМІНА.

Днямі ва ўсіх навучальных установах прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, звязаныя з пачаткам новага навучальнага года. Першы раз школьны званок празвінеў для больш чым 92 тыс. шасцігодак. Наперадзе іх чакае адаптацыя да школьнага жыцця, а гэта працяглы працэс, які можа займаць ад некалькіх тыдняў да паўгода. Усё залежыць ад індывідуальных асаблівасцяў дзіцяці, яго таварыскасці і адукацыйных нагрузак.

Менавіта на высокія вучэбныя нагрузкі часцей за ўсё і скардзяцца бацькі, крытыкуючы школу. Таму пры распрацоўцы новых адукацыйных стандартаў вучэбным перагрузкам была аб'яўлена вайна. Наколькі гэта атрымалася, і школьнікі, і бацькі вельмі хутка змогуць пераканацца на ўласнай практыцы. А вось якія, напрыклад, захады прадугледжаны для папярэджання вучэбных перагрузак у пачатковай школе.

Вучэбныя заняткі ў школах рэкамендуецца пачынаць не раней чым у 8 гадзін, аптымальны час — 9 гадзін раніцы. Заняткі ў першых і другіх класах праводзяцца толькі ў першую змену.

Самы эфектыўны спосаб папярэдзіць стамленне ў шасцігадовых дзяцей — гэта рухальная актыўнасць, якая павінна складаць не менш як 60 працэнтаў ад агульнага часу знаходжання дзяцей у школе. У сярэдзіне кожнага ўрока (акрамя ўрокаў музыкі і фізкультуры) павінны праводзіцца фізкультурныя паўзы і комплексы па прафілактыцы стамлення зроку. У 1 класе на працягу 35-хвіліннага ўрока павінны праводзіцца дзве фізкультпаўзы па дзве хвіліны кожная: праз 10 хвілін пасля пачатку ўрока і на 20-й хвіліне ўрока.

Нельга патрабаваць ад шасцігадовых вучняў захавання на працягу ўрока нерухомай рабочай позы, тым больш што гэта можа прывесці да парушэнняў паставы.

На працягу дня найбольш цяжкія для навучэнцаў прадметы павінны вывучацца на другім-трэцім уроку, калі ў школьнікаў назіраецца пік працаздольнасці. Кантрольныя работы таксама праводзяцца на другім—трэцім уроку ў сярэдзіне вучэбнага тыдня. На працягу працоўнага дня дазваляецца праводзіць толькі адну кантрольную работу, а на працягу тыдня — не больш як дзве. Настаўнікам не дазваляецца замяняць урокі музыкі, выяўленчага мастацтва, працоўнага навучання і фізічнай культуры іншымі ўрокамі і арганізоўваць дадатковыя заняткі па-за ўрокамі. А заняткі з лагапедам ці музыкальным педагогам не павінны замяняць прагулку на свежым паветры і дзённы сон.

Гігіенічна правільная рацыяналізацыя арганізацыі ўрокаў забяспечваецца аптымальнай зменай відаў дзейнасці (ад 4 да 7), працягласцю розных відаў дзейнасці (не больш за 10 хвілін кожная), частатой іх чаргавання, колькасцю выкарыстоўваемых метадаў і прыёмаў выкладання (не менш як трох), іх чаргаваннем (праз кожныя 10—15 хвілін) і наяўнасцю эмацыянальных разрадак (2—3).

Аптымальная працягласць чытання ў шэсць гадоў не павінна перавышаць 8 хвілін, у сем—восем гадоў — 10 хвілін, працягласць пісьма — да 3 хвілін у пачатку і да 2 хвілін — у канцы ўрока.

Тлумачэнне новага матэрыялу для шасцігодак у першым паўгоддзі займае 1—2 хвіліны ўрока, а ў другім — 5—8 хвілін і затым неаднаразова паўтараецца на працягу ўсяго ўрока.

У 1 класе хатнія заданні вучням не задаюцца. У 2 класах хатнія заданні не задаюцца на выхадныя, святочныя дні і канікулы. Вучні 2 класаў павінны траціць на выкананне хатніх заданняў не больш чым 1,2 гадзіны, 3 і 4 класаў — 1,5 гадзіны. Час, выдаткаваны на выкананне задання па аднаму вучэбнаму прадмету, не павінен перавышаць у 2 класе 20 хвілін і 30 хвілін — у 3 і 4 класах.

Аб'ём хатняй работы не можа перавышаць 30 працэнтаў ад аб'ёму работы, што выконвалася ў класе.

Прыкладны аб'ём хатніх заданняў для навучэнцаў 2—4 класаў:

Матэматыка :

2 клас — задача ці 2 слупкі прыкладаў;

3 клас — задача ці 3 слупкі прыкладаў, але не больш чым 16;

4 клас — 2 задачы ці задача і 4 прыклады.

Руская (беларуская) мова:

2 клас — 15—17 слоў;

3 клас — 25—28 слоў;

4 клас — 35—37 слоў.

Практыкаванне для хатняй работы можа ўключаць не больш чым адно дадатковае граматычнае заданне.

Літаратурнае чытанне:

2 клас — не больш чым 1—1,5 старонкі;

3 клас — не больш чым 2—2,5 старонкі;

4 клас — не больш чым 3—3,5 старонкі.

Прадмет «Чалавек і грамадства»:

2 клас — не больш чым 1—1,5 старонкі;

3 клас — не больш чым 2—2,5 старонкі;

4 клас — не больш чым 2,5—3 старонкі.

Для хатніх заданняў могуць прапаноўвацца толькі тыя віды заданняў, якія выконваліся вучнямі на ўроку самастойна. Іх змест павінен быць зразумелым кожнаму вучню, гэта значыць, усе павінны дакладна ведаць, што і як трэба выконваць.

Дарэчы, калі настаўнік арганізоўвае работу так, што навучэнцы засвойваюць увесь неабходны навучальны матэрыял непасрэдна на уроку, ён можа ўвогуле адмовіцца ад хатніх заданняў на нейкі час. А можа прапанаваць дыферэнцыраваныя хатнія заданні, каб вучні маглі выбраць сабе заданне па сваіх сілах і інтарэсах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РАНГАВАЯ ШКАЛА ЦЯЖКАСЦІ ПРАДМЕТАЎ ДЛЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Матэматыка — ***12 балаў.***

Беларуская мова ў школах з рускай мовай навучання; руская мова ў школах з беларускай мовай навучання — ***11 балаў.***

Замежная мова — ***10 балаў***.

Беларуская мова ў школах з беларускай мовай навучання і руская мова ў школах з рускай мовай навучання — ***9 балаў***.

«Мая Радзіма — Беларусь» — ***8 балаў***.

Беларускае літаратурнае чытанне ў школах з рускай мовай навучання; рускае літаратурнае чытанне ў школах з беларускай мовай навучання — ***7 балаў***.

Беларускае літаратурнае чытанне ў школах з беларускай мовай навучання; рускае літаратурнае чытанне ў школах з рускай мовай навучання — ***6 балаў***.

«Чалавек і свет» — ***5 балаў***.

«Фізічная культура і здароўе» — ***4 балы***.

Працоўнае навучанне — ***3 балы***.

Выяўленчае мастацтва — ***2 балы***.

Музыка — ***1 бал***.

Інфарм-укол

СУПРАЦЬ КУРЭННЯ — СТРАШНЫЯ КАРЦІНКІ

Напрыканцы 2009 года каляровыя фотаздымкі, якія дэманструюць наступствы курэння для здароўя, з'явяцца на ўпакоўках усіх тытунёвых вырабаў, прызначаных для продажу ў Вялікабрытаніі.

Натуралістычныя выяўленні адбіраліся падчас адкрытага галасавання. Адзін з такіх фотаздымкаў дэманструе лёгкія курыльшчыка з ракавай пухлінай, іншыя — наступствы інфаркту і інсульту і г.д. У міністэрстве аховы здароўя Вялікабрытаніі заяўляюць, што аналагічныя меры, уведзеныя раней у Бразіліі і Канадзе, аказаліся значна больш дзейснымі, чым простыя тэставыя аб'явы, якія зараз выкарыстоўваюцца на тэрыторыі ЕС.

ХУТКАЯ ДАПАМОГА ПАДЧАС ПЕРААХАЛОДЖВАННЯ

Нават лёгкае пераахалоджванне — зніжэнне тэмпературы цела да 35 градусаў — пагражае сур'ёзнымі ўскладненнямі.

А таму імкніцеся, калі ласка, як мага хутчэй апынуцца ў цеплыні. Калі прамоклі пад дажджом — тэрмінова зніміце мокрае адзенне, цёпла апраніцеся і ўкрыйцеся коўдрай. Выпіце што-небудзь цёплае — без алкаголю і кафеіну: разведзены вадой сіроп парэчкі, журавінавы морс дапамогуць перамагчы прастуду.

ПАСЛЯ ПРАЦОЎНАГА ДНЯ — МАСАЖ

Людзі, у якіх працоўны дзень распісаны па хвілінах, увечары адчуваюць сябе, мякка кажучы, выціснутымі як лімон.

Яны скардзяцца хутчэй за ўсё на:

— болі ў вобласці шыі і галавы: гэта абумоўлена тым, што спіна, шыйны аддзел і каўняровая зона падвяргаюцца велізарнай нагрузцы з-за таго, што даводзіцца цэлы дзень сядзець за камп'ютарам або гадзінамі стаяць у пробках;

— цяжар і хваравітасць у нагах: з-за малой рухавасці парушаецца цыркуляцыя крыві. Асабліва пакутуюць стопы. З цягам часу гэта можа прывесці да праблем з суставамі.

Каб пазбегнуць гэтых непрыемных момантаў, рэкамендуецца масаж. Аптымальны варыянт — раз у 1-2 тыдні наведваць масажны кабінет і кожны дзень пасля работы рабіць масаж у хатніх умовах. Масаж каўняровай зоны і ступняў неабходна выконваць па 5—10 хвілін кожны. Пасля масажу пажадана расслабіцца, прыняць цёплы душ і адпачыць на працягу гадзіны.

КАНТАКТНЫЯ ЛІНЗЫ І МАКІЯЖ

Кантактныя лінзы не з'яўляюцца проціпаказаннем для макіяжу, проста трэба вытрымліваць некаторыя правілы бяспекі.

Паслядоўнасць дзеянняў — важнейшае з іх. Надзявайце лінзы да таго, як прыступіце да макіяжу, чыстымі рукамі. Завяршыце макіяж, папырскайце на твар спрэем для ўвільгатнення, не маргайце і не дакранайцеся да твару на працягу трох хвілін. Вечарам найперш зніміце лінзы і толькі пасля гэтага змывайце макіяж.

Алергія на пэўную касметыку павінна прымусіць вас падумаць пра замену маркі — паспрабуйце сродкі іншых фірмаў. Звярніце ўвагу на ўпакоўку і аддавайце перавагу касметыцы для адчувальнай скуры, з пометкай «гіпаалергенна».

Захоўванне касметыкі патрабуе акуратнасці. Знайдзіце для яе цёмнае і халаднаватае месца далей ад сонечных промняў. Ідэальна захоўваць касметычныя сродкі ў халадзільніку, толькі не на адной паліцы з прадуктамі харчавання.

ІНТУІТЫЎНАЕ ХАРЧАВАННЕ

Жанчыны, якія харчуюцца згодна з інтуіцыяй, маюць меншую вагу, чым тыя, што «сочаць за харчаваннем».

Паводле даных амерыканскіх вучоных, жанчыны з развітым шостым пачуццём менш думаюць аб тым, як яны выглядаюць, затое часцей прыслухоўваюцца да сваіх адчуванняў і харчуюцца згодна з пачуццём голаду, а не па раскладу. Заўважана, што інтуітыўнага харчавання прытрымліваюцца людзі з добрымі здольнасцямі да адаптацыі, а таксама аптымісты.

Доктар — прырода

РАСЛІНЫ ад СЯМІ хвароб

УП «Дыялек» распрацоўвае і вырабляе лекавыя прэпараты з натуральнай сыравіны для лячэння самых розных захворванняў.

— На сёння мы зарэгістравалі больш як 50 новых лекавых формаў, распрацаваных у нашым навукова-даследчым цэнтры, — расказвае дырэктар УП «Дыялек» Міхаіл Шкутнік. — Пра нас ведаюць не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, Украіне, Малдове. Усе прэпараты створаны на аснове лекавых раслін, якія растуць у рэспубліцы. У нашых лабараторыях і цэхах працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты — тэхнолагі, хімікі, біятэхнолагі, мікрабіёлагі, імунолагі. Сур'ёзная навуковая работа і фундаментальныя даследаванні ў галіне біятэхналогій дазваляюць выпускаць высакаякасныя прэпараты, якія не маюць аналагаў. А самае галоўнае — яны даступныя па цане.

Фітапрэпараты з айчыннай сыравіны выпускае толькі адно беларускае прадпрыемства

Зараз мы адпраўляем у аптэчную сетку краіны больш за 30 найменняў. Гэта і фітапрэпараты з экалагічна чыстай сыравіны — настойкі жэньшэню, календулы, сардэчніку, зверабою, араліі, валяр'янкі, сіроп салодкі, грудны эліксір і іншыя. Гонар прадпрыемства — арыгінальныя лячэбныя сродкі прыкладу, памяншае гушчыню крыві, прадухіляе ўтварэнне тромбаў. Пры курсавым лячэнні значна зніжаецца рызыка ішэмічнай хваробы сэрца і гіпертаніі ў людзей сталага ўзросту.

Выраблены з міцэлію японскага грыба Шыі-Такі ленцін і дыяленцін павышаюць імунітэт. Садзейнічаюць змяншэнню вагі і павышэнню жыццёвай актыўнасці, стымулююць вывядзенне з арганізма радыенуклідаў і соляў цяжкіх металаў.

Прадпрыемства заканчвае падрыхтоўку да выпуску серыі новых лекавых сродкаў. Гэта прэпарат для лячэння захворвання нырак беганефрыл, а таксама агастацын — першы айчынны гептапратэктар, у склад якога ўваходзяць флавалігнаны растаропшы і тыбецкай расліны многакалосніку. Рыхтуецца да выпуску проціанемічны прэпарат дыяферум.

Уладзімір КАРПУК.

Навукова-вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«ДЫЯЛЕК»
Выбірайце натуральнае!
ЛЕКАВЫЯ СРОДКІ З ПРЫРОДНАЙ СЫРАВІНЫ
220014 г. Мінск, завулак С. Кавалеўскай, 52а
тэл./факс: 222 92 18
Аддзел маркетынгу і збыту 222 97 73
Ліцэнзія № 020440/0217954ф-87 выдадзена да 09.10.2007

Сітуацыя

ХВОРЫ ЗАГІНУЎ У БАЛЬНІЦЫ, а ўрач у калонію не трапіў. Чаму?

Болі трыццацігадовага Яўгена Піліпенку (усе прозвішчы ў гэтым артыкуле зменены па маральных меркаваннях) у верхняй частцы жывата апошнім часам вельмі даймалі, і ён нарэшце вырашыў прайсці медыцынскае абследаванне. У цэнтральнай бальніцы Брагіна канстатавалі: грыжа. Без хірургічнага ўмяшальніцтва не абысціся. Таму, дачакаўшыся чарговага водпуску, Яўген Віктаравіч згадзіўся на аперацыю.

У бальніцу ён прыйшоў у суправаджэнні жонкі, і Алена Пятроўна з нецярпеннем і хваляваннем чакала, чым усё закончыцца. Са скальпелем упраўлялася ўрач-хірург з асістэнтамі, сярод якіх быў і адзіны на той момант у бальніцы анестэзіёлаг-рэаніматолаг Аляксандр Арлоў. Ён у 2004 годзе закончыў Гомельскі медыцынскі інстытут і атрымаў кваліфікацыю ўрача-лячэбніка, пасля чаго праходзіў гадавую інтэрнатуру ў абласной клінічнай бальніцы. Не прайшоў яшчэ ўказаны тэрмін, але яго, як маладога спецыяліста, згодна з загадам упраўлення аховы здароўя абласканкама накіравалі ў Брагін для аказання лячэбна-прафілактычнай дапамогі насельніцтву на пасаду анестэзіёлага-рэаніматолага.

Па сутнасці ён быў урачом-стажорам і разумеў, што той загад не адпавядае дзеючаму заканадаўству. Ён мог бы аспрэчыць яго, але не стаў гэтага рабіць і з'явіўся ў Брагіне за тыдзень да таго, як мела адбыцца аперацыя Яўгену Піліпенку. Яна доўжылася адну гадзіну 45 хвілін і прайшла паспяхова — была неабходнай, бо ўсе перадаперацыйныя мерапрыемствы выконваліся на высокім узроўні ды плюс яшчэ, безумоўна, уменне ўрача-хірурга і яе памочнікаў. Аляксандр Арлоў у той аперацыі павінен быў зрабіць хвораму агульнае абязбольванне, гэта значыць наркоз. І калі ўсё закончылася, Яўгена Піліпенку перавезлі ў палату, сказаўшы яго жонцы, што ўсё добра і не варта хвалявацца. Аднак з бальніцы яна не сыходзіла і літаральна праз тры гадзіны медыцынская сястра ўвагнала яе ў шок: ваш муж памёр. Што ж здарылася?

Расследаваннем гэтага нясшчасця, якое трапіла ў разрад крымінальных спраў, заняліся і спецыяльная медыцынская камісія з экспертамі вышэйшай кваліфікацыі, і следчыя органы, і суд. Да сказанага вышэй А. Арлоў патлумачыў наступнае.

За паўгадзіны да заканчэння аперацыі ён заўважыў, што ціск кісларoду ў сістэме газазабеспячэння бальніцы паступова пачаў зніжацца, аб чым ён сказаў урачу-хірургу і астатнім удзельнікам аперацыі, а праз пяць хвілін пасля заканчэння аперацыі з тае прычыны, што дзеянне прэпаратаў, якія выкарыстоўваліся ў якасці наркозу, моцна аслабла, у пацыента аднавіліся мышачны тонус і самастойнае дыханне. У выніку ён стаў прачынацца. А яшчэ праз дзесяць хвілін у хворага выявілася дыхальная недастатковасць. Яму не хапала паветра, кісларoду, і ён, Арлоў, расцаніў гэта як бранхіёласпазм. Таму хворы зноў быў пераведзены на штучнае апаратнае дыханне.

Увесь гэты час малады спецыяліст званіў па мабільніку ў Гомель — кіраўніку стажыроўкі і ўрачу-анестэзіёлагу першай катэгорыі абласной клінічнай бальніцы (як потым было пацверджана на раздрукоўках тэлефонных званкоў, у аульнай колькасці іх паступіла сем). Іх кансультацыі былі аднолькавымі, і Піліпенку падключылі да апарата МК-1 для штучнай вентыляцыі лёгкіх. Стан хворага пасля гэтага стаў умоўна стабільным, і Арлоў накіраваўся ў кабінет, каб зафіксаваць свае дзеянні ў адпаведных медыцынскіх дакументах. У калідоры яму сустрэлася жонка пацыента, і ён яшчэ раз пацвердзіў, што ўсё павінна закончыцца добра, хоць і назіраюцца ў яе мужа рэштквыя з'явы наркозу.

У 15.40 Аляксандру Адамавічу далажылі, што хвораму зноў стала дрэнна, і ён накіраваўся да яго. Там, на месцы, ён убачыў, што кісларод да Піліпенкі не паступае: знік ціск яго ў сістэме забеспячэння бальніцы. Палічыўшы, што хворы вентылюецца паветрам з атмасферы, урач працягваў штучную вентыляцыю лёгкіх апаратам МК-1. Пры гэтым, адзначаў ён на судзе, не ведаючы канструктыўных асаблівасцяў апарату, не зняў з трубчатага контуру гумавую грушу, якая закрывала контур. І пасля высветлілася, што з-за гэтага хворы дыхаў сваім жа паветрам, якое выдыхаў. Таму стан яго ўвесь час пагаршаўся, і ўсе праводзімыя мерапрыемствы (увядзенне адпаведных медпрэпаратаў, знешні масаж сэрца, электрычная дэфібрыляцыя) не дапамагалі. Хворы памёр а васемнаццатай гадзіне.

Стажор-урач даказваў на судзе, што ўсё і да аперацыі, і пасля яе рабіў правільна, і таму віны яго ў тым, што хворы памёр, няма. Падзвяла сістэма газазабеспячэння бальніцы. Гэта — па-першае. Па-другое, ён, Арлоў, не з'яўляецца медработнікам, а значыць, і «аб'ектам злачынства», бо па ўзбуджанай крымінальнай справе па артыкулу 162 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь адказнасць нясуць работнікі медыцынскай установы, якія займаюцца медыцынскай практыкай. Ён жа — толькі стажор Гомельскай абласной клінічнай бальніцы, які быў накіраваны ў Брагін.

Аднак, як гаворыцца, абвінавачваемы не да канца быў шчырым у сваім апраўданні. Персанал бальніцы, у тым ліку і ўрач-хірург, якая праводзіла аперацыю, сцвярджалі, што ні аб якім зніжэнні ціску пры падачы кісларoду хвораму Аляксандр Арлоў не казаў. Аб гэтым не было размовы і тады, калі ў бальніцы абмяркоўваліся прычыны смерці хворага. Версія аб адсутнасці кісларoду стала агучвацца пасля, у час следства.

Дарэчы, ліфцёр бальніцы, у абавязкі якога ўваходзіла забеспячэнне падачы медыцынскіх газаў у адпаведную цэнтралізаваную сістэму ўказанай установы, расказаў на судзе аб тым, што Аляксандр Арлоў праз восем месяцаў пасля здарэння, калі ўжо ішло следства па крымінальнай справе, запрасіў яго ў кабінет і ўгаварваў даць паказанні следчаму, што кісларoду тады ў сістэме не было. Ён, ліфцёр, да адказнасці за гэта прыцягнуты не будзе, бо гэта не ўваходзіла ў яго службовыя абавязкі. Той у моцным хваляванні расказаў аб усім начальніку аддзела кадраў тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання, і яна параіла яму гаварыць толькі праўду, каб самому не трапіць пад адпаведны крымінальны артыкул.

Што датычыць сцвярджэння Аляксандра Арлова аб тым, што ён, маўляў, не з'яўляецца медработнікам, дык і тут былі расстаўлены ўсе кропкі над «і». Ён мае дыплом урача пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы і быў прызначаны загадам на пасаду ўрача анестэзіёлага-рэаніматолага хірургічнага аддзялення і згодна з «Палажэннем аб парадку стажыроўкі выпускнікаў вышэйшых медыцынскіх устаноў адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» нясе адказнасць за вынікі сваёй работы разам са штатнымі ўрачамі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Гэта ж самае сказана і ў службовай інструкцыі ўрача-стажора. Так, у час правядзення хірургічнай аперацыі Яўгену Піліпенку не было ўрача анестэзіёлага-рэаніматолага, але гэта не з'яўляецца прычынай для вызвалення ўрача-стажора ад адказнасці.

У прыгаворы суда першай інстанцыі было запісана, што згодна з заключэннем экспертаў «даныя медыцынскіх дакументаў, вынікі патолагаанатамічнага, пярвічнага і паўторнага гісталагічных даследаванняў трупа даюць падставы лічыць, што смерць Піліпенкі наступіла ад вострай дыхальнай недастатковасці, абумоўленай неадэкватнай анестэзілагічнай дапамогай, гэта значыць, што смерць знаходзіцца ў прамой прычыннай сувязі з неналежнымі дзеяннямі ўрача». Ім «няправільна выбраны рэжым штучнай вентыляцыі лёгкіх, што выклікала развіццё вострай дыхальнай недастатковасці і смерці Піліпенкі. Акрамя таго, мяркуючы па запісах у медыцынскіх дакументах, урачом-стажорам Арловым парушаны пункт 1.2 загада Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 08.02.2005 г., які забараняе правядзенне агульнага абязбольвання са штучнай вентыляцыяй лёгкіх без газавага маніторынгу, гэта значыць кантролю ўдыхаемага і выдыхаемага паветра».

Адным словам, смерць пацыента, як устанавіў суд, наступіла па віне Аляксандра Арлова, які, аднак, не меў ніякіх злых намераў. Смерць — па неасцярожнасці. Таму, улічваючы ўсе абставіны справы, быў вынесены наступны прысуд: чатыры з паловай гады абмежавання волі без накіравання ў калонію. Цэнтральная раённая бальніца, як грамадзянскі адказчык, выплаціць сям'і пацярпелых кампенсацыю за маральную шкоду, а ўрач-стажор — расходы на аказанне юрыдычнай дапамогі.

Аляксандр Адамавіч падаў касацыйную скаргу ў абласны суд, які пацвердзіў аб'ектыўнасць суда раённага. Тое ж самае было і ў Вярхоўным Судзе рэспублікі. Да таго ж, улічваючы недахоп у краіне анестэзіёлагаў-рэаніматолагаў, яго не пазбавілі права займацца медыцынскай справай. Сям'я Піліпенкаў супраць гэтага нічога не мае, але мужа і бацьку ёй ніхто з таго свету не верне...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Наш культурны асяродак
Жыранделя
Выпуск № 10 (15).

«Звязда» мая...

Самая вялікая зарніца

Маё першае знаёмства з газетай адбылося ў пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя. Неяк я са сваім сябрам па школе, сынам І.П. Шамякіна, завітаў у Саюз пісьменнікаў, які тады знаходзіўся ў невялічкім асабнячку на вул. Энгельса. Адны з дзвярэй, бы насустрач нам, адчыніліся, і мы ўбачылі Петруся Броўку. Ён спытаў, што мы тут робім і, усміхаючыся, запрасіў у свой кабінет. У Петруся Усцінавіча быў, відаць, добры настрой, і ён прачытаў нам вершы...

А на стале ў паэта сярод розных папак і папер я ўбачыў газеты з назваю «Звязда»! Напэўна гэта былі свежыя нумары, бо ад іх востра пахла паліграфічнай фарбай.

Заўважыўшы, што я з цікавасцю пазіраю на стос, Пятро Усцінавіч даў мне некалькі экзэмпляраў з сабой — пачытаць.

Вось з таго часу я і чытаю. На вялікі жаль, сярод жывых няма сёння таго сябра па школе, няма і саміх Шамякіна, Броўкі, але кожны раз, калі праходжу па вул. Энгельса, я ўспамінаю гэтых добрых людзей і адчуваю той незабыўны пах паліграфічнай фарбы.

Сам я амаль 40 гадоў адпрацаваў на заводзе і ўсе гэтыя гады быў актыўным прапагандыстам беларускіх газет і часопісаў, актыўным аўтарам: некалькі маіх замалёвак надрукавала нават «Звязда», за што ёй вельмі ўдзячны.

А завяршыць свой ліст-віншаванне я хачу вершам, які сёння не менш актуальны, чым быў 70 з гакам гадоў таму:

Ходзяць зоры над краінай нізка...
Досветкам, калі чуць-чуць відно,
Самая вялікая зарніца
Падае ў маё акно.
Рассыпаецца ў мільёнах літар
Роўнымі шарэнгамі радкоў,
Разрываецца магутным дынамітам
Радасных і гнеўных слоў.
І чуваць выразна ў словах трубных,
Як магутнае жыццё пяе —
Я чытаю пройдзены і наступны
Шлях рэспублікі мае.
Малады, напорысты і ўпарты,
Я імкнуся па яе слядах.
На стале разгорнута, як карта,
Яркая вялізная «Звязда».

Пятро Глебка, 1934 г.

Са святам цябе, зарніца!

Ад усяго сэрца
Уладзімір Міхайлавіч ГОЛУБЕЎ, *г. Мінск.*

ТЧЭ, НЕ ЗАБЫЎШЫСЯ, РУКА...

Кіраўнік дзіцячай студыі народнай творчасці «Скарбніца» ў вёсцы Хатляны Уздзенскага раёна Святлана ШЧЭРБАН і яе дачка Дар'я — удзельнікі многіх фестываляў. Нядаўна яны дэманстравалі свае вырабы на рэгіянальным свяце вышыўкі і ткацтва паясоў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Спадчына

АЛЬБОМ АД БАБУЛІ НАДЗЕІ

Свой першы сольны альбом выпусціла таленавітая выканаўца народных песень — 80-гадовая Надзея Швед з вёскі Раманаўка Рагачоўскага раёна. Гэтаму паспрыяла Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі. Альбом мае простую, але дакладную назву — «Надзея Адамаўна Швед» і выпушчаны тыражом 30 адзінак. У яго ўвайшлі самабытныя народныя песні, якія больш за сто гадоў таму выконваліся жыхарамі Жыткавіцкага і Рагачоўскага раёнаў.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІНІЧА.

Метадычны цэнтр плануе растыражаваць гэты ўнікальны альбом, а ў перспектыве не выключана, што будзе выпушчаны яшчэ адзін дыск з меладычнымі песнямі Палескага краю ў выкананні Надзеі Швед і яе сястры Евы. Цікавасць да іх творчасці праявіла і Белтэлерадыёкампанія, якая яркае стварыць перадачу аб таленавітых спявачках. Дарэчы, падобныя праграмы мясцовай тэлестудыі і раённага радыё ўжо выходзілі ў эфір.

Надзея Адамаўна і яе сястра Ева — ураджэнкі Жыткавіцкага раёна. Народнаму песеннаму мастацтву вучыліся з малых гадоў, а першымі з іх настаўніцамі былі маці і бабуля. Затым таленавітыя выканаўцы разам з сем'ямі пераехалі на Рагачоўшчыну. Тут іх творчы багаж папоўнілі не толькі новыя песні гэтага рэгіёна, але і народныя танцы, казкі і прыказкі. У свае 80 гадоў жыхарка Раманаўкі Надзея Швед выкладае народнае мастацтва ў фальклорным гуртку і мясцовай школе, а таксама з'яўляецца пастаяннай удзельніцай раённых фестываляў.

БЕЛТА.

«ПАЭТ ЗЯМЛІ» ВАСІЛЬ КАВАЛЬ

Нядаўна споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння беларускага пісьменніка Васіля Каваля

Васіль Пятровіч Каваль (сапраўднае прозвішча — Кавалёў) нарадзіўся ў вёсцы Сава Горацкага павета Магілёўскай губерні ў сялянскай сям'і. У 1925 годзе вучыўся на агульнаадукацыйных курсах пры Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, потым паступіў у Магілёўскі педагагічны тэхнікум, але з-за хваробы маці вярнуўся ў родную вёску, працаваў па гаспадарцы. Друкавацца пачаў у 1925 г., тады ж быў прыняты ў члены «Маладняка». Вучыўся ў Белдзяржуніверсітэце на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта.



Першая кніга прозы Васіля Каваля «Як вясну гукалі» выйшла ў 1927 годзе, у яе ўвайшлі два апавяданні і стылізаваныя пад фальклор легенды. Потым былі зборнікі «На загонах» (1928), «Крыніца» (1929).

Сучаснікі называлі Васіля Каваля «лірыкам-апавядальнікам», «паэтам зямлі». «Жаўтацветам асыпала зямлю восень. Павольна спадалі з беластанных і віхрастых бяроз лісты. Скамечаныя, ахапкамі коцяцца яны к рэчцы, на бераг і ў даліны; а рэчка гоніць журботу — нясе іх уздоўж, на ўлонне пакатых ды стромкіх берагоў... Усё афарбавалася ў мяккі, жоўта-сумны колер: і маўчыць ваколле, заціхла нешта, збіраецца прырода заснуць...» (з апавядання «Сяльчане»).

Васіль Каваль прыйшоў у літаратуру са сваёй тэмай: вёска, спрадвечны лад жыцця селяніна і змены, што адбываліся пад уздзеяннем савецкай рэчаіснасці... Сялянскі побыт аўтар ведаў дасканала: сам з малых гадоў быў прывучаны да плуга і касы...

Новая ўлада дала селяніну зямлю, аднак пакуль мала што змянілася ў яго жыцці. Па-ранейшаму дабрабыт сялянскай сям'і залежыць ад многіх абставінаў і выпадковасцяў: калі, напрыклад, напачатку вясны гаспадар страціць каня, то гэта абернецца сапраўднай бядой («Сяльчане»). Не было выключэннем і такое:

«Гнілая салома валіцца са страхі, таму што гніе хата, вуглы абвальваюцца. Пры сонцы й вясне выглядае вясёлай, хоць вокны ў хаце плачуць, як у хворага старца вочы».

За гэтыя «гнілыя стрэхі» і «абваленыя вуглы» тагачасная крытыка абвінавачвала маладога пісьменніка ў скажэнні вясковай рэчаіснасці. Упікалі яго і за тое, што не паказвае ў сваіх творах актыўных, дзейсных людзей, што «большасць яго герояў пасіўныя, ціхія»...

Перад імклівымі зменамі ў вёсцы 1930-х гадоў Васіль Каваль проста разгубіўся, гэтым і тлумачаць многія даследчыкі яго творчы крызіс. Ян Скрыган пісаў: «Першыя кнігі Васіля Каваля — гэта паэмы пра зачараваны край, пра вёску і спрадвечны лад жыцця селяніна. Гора, бяда, нараджэнне і смерць, праца і ўслаўленне яе — паказу гэтага ладу жыцця падпарадкавана ўся паэтыка Кавалёвай творчасці. І раптам усё гэта гіне. Калгасы. Яны бязлітасна перайначваюць базу, а значыцца, перайначваюць і спрадвечны патрыярхальны лад жыцця. Свядомасць. Псіхіку. Пісьменніку трэба быць напярадзе часу, паказваць іменна вось гэту перайначаную псіхіку, а вобразы не гатовы да гэтага, яны фальшывяць... і самая блізкая і родная тэма — вёска, яе побыт, паэтычны і песенны лад — робіцца непапулярнай, асучасванне яе выглядае падробкай».

Сярод апошніх твораў Васіля Каваля — аповесці для дзяцей «Санька-сігналіст» (1934) і «Следапыты» (1936).

...2 лістапада 1936 года Васіля Каваля арыштавалі. Ён быў расстраляны 29 кастрычніка 1937 года па беспадстаўнаму абвінавачванню ў антысавецкай шпіёнска-дыверсійнай дзейнасці. У 1957 годзе — рэабілітаваны.

Лёс, наканаваны многім таленавітым творцам таго часу...

Таццяна ПАДАЛЯК.

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:

«МОЎНЫЯ АМБІЦЫІ І МОЎНЫЯ ПАЧУЦЦІ ЛЮДЗЕЙ — ДАЛІКАТНАЯ СФЕРА»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 1 верасня.)

Паводле статыстычных даследаванняў выяўляецца, што за апошнія дзесяць—пятнаццаць гадоў вельмі істотна павысілася нацыянальная свядомасць грамадзян Беларусі незалежна ад таго, якой мовай яны карыстаюцца. А гэта яшчэ адно сведчанне на карысць таго, што беларуская мова як фактар нацыянальнай свядомасці будзе падтрымлівацца грамадствам.

— Ваш інстытут — якраз тая структура, якая павінна дапамагаць людзям не толькі асэнсоўваць функцыянаванне мовы, але і ведаць яе.

— Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа — старэйшая ў сістэме Нацыянальнай акадэміі навук і фактычна адзіная ў краіне навукова-даследчая ўстанова, дзе сапраўды праводзяцца планамерныя даследаванні сістэмы беларускай мовы. Ён існуе з 1929 года і быў створаны на базе мовазнаўчых падраздзяленняў Інстытута беларускай культуры. Калі ўзяць толькі пасляваенны перыяд, то менавіта ў Інстытуце мовазнаўства былі створаны буйнейшыя фундаментальныя працы, якія забяспечылі беларускай мове статус высокаразвітой літаратурнай мовы з багатым слоўнікавым складам, якая можа паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага грамадства.

Мы займаемся даследаваннем сістэмы беларускай мовы і падрыхтоўкай фундаментальных прац па ёй — граматык, слоўнікаў, якія ўжо ў сваю чаргу становяцца тэарэтычнай і факталагічнай базай для ўсёй вучэбнай літаратуры па беларускай мове, забяспечваюць патрэбы сучаснай моўнай практыкі. Створаныя ў інстытуце працы да гэтага часу застаюцца найбольш грунтоўнымі даследаваннямі па беларускай мове і практычнымі даведнікамі. Сярод іх у першую чаргу трэба назваць «Руска-беларускі слоўнік» (М., 1953, 8-е выд. — Мн., 2002), «Беларуска-рускі слоўнік» (Мн., «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», у 5-ці тт., 6-ці кн. (Мн., 1977 — 1984), аднатомны «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (Мн., 1994, 3-е выд. — Мн., 2003), нарматыўны «Слоўнік беларускай мовы» (Мн., 1987), цэлую серыю тэрміналагічных слоўнікаў і інш. Менавіта гэтыя фундаментальныя працы, падрыхтаваныя ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, забяспечылі на некалькі дзесяцігоддзяў не толькі патрэбы беларускай пісьмовай моўнай практыкі, але і навучальны працэс у школе і ВНУ.

Тое, што многія з іх вытрымалі столькі перавыданняў, сведчыць аб іх запатрабаванасці.

Разам з тым, я хацеў бы асабліва адзначыць выключна важную ролю сістэмы школьнай адукацыі ў нашай краіне па падтрыманню і распаўсюджанню беларускай мовы. Часта першае знаёмства маладога пакалення з матчынай мовай пачынаецца сёння менавіта са школы. Працы ж Інстытута мовазнаўства ствараюць у першую чаргу базу для паспяховага працэсу авалодання беларускай мовы.

— Мы гаварылі пра літаратурную мову. Але людзі карыстаюцца больш размоўнай, а яна вельмі розная ў розных рэгіёнах. Напрыклад, мой муж прыязджае да маіх бацькоў на Палессе — і не разумее іх. Я разумею, але гаварыць так, як яны, ужо не магу. Вось гэтыя гаворкі, здаецца, самыя неабароненыя. Як іх захаваць?

— Народныя гаворкі вывучае такая мовазнаўчая дысцыпліна, як дыялекталогія. Трэба сказаць, што ў праведзенны перыяд беларуская дыялекталогія развівалася вельмі плённа. Пачынаючы з 50-х гадоў пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта НАН Беларусі Юзэфы Фларыянаўны Мацкевіч разгарнулася велізарная работа па збіранню і даследаванню гаворак беларускай мовы. Вынікам працы стала выданне шэрагу фундаментальных прац па беларускай дыялекталогіі («Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» і манаграфіі «Лінгвагеаграфія і групоўка беларускіх гаворак»), за якія беларускія вучоныя ў 1970 годзе атрымалі Дзяржаўную прэмію СССР. Гэта быў адзіны выпадак у Савецкім Саюзе, калі за падобную працу прысуджалі такую высокую ўзнагароду! У 90-я гады быў падрыхтаваны і выдадзены пяцітомны «Лексічны атлас беларускай мовы», за які калектыў распрацоўшчыкаў атрымаў Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь. Вывучэнне беларускіх народных гаворак працягваецца і сёння, выдаецца серыя рэгіянальных і тэматычных слоўнікаў, дзе адлюстравана лексіка мясцовых гаворак беларускай мовы. Такім чынам, нацыянальная беларуская мова функцыянуе сёння ў дзвюх сваіх асноўных разнавіднасцях: народныя гаворкі і літаратурная мова, якая з'яўляецца агульнай і ўзорнай для ўсіх беларусаў і найбольш шырока выкарыстоўваецца ў вуснай і пісьмовай форме.

Зразумела, што сёння сфера выкарыстання мясцовых гаворак істотна звужаецца. Зараз на іх размаўляюць толькі людзі старога ўзросту. Рэаліі сучаснага жыцця, сродкі масавай інфармацыі, павышэнне адукацыйнага ўзроўню насельніцтва пашыраюць распаўсюджанне літаратурнай мовы, вядуць да разбурэння традыцыйных мясцовых дыялектаў. Таму вельмі важна сабраць і захаваць багацце традыцыйнай народнай мовы. Беларускімі дыялектолагамі зроблена вельмі шмат у гэтым кірунку і атрымала прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і ў славянскім свеце. Дарэчы, нашы дыялектолагі прымаюць удзел у такім буйным славістычным праекце, як «Агульнаславянскі лінгвістычны атлас», што дае магчымасць прадставіць беларускі моўны матэрыял на шырокім славянскім фоне..

— У Шклове падчас Свята беларускага пісьменства на канферэнцыі вы больш увагі ўдзялялі якраз мясцовым традыцыям, маўленню, назвам?

— Так. Гэта канферэнцыя прызначана ў першую чаргу для людзей, якім цікава паслухаць пра свой родны край. Яе сэнс у тым, каб пазнаёміць мясцовую грамадскасць з дасягненнямі беларускіх навукоўцаў у гуманітарнай сферы, расказаць пра гісторыю краю, асаблівасці народных гаворак, мясцовыя традыцыі. Найбольшую цікавасць на канферэнцыях выклікалі даклады, якія пабудаваныя на мясцовым матэрыяле. Таму і сёлета шмат дакладаў было прысвечаны гісторыі Шклова, асаблівасцям гаворак раёна, яго літаратурным традыцыям. На канферэнцыі з дакладамі выступалі мовaведы, літаратуразнаўцы, гісторыкі, археолагі і нават біёлагі, што дазволіла асвятліць шырокае кола праблем, больш поўна расказаць пра гэты рэгіён. Таму што сама ідэя Свята беларускага пісьменства накіравана на тое, каб чалавек пачынаў пазнаваць Беларусь там, дзе ён нарадзіўся і жыве.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Запрашальнік

СКАРБЫ СТАРАЖЫТНАГА МАСТАЦТВА

Менавіта так называецца выстава, на якой прадстаўлены абразы, кнігі і мастацкае ліццё XII—XX стст. з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея і Веткаўскага музея народнай творчасці.

Медналітая пластыка экспануецца ў музеі ўпершыню і з'яўляецца вынікам шматгадовай працы навуковых супрацоўнікаў па зборы матэрыялу і выданні каталога «Образ литой, старинный...». Альбом-каталог выпушчаны ў выдавецтве «Белпрынт» у канцы 2006 года пры фінансавай дапамозе Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Галоўнай крыніцай паступлення сталі творы, канфіскаваныя на мытнях Беларусі, атрыманыя з падатковай інспекцыі Мінска і Віцебскага абласнога суда ў 1980—2005 гадах. На выставе прадстаўлены найбольш рэдкія і значныя творы жывапісу XVII—XIX стст. Большасць адносіцца да стараверскай культуры, якая ў Беларусі найбольш поўна прадстаўлена ў Веткаўскім музеі народнай творчасці. Практычна ўсе экспанаты ў ім — мясцовага паходжання.

— Нацыянальны мастацкі музей прапанаваў нам узяць удзел у выставе і ўжо сёння можна казаць аб тым, што супрацоўніцтва атрымалася вельмі ўдалым, — расказвае дырэктар Веткаўскага музея Галіна Нячаева. — Нягледзячы на назву выставы «Скарбы старажытнага мастацтва», усё ж асноўная яе тэма — традыцыі мастацкага ліцця XII—XX стагоддзяў. Унікальная выстава тым, што многія яе экспанаты сабраныя непасрэдна ў стараверскіх вёсках.

Са старажытных часоў медналітая пластыка атрымала шырокае распаўсюджанне на землях Беларусі. Аб гэтым сведчаць знаходкі тутэйшых жыхароў, прадметы археалагічных раскопак у Мінску, Віцебску, Тураве, Навагрудку і іншых старажытных гарадах. Сімвалічна, што адкрывае выставу рэдкі ўзор — створка крыжа «Божая Маці Купяцічская». На адным баку твора прадстаўлена Распяцце, на другім — Божая Маці з немаўляткам у рост. З'яўленне цудадзейнага абраза Божай Маці адносяць да 1182 года. Паводле падання, яго знайшлі ў вёсцы Купяцічы, што непадалёк ад Пінска. Другая створка крыжа канца XII—пачатку XIII стагоддзя, верагодна, была знойдзена падчас палявых работ. Такія выпадкі вядомыя беларускім краязнаўцам-этнографам і сведчаць аб тым, што гэтыя творы існавалі ў мясцовай культуры. У цэнтры прадстаўлена Божая Маці, па баках змешчаны тэкст-зварот да яе з просьбай аб дапамозе. У надпісе паказана асноўная функцыя крыжа-захавальніка ў жыцці чалавека — абараняць і дапамагаць у цяжкіх абставінах.

Адкрыецца выстава сёння ў Нацыянальным мастацкім музеі.

Марына ПЫРКОВА.

Тэлесеткі

7 цудаў Мінска

Напярэдадні Дня горада тэлеканал СТБ запрашае сваіх гледачоў узяць удзел у інтэрактыўным галасаванні «7 цудаў Мінска». Жадаючым зададуць пытанне: «Што вы лічыце сімваламі нашага горада?» Сярод варыянтаў такія:

1. *Вежы прывакзальнай плошчы («Вароты горада»)*
2. *Батанічны сад*
3. *Палац Рэспублікі*
4. *Палац спорту*
5. *Дом Урада*
6. *Дом-музей І з'езда РСДРП*
7. *Чыгуначны вакзал*
8. *Касцёл Святога Сымона і Святой Алены («Чырвоны касцёл»)*
9. *Мінская ратуша*
10. *Мінская тэлевежа*
11. *Нацыянальная бібліятэка Беларусі*
12. *Нацыянальны тэатр оперы і балета*
13. *Нацыянальны мастацкі музей*
14. *Плошча Перамогі («Круглая плошча»)*
15. *Свята-Духаў кафедральны сабор*
16. *Гандлёвы цэнтр «Сталіца» («Падземны горад»)*
17. *Траецкае прадмесце*
18. *Футбольны манеж*
19. *Ваш варыянт адказу*

Галасаванне працягнецца да 8 верасня. Можна пазваніць на тэлефон гарачай лініі СТБ у Мінску — 290-66-00 ці на мабільны нумар — 1-600-700 альбо прагаласаваць на сайце тэлеканала СТБ: WWW.CTV.BY. Вынікі галасавання будуць падведзены 8 верасня ў прамым эфіры тэлемарафону «Горад мой», вядучымі якога будуць Ірына Марцьянава і Алег Сцепанюк, Алена Хадаронак і Ігар Пазняк. Да іх у студыю завітаюць вядомыя мінчане, якія ўпрыгожвалі горад ці праслаўлялі яго. Таксама чакаюцца прамыя ўключэнні з месцаў святкавання 940-годдзя Мінска.

У раніцнім эфіры ў дзень свята будзе паказаны дакументальны фільм «Мінск — мая сталіца». Падрыхтаваны і спецыяльны выпуск праграмы «Мінск і мінчане», якая была адзначана на конкурсе «Тэлевяршыня». Рэтраспектыўная перадача «Народжаныя ў СССР» раскажа аб любімых месцах у Мінску. Суразмоўцамі братоў Пінігіных стануць лаўрэат Ленінскай прэміі архітэктар Леанід Левін, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Генадзь Давыдзька, выкладчык гімназіі-каледжа пры Акадэміі музыкі прафесар Уладзімір Перлін і рэжысёр Уладзімір Арлоў, які здымаў дакументальны фільм да... 900-годдзя Мінска. Гледачоў парадуе акцыя «Горад-кінагерой», у рамках якой на СТБ будзе паказана беларускае кіно.

Гледачы СТБ таксама маюць магчымасць выбраць «Міс Мінска-2007» на сайце канала.

У гэтыя дні вядучыя СТБ як і ўсе мінчане чакаюць свята сталіцы і прызнаюцца гораду ў любві. «Я рада, што выбрала горад, дзе жыву, бо ён даў мне ўсё, аб чым я марыла», — пераканана Ірына Марцьянава. «Кожны куточак Мінска ў мяне выклікае ўспаміны, — прызнаецца Алег Сцепанюк, — у гэтым горадзе я сустрэў сваё каханне, тут нарадзілася мая дачка. У паездках я заўжды мару хутчэй вярнуцца сюды, бо толькі ў Мінску я шчаслівы».

Ірына ПРЫМАК.

Добры дзень, родныя словы!

ЖМЕНЬКА ПРЫНАЗОЎНІКАВЫХ УЖЫВАННЯЎ

Прыназоўнік... Як ужо сведчыць сама назва, стаіць ён пры назоўніку. Вядома, ніякая назва ўсяго не ахопіць. Ведаем: ён стаіць яшчэ пры найлепшых назоўнікавых сябрах — пры займенніку, пры лічэбніку... А вось перад дзеясловам яго няма...

Усё як быццам вельмі проста: не скланяецца, не спрагаецца. А, між тым, з ужываннем таго ці іншага прыназоўніка падчас столькі клопату! Бо прыназоўнік — гэта маленькі дэспат, які вымагае ад наступнага слова, каб яно стаяла якраз у тым склоне, які яму звычны, навязвае наступнаму слову сваю волю, хоць без таго слова прыназоўнік сам нішто...

У папярэдніх нататках мы пісалі ўжо аб часам дакучлівым **ля** замест поўнага **каля**, аб размежаванні пры дзеясловах руху — ісці, хадзіць, ехаць і г.д. — прыназоўнікаў **па** і **у** ў спалучэннях са словамі **ягады, грыбы, дровы, трава, рыба і інш.**

Гэтым разам разгледзім яшчэ некалькі прыназоўнікавых ужыванняў, пра якія згадваюць чытачы ў сваіх лістах.

«За пяць кіламетраў ад...» ці «ў пяці кіламетрах ад...»?

Толькі «за пяць кіламетраў ад...». Бо «ў пяці кіламетрах ад...» — гэта калька рускага выразу-спалучэння, жывасілам прыцягнутае ў нашу мову. Не такая ўжо і рэдкая памылка. І нашы «звяздоўцы» — да чаго ўжо адукаваны народ! — а знячэўку і прапусцяць гэтага прыхадня.

А засцярога простая: пры абазначэнні велічыні адлегласці, пададзенай у якіх-небудзь адзінках — неабавязкова метрычных («за некалькі метраў, кіламетраў» і г.д.), але і неметрычных («за некалькі крокаў, за гоні, за вярсту» і г.д.), — у беларускай мове натуральна пачуваецца толькі прыназоўнік **за** (а не **у**!).

Як ставіцеся да такога выразу: «Што датычыцца мяне, то...»?

Цалкам адмоўна. Бо гэта штучны пераклад рускага «Что касается меня, то...». Тут у нашай мове просіцца: «**Што да мяне,** то (дык)...» («Як на мяне...»). І ў падобных выразах добра стасуюцца гэтыя займеннік з прыназоўнікам:

Што да пытання...

Што да таго, каб...

Бо выраз «**Што датычыцца** *каго—чаго*, **то**...» мае слоўнікавае вызначэнне: калі гаварыць аб кім-, чым-небудзь, то... А, значыцца, ён цалкам пакрываецца якраз значэннем выразу «**Што да** *каго—чаго*, **то (дык)**...». У пятым томе, кніга другая, «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (Мн., 1984, стар. 398) «Што да каго-чаго, то (дык)...» тлумачыцца так: «Калі гаварыць аб кім-, чым-н., мець на ўвазе каго-, што-н., то (дык)...».

Цікава, што ў нашых суседзяў-украінцаў ёсць нават адпаведнае слова «щодо» — аналаг двух нашых слоў.

Я ўвогуле не ўяўляю, каб з вуснаў маіх бацькоў мог пачуць гэтае малавыразнавымаўляльнае: **што датычыцца мяне...**

І тут памяць мне згадала, што якраз пра неўласцівае ўжыванне слова **датычыцца** некалі пісаў Кузьма Чорны.

Разглядаючы сказ Даклад датычыўся самавольных парубак, пісьменнік бачыў у ім калькy з рускай: *Доклад касался самовольных порубок* і тут жа даваў яму замену: *У дакладзе гаварылася пра самавольныя парубкі.* Ці ж не праўда — усё зразумела і ўсё па-беларуску?!

І тое, што ўсё гэта датычы... — цьфу! — абыходзіць, хвалюе нашых чытачоў — зарука таго, што наша мова жыве.

Спектакль *па* **п'есе ці** *паводле* **п'есы**?

Бясспрэчна: **паводле**. У канструкцыях, дзе ёсць спасылка на прадмет, у адпаведнасці з якім ці паводле ўзору якога выконваецца заданне, кліча гэты, не такі і часты прыназоўнік. А таму не трэба пра яго забывацца і пісаць: **паводле** плана, графіка, праекта і г..д.

Гэтак жа пры вызначэнні часу:

Пяць гадзін **паводле** мінскага часу.

Шэсць гадзін **паводле** маскоўскага часу.

Яго гадзіннік ідзе **паводле** Грынвіча,

У такі спосаб пазначаюцца кнігі Евангелля: Дабравесце **паводле** Лукі.

І ў школьных чытанках, калі прыводзіцца адаптаваны тэкст, — у спасылцы на аўтарства: **Паводле** таго ці іншага пісьменніка.

... На сёння досыць. Трошкі прыкладаў — лепш запамінаецца, лепш на іх зважаецца. Бо, як пісалася напачатку, клопату з прыназоўнікамі багата, таму што тут шмат уплывае рускае навакольле.

Рубрыку вядзе
Анатоль КЛЫШКА.

Пытальнік

Англійская мова — не для беларускіх спажыўцоў

Я набыў на рынку радыётэлефон, але толькі дома ўбачыў, што інструкцыя па эксплуатацыі, якая прыкладалася да яго, не мае перакладу з англійскай мовы. Разабрацца самастойна з мноствам функцый тэлефона і нават з яго падключэннем я не змог. Звярнуўся зноў да прадаўца з просьбай прадаставіць мне інструкцыю на рускай мове, але той адмовіўся. Адмовіўся ён таксама і забраць назад свой тавар. А навошта, скажыце, мне радыётэлефон, якім я без інструкцыі не магу карыстацца?

А.Г., *Чэрвеньскі раён.*

Згодна з Законам «Аб абароне правоў спажыўцоў», прадавец абавязаны прадаставіць спажыўцу ўсю неабходную інфармацыю аб тавары на рускай ці беларускай мовах: звесткі аб асноўных спажывецкіх якасцях тавару, тэрмінах службы, гарантыйных тэрмінах, звесткі аб сертыфікацыі тавара (калі тавар падлягае абавязковай сертыфікацыі), аб правілах і ўмовах эфектыўнага і бяспечнага карыстання, умовах сэрвіснага абслугоўвання, аб вытворцы і г.д. Інфармацыя, прадастаўленая спажыўцу на замежнай мове, лічыцца непрадастаўленай за выключэннем выпадкаў, калі яна была перададзена на замежнай мове па жаданню спажыўца (артыкул 5 п.3 закона). Таму вы маеце поўнае права на падставе таго, што вам не была прадастаўлена поўная інфармацыя аб тавары, патрабаваць ад прадаўца вярнуць вам назад уплачаныя за радыётэлефон грошы.

Як праверыць вагу пакупкі?

Я захацела ў магазіне набыць палову торта, але прадавец адмовілася выканаць маю просьбу. Сказала, што нарэзка тартоў не дапускаецца. Хацелася б ведаць, хто мае рацыю ў гэтай сітуацыі? І яшчэ адно пытанне. Зараз паўсюдна ў магазінах і пячэнне, і цукеркі, і сыры, і многія іншыя тавары фасуюць у поліэтыленавыя пакеты з указаннем іх масы. Я, напрыклад, больш даверяю электронным вагам, калі працэс узважвання адбываецца непасрэдна на маіх вачах. Ці можа пакупнік у магазіне праверыць вагу фасаванага тавару? І чаму я павінна плаціць за поліэтыленавы пакет?

Святлана МАЛАШКА, *г. Мінск.*

Згодна з Правіламі ажыццяўлення рознічнага гандлю асобнымі відамі тавараў і грамадскага харчавання, для праверкі пакупніком правільнасці цаны, меры і вагі набываемага тавару ў гандлёвай зале на даступным месцы павінна быць устаноўлена адпаведнае вымяральнае абсталяванне. Згодна з тымі ж правіламі, тавары павінны перадавацца пакупніку без спагнання дадатковай платы за ўпакоўку. Выключэнне складаюць харчовыя тавары, папярэдне расфасаваныя прадаўцамі ў поліэтыленавыя пакеты без герметычнай упакоўкі. Але па патрабаванню пакупніка прадавец абавязаны яму перадаць гэты тавар у бясплатнай упакоўцы.

А вось нарэзка тартоў на часткі і сапраўды дапускаецца толькі ў кафетэрыях пры наяўнасці адпаведных умоў для іх рэалізацыі.

Кватэрнае пытанне

ЛІЧЫЦЕ РОЗНІЦУ

Мы з жонкай і непаўналетнім сынам жывём у аднапакаёвай кааператыўнай кватэры (пабудавана больш як 20 гадоў таму), выплачанай, але не аформленай ва ўласнасць. Як будзе вызначацца памер ільготнага крэдыту на будаўніцтва новай кватэры?

З. АЛЬБЕРТОВІЧ, *г. Гродна.*

У адпаведнасці з падпунктам 1.7 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 года № 185 прымаемыя ў разлік нарміруемыя памеры агульнай плошчы жылога памяшкання для вызначэння велічыні льготнага крэдыту ўстанаўліваюцца з улікам агульнага метражу жылля, якое знаходзіцца ва ўласнасці грамадзяніна і членаў яго сям'і ў населеным пункце па месцы іх пражывання, а таксама жылля, што знаходзіцца ў іх уласнасці і адчужанага пасля 23 кастрычніка 2001 года на працягу трох гадоў да заключэння крэдытнага дагавора.

Згодна з пунктам 5 Інструкцыі аб парадку вызначэння велічыні льготнага крэдыту, зацверджанай пастановай Мінбудархітэктуры ад 27 жніўня 2003 года № 14, велічыня такога крэдыту вылічваецца зыходзячы з памеру падлягаючай ільготнаму крэдытаванню агульнай плошчы жылога памяшкання, якое будуецца (рэканструюецца) або набываецца, што вызначаецца як рознасць паміж нарміруемым памерам агульнай плошчы будучага жылля (у залежнасці ад колькасці членаў сям'і) і агульнай плошчай жылля, якое маецца.

Указаны парадак распаўсюджваецца і на грамадзян, што пражываюць у кааператыўных кватэрах (у тым ліку і не аформленых ва ўласнасць), па якіх поўнасцю выплачаны паявыя ўзносы да 1 мая 1994 года.

Віктар САВІЦКІ.

РАДЗІННАЕ

Захаваць традыцыі або... пайсці іншым шляхам?

(Працяг. Пачатак у нумары 31 жніўня і 4 верасня.)

4. Не лепшы дзень для рэгістрацыі шлюбаў

Насуперак традыцыям народнай культуры і праваслаўным канонам ЗАГСы вылучылі асноўным днём рэгістрацыі шлюбаў суботу. Нагадаем нашым чытачам, што ў кожнага дня тыдня «свой клопат». Нашы продкі некалі вызначылі суботу як дзень ушанавання памерлых. Для вяселля, таксама як і для хрышчэння дзіцяці, быў абраны самы спрыяльны для важных распачынанняў дзень — нядзеля.

Сёння, бадай, ужо няма патрэбы нагадваць пра тое, што падчас пастоў або напярэдадні вялікіх царкоўных святаў у храмах не будуць вянчаць маладыя пары. Тады, магчыма, ужо прыйшоў той час, калі неабходна хоць у нейкай ступені сінхранізаваць дзейнасць двух устаноў (духоўнай і дзяржаўнай), якія сёння працуюць паралельна, і паспрабаваць суаднесці іх духоўна-маральныя і сацыякультурныя прыярытэты. З гэтага тэзіса вынікае яшчэ адзін, больш шырокі і важкі. Ён патрабуе сто разоў усё прадумаць, узважыць, абмеркаваць усе «за» і «супраць».

5. Храм і ЗАГС — ступень адказнасці адна, наступствы розныя?

Сёння ўпершыню на старонках перыядычнага выдання мы хочам вынесці на абмеркаванне яшчэ адно надзвычай важнае пытанне. Але перад гэтым невялікі экскурс у гісторыю. Да 1917 г. царкоўнае вянчанне было адначасова актам публічнага прызнання новастворанай сям'і, якая паклялася перад Богам жыць у згодзе і кахаць адно аднаго да самай смерці. У царкоўнай кнізе рабіўся адпаведны запіс, які меў адпаведны юрыдычны статус. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі дзяржава адмежавалася ад «служкаў культу» і ўвяла ў якасці інстытута шлюбу працэдуру рэгістрацыі ў ЗАГСе, пасля якой дазвалялася прапіска, пастаноўка на чаргу на жыллё, размеркаванне пасля заканчэння ВНУ і г. д. Аднак усё вяртаецца на кругі свае. І сёння ў нас склалася парадаксальная сітуацыя: двухвер'я і двухшлюбства. У суботу маладыя рэгіструюць свой шлюб у ЗАГСе, вечар весяляцца, танцуюць, выпіваюць, а назаўтра раніцай збіраюцца ехаць да храма вянчацца.

Атрымліваецца, што ЗАГС у нашы дні ператварыўся ў фармальны інстытут, які прызначаны толькі паставіць штамп у пашпарце, а сапраўдным шлюбам маладыя лічаць вянчанне ў храме.

У сувязі з гэтым мы выносім на абмеркаванне наступную прапанову: нягледзячы на тое, што да гэтага часу ў нашай краіне Царква не надзелена статусам дзяржаўнага інстытута ўлады, хоць у дзяржаўных школах дзейнічаюць асветніцкія адукацыйныя праграмы, прызнаць раўнапраўнымі працэдуру рэгістрацыі ў ЗАГСе і цырымонію вянчання ў храме.

У такім выпадку не трэба будзе раз за разам паўтараць двухчасткавы фарсавы спектакль: рэгістрацыя—вянчанне. Усё будзе проста, празрыста і зразумела. Няверуючы чалавек прыйшоў у ЗАГС, паставіў адпаведны штамп у пашпарце, пасля чаго і лічыць сябе жанатым, сямейным. Веруючы чалавек адразу ж ідзе да храма, дамаўляецца аб часе шлюбавянчання, а праз некалькі дзён у будзённай абстаноўцы атрымлівае ў царкве або ў ЗАГСе шлюбнае пасведчанне.

Варта ці не варта прытрымлівацца народных традыцый у ЗАГСе

Яшчэ раз вернемся да працэдуры рэгістрацыі шлюбу і паспрабуем звярнуць увагу нашых чытачоў толькі на некаторыя важныя моманты гэтай цырымоніі з той адзінай мэтай, каб сучасныя маладыя людзі хоць бы ў самых агульных рысах уявілі сабе суцнасць таго, што адбываецца ў ЗАГСе, і паспрабавалі зразумець, што абрад рэгістрацыі таксама мае лёсавызначальнае значэнне.

Апошнія 12—15 гадоў на хвалі адраджэння народных традыцый ЗАГСы таксама прыўнеслі ў дзяржаўны акт рэгістрацыі шлюбу некаторыя рытуальныя дзеянні і атрыбуты народнага вяселля. Аднак, не валодаючы глыбокімі ведамі ў галіне славянскай старажытнасці, супрацоўнікі ЗАГСаў часта дапускаюць недаравальныя памылкі і дазваляюць занадта вольнае чытанне тых або іншых рытуальных дзеянняў і сімвалізацыі некаторых атрыбутаў народнай культуры.

Адным з такіх крокаў, накіраваных на збліжэнне з народнымі традыцыямі, стала выкарыстанне ручніка, на які маладым прапануюць стаць падчас рэгістрацыі шлюбу. Здавалася б, вельмі сімвалічнае пачынанне. Менавіта ручнік заўсёды быў рытуальным знакам жыццёвай дарогі, у тым ліку дарогі ў новае жыццё. Аднак вельмі дзіўным з'яўляецца момант, калі супрацоўнік ЗАГСа просіць маладых адразу ж пасля абвяшчэння іх мужам і жонкай пакінуць свае подпісы ў журнале рэгістрацыі, пры гэтым да кнігі рэгістрацыі па чарзе запрашаюць спачатку жаніха, а потым нявесту. З пункту гледжання аднаго з залатых правілаў народнай культуры — гэта недапушчальная вольнасць. Вы толькі ўдумайцеся ў сутнасць таго, што адбываецца: юрыдычны прадстаўнік улады толькі што ад імя дзяржавы абвясціў маладых мужам і жонкай (з гэтага моманту ўжо непадзельнай сямейнай парай), пажадаў доўгага сумеснага жыццёвага шляху і... тут жа ўступіў у супярэчнасць са сваім жа пажаданнем. Хіба дапушчальна, каб літаральна ў першую хвіліну адліку новага, сямейнага, часу маладыя сышлі з сімвалічнай дарогі жыцця — ручніка — паасобку? Супастаўце: у храме пасля заканчэння вянчання святар злучыць рукі маладых ручніком і парай, а не па чарзе, павядзе іх вакол аналоў.

Ёсць вельмі простае выйсце з гэтай сітуацыі: да стала могуць падысці дружкі маладых, узяць кнігу рэгістрацыі, паднесці яе да жаніха і нявесты і прапанаваць ім распісацца. У гэтым выпадку будзе выкананы этыкет свецкага абраду і не парушана святая запаведзь старажытнай традыцыі. Альбо нагул не варта ўключаць рытуальнае дзеянне з выкарыстаннем ручніка ў грамадзянскі рытуал ЗАГСа.

І яшчэ адзін парадокс, які датычыцца паводзінаў маладых у фінальнай частцы рытуалу рэгістрацыі шлюбу. У савецкі час склалася такая традыцыя: жаніх павінен вынесці нявесту з ЗАГСа на руках. Гэта не што іншае, як неадэкватнае чытанне старажытнай славянскай традыцыі. Нявесту пераносілі праз парог хаты жаніха (аб гэтым мы яшчэ будзем гаварыць) і праз мост, калі той будзе на шляху вясельнага картэжа.

Права выбару прозвішча

Вельмі важным пытаннем, якому пры рэгістрацыі шлюбу ў ЗАГСе надаецца значная ўвага, з'яўляецца выбар прозвішча, якое будуць насіць жаніх і нявеста ўжо ў статусе сямейнай пары. Сёння асабістае імя, імя па бацьку і прозвішча складаюць юрыдычна абавязковую формулу нашага наймення. Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь прадугледжана права маладых людзей, якія бяруць шлюб, выбіраць сабе прозвішча. Кожны з іх можа захаваць за сабой дашлюбнае прозвішча. Жонка мае права ўзяць сабе прозвішча мужа. Дапускаецца і той выпадак, калі і муж, і жонка прымаюць здвоенае прозвішча, якое складаецца з дашлюбных прозвішчаў кожнага з іх (напрыклад, Галянішчава-Кутузава, Лагуновіч-Чарэпка, Доўнар-Запольская).

Але на працягу жыцця чалавек можа апынуцца ў такіх сітуацыях, калі будзе вымушаны памяняць імя, прозвішча, напрыклад, падчас пострыгу ў манахі. Народныя лекары лічаць, калі змяніць сваё імя, можна пазбавіцца ад бед, няшчасцяў і хвароб, ад якіх чалавек пакутуе на працягу шматлікіх гадоў.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

(Працяг будзе.)

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

Класіфікацыйны конкурс

Ён праводзіцца на прызы нашага чытача з Мінска Івана АСТРОЎСКАГА і прысвячаецца 90-годдзю газеты «Звязда». У якасці яго апошніх заданняў развяжыце дамачныя канцоўкі Дзмітрыя Камчыцкага — новаспечанага нацыянальнага майстра спорту па шашачнай кампазіцыі з Магілёва:



№ 11. БЕЛЫЯ: a7, b4, c5, e3, f2, f4, f6, g3 (8). ЧОРНЫЯ: b2, b6, c7, d4, h2, h6, дамка g1 (7). Выйгрыш.



№ 12. БЕЛЫЯ: a7, b2, b6, c1, c3, c5, d2, e3, f2, g3 (10). ЧОРНЫЯ: a3, b8, e5, e7, f4, g5, g7, h2, дамка a1 (9). Тут жа ў белых дзве тэматычныя перамогі, але не на першым ходзе, як у заданні № 10 (даслаў мінчанін Васіль Грабенка), а на чацвёртым. «Тыя, хто справіцца з камбінацыяй з двайным заданнем — сапраўды першакласныя рашальнікі!» — суправаджае свой ліст у рэдакцыю Д. Камчыцкі.

Дарэчы, такія задумкі адносяцца да дадатковых жанраў кампазіцыі.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

Рашаем, выйграём

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый.

БЛІЦ-29 (Л. Вітошкін): № 1. 1. de7 2. c:e7 3. ef8 4. f:e1 ef2 5. e:g3 6. de3 7. bc3 8. c:a3x; № 2. A(a3) b2, e3, c5, hg3, g1#; № 3. 2 (43A) 48, 37, 33 (37) 47x. A(12) 1 (17A1) 12, 47x. A1(43) 48, 37, 24 (37) 47x.

ПІКАНТНЫ ФІНАЛ (А. Валюк—С. Садоўскі): 7... h:d2 8. de5 dc1 9. ef6 cg5! 10. f:h4 hg1 11. hg5 gd4#.

НАШ ГОСЦЬ (І. Вальтэр): № 2. 1. fe5 2. fe3 3. e:g3 4. a:c3 5. ab2 6. gf4 7. h:d8x.

БЛІЦ-30 (Д. Камчыцкі): № 1. 1. dc3 d:b2 2. cd8 3. h:g5 4. d:e1x; № 2. 1. cb8 2. cd6 3. b:e5! 4. a:e7 5. h:d2x; № 3. 1. cb6 2. ed8 3. ed6 4. fg7 5. d:a1x; № 4. 1. hg7 2. h:f4 3. cb8 4. b:e1 5. ab4 6. e:h4 ab4 7. he1 ba3 8. ec3x; № 5. 1. bc3 2. c:g3 3. d:d2 4. gf2 5. fg3 6. dc3 7. c:c5x.

НАШЫ ГОСЦІ (У. Рычка): № 2. A(40) 44, 43, 50#.

Рашылі: П. Кажаноўскі (в. Кашэвічы Пінскага раёна), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), П. Жэлтка (в. Курынец Вілейскага раёна), Аляксандра Камінская (Вілейка), І. Астроўскі (Мінск), Р. Сідарчук (Брэст), А. Пераводнікаў і У. Сапяжынскі (Рагачоў), П. Шклудаў (Наваполацк), К. Козел (в. Ласосна Гродзенскага раёна), І. Працук (Паставы), А. Кіслы (Узда), У. Аўласенка (Гродна), С. Нячаеў (Баранавічы), А. Свірко (Шаркаўшчына), В. Голас (Любань), А. Янчук (Камянец), Юлія і Аляксандр Мікулічы і У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна) і інш.

Бліцконкурс-29 выйграў Іван АСТРОЎСКІ. Ён атрымае сюрпрыз ад аўтара заданняў Леаніда Вітошкіна (Гомель) — «Шашечный вестник» № 4 (Дрогичин, 2004). Лаўрэатам жа блицконкурсу-30 стаў Пётр КАЖАНОЎСКІ, які ў задачы У. Рычкі (пазаконкурснае заданне) знайшоў поўнае пабочнае рашэнне: 34-30, 50#. Яму дасылаецца кніга М. Станоўскага «Этюднымі тропами» (Наваполацк, 2004) — з прызавога фонду яшчэ аднаго нашага бескарыслівага аўтара Дзмітрыя Камчыцкага (Магілёў).

Тры турніры

У іх перамаглі: Андрэй Маісееў з Мінска, Яўген Кандрачэнка з Гомеля і Васіль Навумік з Ваўкавыска («Етвызь-2007» у Драгічыне); Вячаслаў Палянскі з Мінска, Аляксандр Барташ з Маладзечна і Іван Троцкі з Пастаў («Мар'іна Горка-2007»); А. Плакхін і Юрый Файнберг з Мінска і А. Барташ (бліцтурнір у Барысаве).

Пазнаёмцеся з гульнёй удзельнікаў фестывалю «Мар'іна Горка-2007»:

БЕЛЫЯ (В. Басінюк): a3, c1, c3, c5, d4, e1, e3, f2, g1, g3, h2 (11). ЧОРНЫЯ (І. Пракаповіч): a5, a7, b6, b8, d8, e7, f8, g5, g7, h4, h6 (11). Згуляйце за белых.

Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Аматарам сталеак

БЕЛЫЯ: 6, дамкі 11, 50 (3). ЧОРНЫЯ: 34, дамка 45 (2). Варыяцыя лаўрэата нашага бліцконкурсу-30 Пятра Кажаноўскага эцюднай тэмы «слупняк на двайніке». Ход белых. Імёны правільна рашыўшых будуць апублікаваныя.

З ДЫРЭКТАРСКАЙ КІШЭНІ

Злодзей знёс барсетку з грашыма прама з кабінета дырэктара! Здарылася гэта на прадпрыемстве «Тэхнашанц». У барсетцы было 595 еўра і 500 долараў. Цяпер пошукамі злодзея займаюцца супрацоўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў Фрунзенскага раёна. Мяркуецца, што крадзеж учыніў хтосьці з работнікаў прадпрыемства.

Кацярына ГУСЕВА, *«Мінск—Навіны».*

У суд Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **ШЫЦІКАВА Уладзіміра Мікалаевіча**, 20 красавіка 1927 года нараджэння, ураджэнца вёскі Малая Валоськаўня Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці, які пражываў па адрасу: г. Касцюковічы, вул. Бальнічная (цяпер — 60 гадоў Кастрычніка), дом 58, апошняе вядомае месца жыхарства і знаходжання 2 красавіка 1976 г. — г. Касцюковічы Магілёўскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна У.М. Шыцікава, паведаміць іх суду Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (надалей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у тэрмін з 5 верасня па 10 кастрычніка 2007 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» ў адпаведнасці з дадзенымі Правіламі.

2. Арганізатар Гульні — Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» (надалей — Арганізатар), зарэгістраваная рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 02.08.2001 г. № 1010 у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 100155376, УНП 100155376, месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд Гульні фарміруецца за кошт чыстага прыбытку Арганізатара Гульні.

4. У склад Прызавога фонду Гульні ўваходзяць:

7 маек Regent;

7 бейсболак «Стандарт»;

7 наручных кварцавых гадзіннікаў з лагатыпам «Звязда»;

тэлевізар «Віцязь» 51CTV720-7, г. Віцебск;

халадзільнік MX2823, РБ, ЗАО «АТЛАНТ».

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 1 251 383 (Адзін мільён дзвесце пяцьдзесят адна тысяча трыста восемдзесят тры) беларускія рублі.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ. ПАРАДАК АДБОРУ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або шэсць месяцаў другога паўгоддзя 2007 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас рэдакцыі ў перыяд падпіснога кампаніі на IV квартал і II паўгоддзе 2007 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца да двух разоў у тыдзень у перыяд з 5 па 28 верасня 2007 года ўключна ў тым жа сродку масавай інфармацыі, у якім былі апублікаваны гэтыя Правілы.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або дасланыя пасля 29 верасня 2007 года па паштоваму штэмпелю атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕННЮ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенню рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (надалей — Камісія) з тэрмінам паўнамоцтваў з 5 верасня па 10 кастрычніка 2007 года ў складзе пяці чалавек.

10. На пасяджэнне Камісіі ў якасці наглядальнікаў без права галасавання могуць запрашацца падпісчыкі газеты або прадстаўнікі незалежных арганізацый.

11. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці з яе зарэгістраванага складу.

12. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца рашаючым.

13. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

14. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 4 кастрычніка 2007 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

15. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і гораду Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

16. Спачатку разыгрываюцца асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска па 1 майцы Regent, па 1 бейсболцы і па 1 наручнаму гадзінніку з лагатыпам газеты «Звязда».

17. Выйграўшым прыз лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча ўказана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышу кожнага асобнага прыза выцягне наўздагад са скрыні хто-небудзь з падпісчыкаў або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка ўказваецца выйграны прыз і распісваюцца члены камісіі.

18. Для розыгрышу тэлевізара «Віцязь» і халадзільніка «Атлант» усе астатнія карткі ўдзельнікаў, па якіх не былі выйграны прызы, змяшчаюцца ў адну скрыню і старанна перамешваюцца.

Вызначэнне выйграўшых удзельнікаў адбываецца ў парадку, які ўстаноўлены пунктам 17 гэтых Правілаў.

19. Удзельнікам, якія выйгралі прыз, Арганізатар на працягу 10 дзён з дня правядзення розыгрышу дасылае паведамленне аб гэтым заказным пісьмом з указаннем тэрміну атрымання прыза.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

20. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне ўдзельнікам, які выйграў прыз, пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2007 года.

Пры звяртанні за атрыманнем прыза прадстаўніка ўдзельніка Гульні ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2007 года.

21. Выдача прызоў (акрамя тэлевізара і халадзільніка) ажыццяўляецца ў тэрмін да 20 снежня 2007 года ў памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён.

22. Дастаўка і ўручэнне тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляецца Арганізатарам Гульні ў тэрмін да 20 снежня 2007 года ўключна з паведамленнем аб канкрэтнай даце дастаўкі праз публікацыі ў сродках масавай інфармацыі.

Іншыя прызы могуць быць дастаўлены грамадзянам, якія іх выйгралі, па ўзгадненню з Арганізатарам і пры ўмове іх пражывання ў мясцовасці, блізка размешчанай ад мясцовасці пражывання грамадзян, якія выйгралі тэлевізар або халадзільнік.

23. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

24. Пасля 20 снежня 2007 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

25. Удзельнік Гульні, які выйграў прыз, нясе адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

26. Удзельнікі Гульні, якія выйгралі прызы, і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, пісьмы і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і (або) інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

27. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», склад камісіі па яе правядзенню, памер і склад прызавога фонду да пачатку рэкламнай гульні падлягаюць апублікаванню сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў сродках масавай інфармацыі.

28. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 17 кастрычніка 2007 года ўключна ў тым жа сродку масавай інфармацыі, у якім былі апублікаваны гэтыя Правілы.

29. Даведкі, якія датычаць гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287-19-68.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 805 ад 04.09.2007 г. выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННЮ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

1. ЗДАНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч,
намеснік галоўнага рэдактара газеты «Звязда»

2. ДОЎНАР Валянціна Аркадзьеўна,
загадчык аддзела пісьмаў газеты «Звязда»

3. ЛЯЎКОВІЧ Таццяна Уладзіміраўна,
вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»

4. ДАБРАВОЛЬСКІ Анатоль Васільевіч,
вядучы рэдактар тэхнічны газеты «Звязда»

5. ДЗЕВОЙНА Алена Уладзіміраўна,
рэдактар юрыдычнага аддзела газеты «Звязда»

Тэрмін паўнамоцтваў Камісіі з 5 верасня па 10 кастрычніка 2007 года.

ЗВЕСТКІ АБ СКЛАДЗЕ І ПАМЕРЫ ПРЫЗАВОГА ФОНДУ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ "ПАДПІШЫСЯ НА "ЗВЯЗДУ"

Прызавы фонд рэкламнай гульні "Падпішыся на "Звязду" сфарміраваны за кошт чыстага прыбытку яе арганізатара – Установы "Рэдакцыя газеты "Звязда" і складаецца з наступных прадметаў:

№ п/п	Назва	Колькасць	Цана за адзінку	Кошт (руб.)	Сума ПДВ (руб.)	Стаўка ПДВ (%)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	**Майкі Regent**	7 шт.	10 892	76 244	18	13 724	89 968
2.	**Бейсболкі "Стандарт"**	7 шт.	6 586	46 102	18	8 298	54 400
3.	**Гадзіннікі наручныя кварцавыя з лагатыпам "Звязда"**	7 шт.	13 285	92 995	18	16 739	109 734
4.	**Тэлевізар "Віцязь" 51CTV720-7, г. Віцебск**	1 шт.	274 000	274 000			274 000
5.	**Халадзільнік MX2823 РБ, ЗАО "АТЛАНТ"**	1 шт.	612 950	612 950	18	110 331	723 281

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні "Падпішыся на "Звязду" складае 1 251 383 (Адзін мільён дзвесце пяцьдзесят адна тысяча трыста восемдзесят тры) беларускія рублі.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасе: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 29 верасня 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **5 кастрычніка 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 17 кастрычніка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 снежня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2007 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 5 верасня 2007 года. Удачы ў гульні!

1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2007 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на IV квартал 2007 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды

(прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды

(

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

СКАНВОРД (18 ЖНІЎНЯ). <u>Па гарызанталі:</u> Кратар. Абсурд. Кмен. Груз. Дуб. Рапа. Ібіс. Тарле. Калыханка. Ака. Пас. Клаксан. Астра. Арыя. Каа. Айны. Орда. Фен. Нант. База. Аноа. Кол. Макараў. **<u>Па вертыкалі:</u>** Кокс. Фантом. Рампа. Палтаран. Тында. Хасан. Бекар. Рэгбі. Акарына. Бананы. Заліў. Агуці. Яхта. Стапа. «Аскона». Рэстаран. Радно. Дарафеева. Ата.

Судоку (18 жніўня). Гл. табліцу.

6	8	1	2	7	3	5	4	9
7	3	4	8	5	9	6	2	1
2	9	5	4	1	6	7	8	3
3	1	2	7	9	4	8	6	5
9	5	7	1	6	8	4	3	2
4	6	8	5	3	2	1	9	7
8	7	6	3	2	1	9	5	4
1	4	3	9	8	5	2	7	6
5	2	9	6	4	7	3	1	8

СКАНВОРД 25 ЖНІЎНЯ. <u>Па гарызанталі:</u> «Лакаматыў». Радон. Фара. Крок. Паша. Май. Бура. Рагу. Лук. Пясок. Крамола. Нар. Авар. Ананд. Парана. Арына. Апарос. Арэс. Гало. Рыла. Асака. Аргамак. Жако. Удар. Сэр. Ніягара. Дан. Крыга. Трытон. **<u>Па вертыкалі:</u>** Букет. Парыж. Арфа. Марэ. Рысак. Лондан. Сотнік. Акула. Нага. Ліра. Карма. Акуляры. Арка. Лад. Дар. Асада. Ода. «Арэра». Мінск. Рант. Купэ. Анкара. Масква. Рым. Ангола. Харэй. Корд. Сак.

СКАНВОРД (1 ВЕРАСНЯ). <u>Па гарызанталі:</u> Транспарт. Напор. Ікра. Этна. Нос. Кус. "Суліко". Фтор. Уса. Мележ. Шамякін. Акт. Рагу. Канат. Абадан. Карат. Прабел. Тура. Аксу. Дата. Масла. Каракас. Ажан. Ікар. Тып. Біклага. Кар. Саржа. Купала. **<u>Па вертыкалі:</u>** Сушня. Акула. Племя. Бар. Арама. Кукарда. Анабас. Носік. "Атас". Танк. Антон. Клінкер. Арэс. Сак. Пат. Атака. Ніт. Крыга. Сэрца. Парк. Ярмо. Ракада. Калчан. Бак. Газета. Колас. Жгут. Ластаўка.

«КВІТНЕЙ, БЕЛАРУСЬ», І СЯДАЙ ЗА ПАРТУ

Буйнымі культурнымі акцыямі адзначаны мінулыя выхадныя ў двух райцэнтрах Брэстчыны — Пружанах і Бярозе. Пружанцы ўпершыню апрабавалі новую Лядовую арэну ў якасці канцэртнай залы. Тэатралізаванае прадстаўленне «Квітней, Беларусь» прайшло пры поўным аншлагу. Дзея з пяці карцін уключыла ў сябе кампазіцыі «На жытнёвым полі», «У вянок Беларусі», «Гудзе вяселле і звініць», «Радзіма мая дарагая». У прадстаўленне хораша ўпісаліся выступленні танцавальных калектываў «Радасць», «Прыбужжа», «Журавінка», ансамбляў народнай музыкі і песні. Пружанцы з задавальненнем прымалі чаканых сталічных гасцей: ансамблі «Песняры» і «Верасы», Вікторыю Алешка, Гюнеш Абасаву, Георгія Калдуна. Гледачоў і артыстаў прывітаў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар.

А Бярозу 1 верасня з Днём ведаў віншавала беларуская эстрадная зорка Ірына Дарафеева. На гарадскім стадыёне сабралася каля 2 тыс. гледачоў. Канцэрт Ірыны Дарафеевай і групы "Тяни-толкай" працягласцю ў дзве з паловай гадзіны прайшоў нібы на адным дыханні. Паводле слоў выконваючай абавязкі дырэктара Бярозаўскага гарадскога Дома культуры Алены Зарубінай, і артыстка, і публіка атрымалі вялікае задавальненне ад сустрэчы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Алё! Дырэктар слухае

Экстранная сувязь з дырэктарам з'явілася ў трох школах Заводскага раёна.

У кожным кабінеце ёсць трубка, якая нагадвае дамафон у кватэры. Па ёй настаўнік у выпадку неабходнасці можа ў любы час звязацца з дырэктарам. Зручная экстранная сувязь і тым, што цяпер па ўсіх класах можна даць аб'яву, прычым як для настаўнікаў, так і для школьнікаў, аб'явіць музычную паўзу, правесці селектарную нараду. Такой сувяззю ў Заводскім раёне абсталяваны школы № 112, 141 і 142.

Вольга ШАЎЧУК, *«Мінск-Навіны».*

«ЭКАЛАГІЧНАЯ ЗОНА» Аляксандра Лосева

Жыхар Оршы Аляксандр Лосеў нядаўна зрабіў роднаму старажытнаму гораду цудоўны падарунак: даў другое жыццё крыніцы на беразе Дняпра і ўпрыгожыў яе. Ініцыятыўны, пры гэтым вельмі сціплы аршанец займаецца навадзненнем прыгажосці на зямлі каля 20 гадоў.

Энтузіяст стварыў уласнымі рукамі непаўторны крынічны куточак, які потым асвяціў праваслаўны святар — айцец Аляксандр з вёскі Крапіўна Аршанскага раёна. Лосеў паставіў недалёка ад крыніцы вароты для гульні ў футбол. Перад гэтым расчысціў тэрыторыю ад смецця. Кожны дзень ён прыходзіць у «сваю экалагічную зону», каб асабіста навесці чысціню. Адпачываючым жадае добрага настрою. А каб не пакідалі пасля сябе смецця, прапаноўвае пакеты: «Толькі захоўвайце чысціню!»

Бліжэй да свайго дому, да якога нядоўга ісці пешшу, раней зрабіў яшчэ адзін, як ён жартуе, «райскі куток». Тут ёсць імправізаваны калодзеж, хатка Бабы-Ягі. Упрыгожваюць па перыметру гэтую міні-краіну казак больш 2 тыс. кветак: аксамітак, цыній... Лосеў яшчэ, аказваецца, і кветкавод: добра разбіраецца ў насенні, расадзе. Колькі радасці для хлопчыкаў і дзяўчынак, якія прыходзяць сюды з педагогамі ці бацькамі! Тут вельмі падабаецца гуляць выхаванцам дзіцячага садка, што працуе метрах у 300, на вуліцы Леніна.

— Вось сам скасіў траву, каб добраўпарадкаваць гэты прыгожы куток ля ракі, — расказвае Аляксандр Анатольевіч. Папрасіў прабачэння, каб я пачакаў трохі перад тым, як яго сфатаграфаваць: трэба найперш пачысціць святое крынічнае месца.

— Хочацца мне, каб гараджанам прыемна было сюды прыходзіць, — працягвае майстар-самавучка. — Мне расказалі, што ў савецкія гады крыніца «пачала хварэць». Нельга было дапусціць, каб яна знікла. Бадай з усіх краін СНД сюды прыязджалі. І шчырыя словы ўдзячнасці мне гаварылі, прасілі разам сфатаграфавацца на памяць. Мяне часам пытаюць: навошта ўсё табе гэта трэба? Адказваю проста: для душы і людзей. І гэта праўда. Я жыву побач з крыніцай. Як жа можна было без болю назіраць, што ёй дрэнна? Шкада, што раней яна была як балота. Гразка, смецця шмат. І так мне захацелася навесці тут парадак. Разам з аднадумцамі: сем'ямі Казлоўскіх, Свірыдзенка, бацькам і сынам Міхаілам і Раманам Масаловічамі шмат чаго зрабілі. Па калена на стоячы ў ледзяной вадзе, чысцілі крыніцу. Прывезлі камяні. Дзеткі з навакольных дамоў дапамагалі дарослым у іх карыснай і незвычайнай працы.

Жыве Лосеў у некалькіх дзесятках метраў ад ужо па-саўраўднаму чыстай і прыведзенай у парадак крыніцы. Бачылі б вы прыгажосць, што стварыў ён вакол свайго дома, а на падворку... Цуд! Усё вакол радуе вока. Тут, напэўна, сеансы псіхатэрапіі можна праводзіць! Нават вароты гаража ўяўляюць сабой вялікую карціну. Вось у басейне з фантанам плаваюць качкі. Яны ж, намаляваныя на дошках, «лётаюць» перад фасадам дома. Аўтар малюнкаў — сябра Лосева Яўген Жураўлевіч. Ён жа маляваў і персанажаў казак. А выразаў з дрэва формы да іх Аляксандр Лосеў. Як кажуць, ён — майстар на ўсе рукі.

Па выніках конкурсу, аб'яўленага Першым нацыянальным тэлеканалам і часопісам «Гаспадыня», Лосеў увайшоў у спіс лідараў па ўпрыгожванню ўласных падворкаў. Сям'я атрымала кухонны камбайн. Спадзяёмся, што і галоўныя прызы Лосевых не абмінуць.

Майстар стварэння прыгажосці не толькі паклапаціўся аб добраўпарадкаванні свайго прысядзібнага ўчастка. І суседзям агароджу ўпрыгожыў: цяпер і тут кветкі радуюць вочы. Нават бетонны слуп ліхтара паміж дамамі абвіваюць кветкавыя ўюны.

Пра сябе расказвае гэты чалавек неахвотна. Нарадзіўся ў 1962 годзе ў Оршы. Маці выхоўвала яго адна. Больш 45 гадоў яна аддала рабоце на ільнокамбінаце. Была рабочай, працавала ўсё жыццё «на ўсе 100». Яшчэ ў дзяцінстве, калі яны жылі ў шматпавярховым доме, падчас гульняў на вуліцы ўпрыгожваў двор: даглядаў кветкі, ствараў розныя кампазіцыі.

Сам выхоўвае двух сыноў. Старэйшы, Сяргей, вучыцца на 4 курсе медыцынскага. Малодшы Дзмітрый — у 7 класе. Жонка Галіна Іванаўна нядаўна на дзень свайго нараджэння атрымала ад мужа ў падарунак шыкоўны букет кветак, што вырасціў ён сваімі намаганнямі. Безумоўна, ёй могуць пазайздросціць многія жанчыны.

Шкада, што пакуль не знаходзіць добрая і рэдкая ініцыятыва па добраўпарадкаванню берага Дняпра сур'ёзнай афіцыйнай падтрымкі. У прыватнасці, калі я пацікавіўся, што за арганізацыя размяшчаецца за бетоннай агароджай блізка ад крыніцы, даведаўся, што «Зелянгас». І, што дзіўна, яго супрацоўнікі не звяртаюць увагі на суседні ўнікальны куток. Лосеў разумее, што ў спецыялістаў свае задачы. Канешне, трэба добраўпарадкоўваць і цэнтр горада, у іх ёсць адпаведны пастаўлены «фронт работ» і г.д. А мо тут, дзе заўсёды бывае шмат людзей, таксама можна пастаянна клапаціцца аб навадзенні чысціні?

Колькі разоў чуў Аляксандр Лосеў прапановы гасцей ля крыніцы, у «райскім кутку» абмеркаваць на розных узроўнях магчымасць зрабіць тут яшчэ больш дзеля стварэння прыгажосці. Каб Орша мела на беразе Дняпра непаўторную зону адпачынку. Напрыклад, недалёка ад крынічкі маглі б размясціць дзіцячы гарадок. А як было б добра прайсціся да Дняпра па акуратных лесвіцах, ды сесці ў маленькі карабель, а потым падарожнічаць па вадзе. А чаму б не стварыць нейкі фальклорны цэнтр? Каб вучылі майстры народных рамёстваў турыстаў і мясцовых жыхароў свайму эксклюзіўнаму, пры гэтым традыцыйнаму мастацтву! Ідэй цікавых многа.

Інфармацыя аб гаючых уласцівасцях вады з крынічкі ў Оршы ходзіць сярод людзей далёка ад горада. Тыя, хто тут пабываў, раяць зрабіць тое ж самае сябрам. П'юць ваду для прафілактыкі захворванняў, ды і для лячэння. Вада са старажытнай зямлі сама па сабе з'яўляецца крыніцай чысціні душы, веры, знакам аднаўлення зямлі беларускай... І заслуга ў гэтым нераўнадушных людзей — нашых землякоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Орша—Віцебск.
Фота аўтара.

ВУЧАЦЬ У ШКОЛЕ... Факт

З новага навучальнага года ў адной з Мінскіх школ на аснове дагавора з Інстытутам тэалогіі імя святых Мефодзія і Кірыла БДУ адкрываецца першы гісторыка-філасофскі клас.

Вучні гэтага класа атрымаюць больш глыбокія веды па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі, а таксама будуць вывучаць хрысціянскую філасофскую антрапалогію, сусветную духоўную культуру і Біблейскія гісторыі.

Чытаць гэтыя прадметы будуць выкладчыкі БДУ, і таму ў навучэнцаў гэтага класа будзе значна больш шанцаў паступіць у Інстытут тэалогіі. Педагогі школы ўпэўненыя, што хлопцы і дзяўчаты, якія будуць вучыцца ў такім класе, навучацца жыць у гармоніі з навакольным светам і, магчыма, знойдуць для сябе адказ на вечнае пытанне: «Навошта чалавек жыве на Зямлі?». Гісторыка-філасофскі клас фарміруецца з выпускнікоў 9-х класаў у сярэдняй школе № 142.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Віншуем з днём нараджэння дарагую мамачку, бабулю, прабабулю МАКСІМОВІЧ Веру Дзмітрыеўну з в. Слабада Лагойскага раёна.

Мы возраст твой считаем не годами,
А добротой и лаской, и теплом.
И пусть всегда ты будешь с нами
За праздничным столом.
Мы все твоей улыбке рады
И повторяем вновь и вновь:
Пусть будет всё тебе наградой —
Здоровье, счастье и любовь!

Любячыя цябе Аксана, Генадзь, Света, Ванюша, Руслан, Ксюша.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.24	19.52	13.28
Віцебск —	6.11	19.43	13.32
Магілёў —	6.14	19.42	13.28
Гомель —	6.13	19.36	13.23
Гродна —	6.39	20.06	13.27
Брэст —	6.42	20.05	13.23

Месяц

Апошняя квадра 4 верасня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Калініка, Мікалая, Паўла, Яфрэма;*
К. *Дароты, Юстыны, Ваўжынца, Лаўрэна, Станіслава, Тодара.*

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+21 — +23 °C	МАСКВА	+23 — +25 °C
ВІЛЬНЮС	+22 — +24 °C	РЫГА	+18 — +20 °C
КІЕЎ	+27 — +29 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+13 — +15 °C

Без ападкаў

Дзве даты — 5 верасня

1918 год — пасля забойства кіраўніка петраградскай ВЧК Урыцкага і замаху на Леніна Саўнаркам Савецкай Расіі прыняў пастанову аб чырвоным тэрору, які паклаў пачатак страшным масавым рэпрэсіям. Самай буйной акцыяй чырвонага тэрору быў расстрэл у Петраградзе 512 прадстаўнікоў эліты — былых саноўнікаў, міністраў, вучоных, свяшчэннаслужыцеляў. Толькі ў 1918 годзе ВЧК рэпрэсавала 31 тыс. чалавек, з якіх больш як 6 тыс. былі расстраляны.

1972 год — палесцінскія тэрарысты з арганізацыі «Чорны верасень» у алімпійскім Мюнхене захопліваюць у заложнікі 11 ізраільскіх спартсменаў (у асноўным былых савецкіх грамадзян). Двое спартсменаў забіты адразу. Улады ФРГ прадастаўляюць тэрарыстам самалёт, які мясцовыя спецслужбы адразу ж паспрабавалі атакаваць. У выніку гінуць астатнія 9 заложнікаў, 5 тэрарыстаў і 1 паліцэйскі. На Алімпіядзе ў знак жалобы на адзін дзень былі прыпынены ўсе спаборніцтвы. Арганізатары гэтага тэракту на працягу некалькіх гадоў былі высачаны ізраільскімі спецслужбамі па ўсім свеце і знішчаны.

Цытата дня:

«Усё золата гэтага свету не вартае аднаго вернага сябра».

Вальтэр (1694—1778), французскі пісьменнік і філосаф.

УСМІХНЁМСЯ!

У начным клубе.

— Дзякую за танец, дзяўчына.

— За які танец? Я проста да выхаду прабіралася!

☺

Надпіс ў маршрутцы: «Паважаныя пасажыры! Просьба не адцягваць увагу вадзіцеля. МАЛІЦЦЕСЯ МОЎЧКІ!»

☺

— Што такое сучасны мужчына?

— Гэта той, каму адной бутэлькі гарэлкі мала, а адной жанчыны многа...

☺

Самае частае пытанне па мабільніку: «Ты дзе?»

Самы часты адказ: «Ужо пад'язджаю».

І гэтым харчуецца не адна сотавая кампанія.

☺

Надпіс на дзвярах касметычнага салону: «Уваходзьце, не саромейцеся — нас нічым не напалохаеш!»

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА IV КВАРТАЛ 2007 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Насустрач Чарнобылю
Местное самоуправление
Свая справа
Жыр-Андоля
Чырвоная змена
Купі лепшае! Тавары Паслугі Цэны
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8200 рублёў на месяц 24600 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7850 рублёў на месяц 23550 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	13000 рублёў на месяц 39000 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	11850 рублёў на месяц 35550 рублёў на квартал

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

Аўтаадказчык

ЧАРОЎНЫ ПАЛІРОЛЬ

Фарба на кузаве маёй машыны выгарала на сонцы, а ў некаторых месцах «памутнела». Ці можна аднавіць яе ранейшы шыкоўны выгляд з дапамогай паліроля? Які сродак лепш выкарыстоўваць?

Ганна ДУБОЎСКАЯ, *Слуцк.*

Сітуацыя — не безнадзейная, калі няма глыбокіх механічных пашкоджанняў. Паспрабуйце адпаліраваць вашу «ластаўку» і, магчыма, вам удасца вярнуць яе былую прыгажосць. Зараз на айчынным рынку ёсць мноства сродкаў для паліравання кузава аўтамабіля. Пры іх выбары трэба арыентавацца не столькі на брэнд фірмы-вытворцы (эфект ад расійскіх, нямецкіх, польскіх тавараў такога кшталту прыблізна аднолькавы, розны толькі кошт), колькі на хімічны састаў паліроля. Праверана на ўласным вопыце, што самым эфектыўным сродкам для аднаўлення бляску кузава з'яўляецца паліроль, які ўтрымлівае тэфлон. Ён здымае верхні слой сапсаванай эмалі і вяртае кузаву колішні бляск.

Аўтавыстава

ПАРАД УСЮДЫХОДАЎ

У Мінску з 6 па 9 верасня адбудзецца чарговае шоў мотараў.

На гэты раз пад дахам Нацыянальнага выставачнага цэнтра «Белэкспа» будуць сабраны толькі ўсюдыходы. І гэта невыпадкова. Паводле слоў аднаго з арганізатараў выставы, дырэктара ААТ «Рэмарк» Дзмітрыя Яроты, апошнім часам у нашай краіне назіраецца імклівы продаж джыпаў. Таму і ўзнікла ідэя наладзіць спецыялізаваную выставу пад назвай «Off Road. Minsk», на якой будзе прадстаўлена амаль 50 мадэляў поўнапрывадных аўто. Трапіць на парад усюдыходаў можна будзе з 11 да 20 гадзін. Кошт білета — 10 тыс. рублёў.

Аўтаспорт

СЮРПРЫЗЫ, СУВЕНІРЫ І ПРЫЗЫ

Крупскі раён на тры дні ператворыцца ў меку для аматараў экстрыму на колах.

З шостага па дзевятае верасня тут адбудзецца трофі-рэйд «Крыніца-Liqua». Паводле звестак прэс-аташэ спаборніцтваў Данілы Далматава, ужо зарэгістравана больш за 30 спартсменаў, якія будуць штурмаваць крупскую трасу. Маршрут да самага пачатку трофі-рэйду будзе трымацца ў сакрэце. Увогуле, лёгкай паездкі арганізатары не гарантуюць. Наадварот, для спартсменаў загадзя прыгатаваны некалькі дарожных сюрпрызаў. А яшчэ ўсіх без выключэння ўдзельнікаў трофі-рэйда чакаюць сувеніры і прызы.

Аўтарэйтынг

КАРОНА ДЛЯ «СУПЕРКАРА»

Аб'яўлены 32 прэтэндэнты на тытул «Аўтамабіль года ў Еўропе». Пакуль што ў гонцы лідзіруюць: «Audi A5», «Ford Mondeo», «BMW X5», «Fiat 500», «Mercedes C», «Kia ceed», «Fiat Bravo». Аднак і ў астатніх 25 прэтэндэнтаў ёсць неблагія шанцы атрымаць карону «суперкара». Уладальнікаў пачэснага тытула ўплывовае журы аб'явіць 19 лістапада гэтага года.

Варта нагадаць, што конкурс на лепшы еўрапейскі аўтамабіль праводзіцца з 1964 года. Летась «каралём еўрадарог» быў прызнаны «Ford S-Max», на другім месцы апынуўся «Opel Corsa», «бронзу» атрымаў «Citroen C4 Picasso».

Аўтаэкалогія

КУПЛЯЕМ ЛАМАЧЧА

Румынскі ўрад распачаў рэалізацыю праграмы па куплі ў насельніцтва старых аўтамабіляў. Сёлета кожны ўладальнік машыны ва ўзросце больш за 12 гадоў можа здаць сваё ламачча на ўтылізацыю і атрымаць ад дзяржавы кампенсацыю ў памеры 1250 долараў. Пакуль што румыны не вельмі ахвотна здаюць дзяржаве старых «жалезных коней». Такую магчымасць скарысталі гаспадары толькі 14,5 тыс. машын. Астатнія не спяшаюцца развітацца з ламаччам, баючыся зусім застацца без транспартнага сродку: кампенсацыю можна патраціць толькі на набыццё новага аўто, якое адпавядае усім экалагічным нормам.

Аўтабяспека

КУБАЧАК КАВЫ АД «VOLVO»

Кампанія «Volvo» распрацавала новую сістэму бяспекі, якая хутка з'явіцца на серыйных аўтамабілях. Сутнасць яе ў тым, што электронныя прылады кантралююць паводзіны і фізічны стан вадзіцеля. Як толькі камп'ютар робіць выснову, што кіроўца стаміўся, то на панэлі аўтамабіля з'яўляецца значок у выглядзе кубачка кавы. Гэта азначае, што вадзіцелю трэба тэрмінова спыніцца і адпачыць.

Аўтакур'ёз

ХВАЛЬКО — ЗНАХОДКА ДЛЯ ПАЛІЦЫІ

У Вялікабрытаніі паліцыя затрымала аматара хуткай язды, які пахваліўся сваім «подзвігам» у Інтэрнэце. 19-гадовы шатландзец паведаміў, што выціснуў са свайго аўто «Ford Escort» 225 кіламетраў у гадзіну. Адпаведны відэаролік хвальком змясціў у Інтэрнэце. Так што паліцыі не склала вялікай цяжкасці знайсці і прыцягнуць яго да адказнасці.

Аўтажарт

Які цудоўны артыст прачынаецца ў вадзіцеле, калі яму даводзіцца апраўдвацца перад «даішнікамі»!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.376. Індэкс 63850. Зак. № 4839. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12